
Васіль Вітка
Случчыца



[illegible]



# Васіль Вітка

# СЛУЧЧЫНА

*вершы*

*паэмы*

*казкі*

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1981

© Афармленне. Прадмова. Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1981.

# ЗАПАВЕТНАЯ ПАЭМА МАЯ...

Бацькаўшчына майго маленства і юнацтва, матчына калыска майго слова і песні, я думаў пра цябе ўсё жыццё — блізка ад родных сцежак і на дарогах далёкіх вандровак.

Хараство жыцця, прыроды, людскіх пачуццяў мы спазнаём, яшчэ не прачытаўшы ніводнай кнігі, бо імкненне да прыгожага нараджаецца разам з намі.

З тых дзён, як я пазнаў жыццё, прыгажосць чалавечай душы я адкрываў цераз матчыну песню. А потым, калі далучыўся да слова Купалы, Коласа, Багдановіча, я ўбачыў, што і ў песнях маёй маці, і ў іх песнях — адна душа, душа народа. Я не ведаю ў сусветнай паэзіі большага шэдэўра, чым бяссмертная калыханка, створаная маткамі народаў усяго свету. Толькі для таго, хто спазнаў любоў, надзеі і трывогі матчынай песні, адкрываюцца пасля ўсе найвялікшыя духоўныя багацці многіх пакаленняў людзей.

Не цені забытых продкаў, а нашы папярэднікі, людзі ў жывых абліччах паўстаюць у матчыных песнях: і гарапашны сейбіт у лапцях і дзіравай світцы з корабам цераз плячо, і мяцежны рэкрут, закуты ў калодкі, і сівабароды лірнік з хлопчыкам-павадыром, і вясёлыя батлеечнікі і дудары, і ясныя мсціўцы, і коннікі з чырвонай зоркай на шлеме, і першыя вестуны радаснай перамогі...

Даўні напеў поўніць мой слых: ледзь-ледзь зашарэў світанак, а ўжо гукае пастухова труба, звініць пад мянташкай каса. Гэта першыя галасы летняй раніцы: берасцянка сына і самотны напеў бацькі:

На балоце касец косіць,
На шырокі свет галосіць.

А пад паўдня на гарачай пожні між снапоў маці толькі на адну хвіліну прытуліць да грудзей дзіця:

Спі, сыночак
Міленькі,
Галубочак
Шызанькі...

Калі ж ад спякоты сасмягне ўсё жывое, у высокім злавесным небе раптам мільгане крыло хіжага ястраба. Хаця б яго цень не ўпаў на твар дзіцяці! І яна ў трывозе кідаецца да мэндліка, каб засланіць немаўлятка. Толькі б ён быў шчаслівы. Яна на ўсё гатова дзеля будучыні.

І цяпер мая істота заходзіцца ад невымоўнага жалю за ўсё, у чым я застаўся вінаваты перад табою, мая вялікая гаротніца...

Вяртаючыся ў памяці да тых дзён, я ніяк не магу ўспомніць, калі напісаў свой першы верш. Затое добра памятаю свае першыя радасці і засмучэнні, сваю дзіцячую бездапаможнасць перад незразумелай велічнасцю зорнага неба, невыказным хараством летняга вечара. Як і ўсе хлапчукі майго маленства, я вельмі ж хацеў хоць раз у жыцці з'ездзіць на начлег. З якім затоеным хваляваннем услухоўваўся я, калі позні́мі прыцемкамі на вясковую вуліцу з двароў выязджалі начлежнікі і як за вёскай заводзілі «Пад ракітаю зялёнай рускі ранены ляжаў», самую прыгожую хлапечую песню, якую я ведаў тады. У кажухах, а поверх яшчэ ў доўгіх суконных халатах начлежнікі выглядалі волатамі. Яны ехалі на ўсю ноч, каб, абсеўшы зыркае вогнішча, слухаць таемныя гукі і галасы лесу, густа зарослага лапушной папараццю... Я не мог паехаць разам з імі не таму, што мяне не пускалі бацькі. Мне не было на чым ехаць. У нас не было каня. Бясконных двароў на ўсю невялікую вёску Еўлічы толькі было што наш. Так паэзія, якое прагла наіўная дзіцячая душа, разбівалася аб суровасць жыццёвай несправядлівасці. Усё сваё маленства і аж да дзён юнацтва я адчуваў не толькі на бацьках, але і на сабе пыхлівую, нахабную і злую сілу тых, хто пагардліва гаварыў нам у вочы: «Бядняк, няма хлеба, еш праснак» або з павучальным дакараннем: «Як рабіцьмеце, так і мецьмеце». А як нам было рабіць, на чым?

Памятаю дзедаву хату. Яе акенцы былі выпілаваны на шырыню роўна аднаго бервяна. І хоць мы жылі ў асяродку, наша хата была самай крайняй пры забалочанай лугавіне, якая грэбляю дзяліла вёску напал. За хатаю адразу ж пачы-

наліся глінішчы, ямы, з якіх людзі капалі на свой абыходак гліну. Копанкі былі такія глыбокія, што рэдка калі высыхалі. Схілістыя ж яры, што зарасталі чаборам, зязюльчыным лёнам і лугавой мятай, былі і нашай сенажаццю, і пашай. У глінішчах я пасвіў карову. І хоць яна была рыжай і дробнай, а не такой, як пярэстыя, магутныя і паважныя каровы Сямёна Пеўня, самага моцнага ў сяле кулака, я аддаваў ёй усю сваю любоў і замілаванне, як блізкай мне істоце. Памятаю, аднаго разу я нават маліўся ў царкве за яе здароўе і за будучую яе дачку. Мне вельмі ж хацелася, каб і ў нас была карова, як у Пеўня. Такое малітвы, дзе богу можна было выказаць гэтую просьбу, не было. І таму мне давялося самому стварыць яе. Гэта, відаць, і было першым выяўленнем майго натхнення. Не вызначаючыся літаратурнай формай, мая паэтычная імправізацыя мела дакладны і ясны змест. «Дай, божа,— прасіў я,— каб наша кароўка прывяла такую ж цялушку, як Пеўнеў бугай, пярэстую і з белай лысінкай...»

Бог пачуў маю просьбу. У нашай рыжай каровы паявілася пярэстая, з белай лысінкай дачка. Не ведаючы, што на ўсю ваколіцу толькі і ёсць Пеўнеў бугай, я яшчэ болей перакапаўся калі не ў сіле ўсявышняга, то ў сіле слова напэўна. «Ён знае слова»,— таямніча гаварылі пра шаптуна, які «качаў пярэпалах» (лячыў ад перапуду). У чарадзейнае слова верылі ў той час мы ўсе. Калі нас, дзяцей, бывала, кляла наша глухая бабка Аксеня за тое, што мы ў яе корабе шукалі яблык: «А каб вам, мае ўнучачкі, павыварочвала і павыкручвала гэтак ручкі, ножкі і ўсе вашы косточкі, як вы перавярнулі мой карабец...», дык у нас аж спіны халадзелі ад гэтай кляцьбы. Бабіны словы былі страшныя ў сваёй паэтычнай магутнасці. Паэзіяй майго маленства і былі гэтыя, няхай наіўныя, але жахлівыя па сваёй вобразнасці, праклёны і прычыты, плачы і галашэнні, жніўныя песні і песні-калыханкі.

Калі нехта ў тым, што я паспеў зрабіць, знойдзе вартае ўвагі, дык, можа быць, яму цікава будзе ведаць, што не з напісанага верша я адчуў патрэбу ў творчасці. Паэзія ў кожным з нас прачынаецца значна раней, калі ты раптам здзівішся велічы і хараству свету, хоць яшчэ і бездапаможны выказаць усё гэта словамі.

Напэўна, чалавек, які першы здзівіўся, якраз і стаў тым, з каго пачалося паэтычнае радаслоўе: думка, вобраз, народжаныя трывогай, узрушэннем і захапленнем.

Мой бацька, Васіль Максімавіч, быў адным з самых пісьменных мужчын у нашай вёсцы. Некалі аж тры зімы ён

хадзіў у воласць, у школу. Узяўшы сабе жонку з трохі багацейшай сям'і, ён, аднак, не разжыўся і на пасагу. Як успамінала мая маці, Марыя Міхайлаўна, за ёй давалі жарабіцу, але бацька мой адмовіўся. Жарабіцы не было куды паставіць. У лазовым пляцяніку пры хаце яна не магла змясціцца. Пасаг у суме сто рублёў выплацілі грашыма. Можа быць, што за гэтыя грошы бацька, не маючы дома за што рук зачапіць, рашыўся шукаць шчасця ў Сібіры. У 1912 годзе, калі мне споўніўся год ад роду, мы былі ўжо ў г. Омску. Туляючыся ў падсуседзях па чужых кутах, бацька карміў сям'ю тым, што, гнучы спіну на гарадскім рынку, падбіваў і латаў просты і грубы абутак людзей, якія наўрад ці калі ішлі да болей далікатных шаўцоў. Пара майго «залатога маленства» прыпала якраз на імперыялістычную вайну. Застаўшыся без гаспадара, якога забралі ў салдаты, карміць ужо нас, траіх дзяцей, вымушана была адна маці, наймаючыся на падзённыя работы. З мяне быў яшчэ слабы памочнік, хоць і даглядаў я меншых і бегаў з кацялком у казённую кухню, дзе бедным салдаткам давалі чарпак супу.

Вярнуліся мы ў родную вёску адразу ж пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Прыйшоў з вайны бацька, да якога мы, дзеці, доўга ніяк не маглі прывыкнуць і ўсё жыццё называлі на «вы». А можа, гэта ішло яшчэ і ад тае павагі, з якою мы заўсёды глядзелі на свайго бацьку. Нам здавалася, што ён усё ўмеў і ўсё ведаў. Рабіў ткацкія варштаты. Змайстраваў такарны станок і выточваў верацёны. Ну, а пра шавецтва і гаварыць не прыходзілася. Над нашага бацькі не было лепшага майстра. Цяпер ён шыў не адны ялавыя, а і самыя шчыгульныя хромавыя боты. І яшчэ адна спецыяльнасць была ў яго, патрэбная людзям: ён лячыў хворых. І хоць запас яго медыцынскіх ведаў абмяжоўваўся адной-адзінай кнігай, прынесенай з вайны,— «Пособие для военных фельдшеров», ён, як прызнавалі многія, ведаў, што да чаго, і нават мог лацінскімі літарамі выпісаць рэцэпт. Маю ж асаблівую пашану да бацькі выклікала тое, што ў нашай хаце, колькі я памятаю, ніколі не зводзіліся кнігі. Гэта былі не нашы ўласныя кнігі. І таму яны вабілі мяне яшчэ большай чароўнай сілай. Адкуль даставаў іх бацька? Адусюль, як толькі дачуваўся, дзе яны ёсць. Прыносіў нават з далёкіх вёсак. І калі выдаралася вольная часіна, у хаце ў нас усю ноч міргала газоўка. Пры яе сляпым святле бацька чытаў уголас. Ахвотнікі наслухаць знаходзіліся. Часта да позніх пеўняў вокам не мог звесці і я, хоць бацька думаў, што я сплю. Стуліўшыся

на палку над старым кажухом, я ледзь стрымліваў свой страх, услухоўваючыся ў доўгую, поўную жудасных прыгод гісторыю жыцця нейкага пана Твардоўскага. Памятаю, як я не вытрымаў і закрычаў, калі пану паднеслі на талерцы чалавечую галаву і як яна, лыпнуўшы вачыма, раптам зарагатала.

Не дзіва, што для мяне мой бацька быў і першым літаратурным крытыкам, які каштоўнасць паэзіі правяраў праўдаю жыцця. Ужо вучачыся ў школе, я аднае раніцы доўга ўслых зубрыў верш: «Пахнет сеном над лугами... В песне душу веселя, бабы с граблями рядами ходят, сено шевеля...» Бацька ўважна прыслухоўваўся, потым сказаў:

— Відаць, нехта з паноў склаў.

— Чаму вы гэтак думаеце?

— А памяркуй сам,— сказаў бацька.— Дзе гэта бачна, каб у гарачы дзень, калі на воз кладуць сухое сена і калі ад аваднёў, ад заедзі не адбіцца, а конь «точно вкопанный стоит». І як там яшчэ? «Уши врозь, дугою ноги и как будто стоя спит...»

Пазней, пачаўшы сам пісаць, я ніколі не забываўся, што законнае права крытыкаваць паэзію маюць усе, хто яе бачыць і адчувае ў жыцці.

Вершы я пачаў пісаць, здаецца, пайшоўшы ў другі клас школы. Не здзіўляйцеся. У тыя часы, калі ламаўся стары лад жыцця, а новы ўсталёўваўся не так лёгка, за буквар браліся хлопцы, якія ўжо ўмелі араць і касіць. Калі я кончыў трэці, апошні, клас школы, наша настаўніца, Таццяна Мікалаеўна, павяла нас, сваіх першых выпускнікоў, на экзамен у суседнюю сямігодку. Мяне і яшчэ дваіх байбусаў яна паставіла перад камісіяй трымаць экзамен за чацвёрты клас. Вытрымаў адзін я, і не таму, што быў выдатнік, а таму, што «даўно гадамі выйшаў».

У наступную зіму я ўжо сам быў за настаўніка. Бацька аддаў мяне на хутар да гаспадара, які жыў у лесе і, не хочучы выпраўляць дзяцей далёка ад дому, ахвотна згадзіўся трымаць мяне на сваіх харчах і яшчэ прыплаціць трохі грашыма і натураю. Праз год, зарабіўшы сабе на адзежыну, я паступіў у Слуцкую прафтэхнічную школу.

Ёсць у мяне верш, які называецца «Гартаванне». Гэта мая ўдзячнасць аднаму з першых маіх настаўнікаў — нашаму суседу Валадыму, вясковаму кавалю. Яго маленькай, прадымленай, пракуранай кузеньцы я абавязаны тым, што стаў вучыцца на каваля.

Набліжаўся час вялікага пералому ў жыцці вёскі — калектывізацыя. Першы мой верш, надрукаваны Міхасём Ціхапавічам Лыньковым у літаратурным дадатку да газеты «Камуніст», рэдактарам якой ён з'яўляўся, якраз і быў напісаны пад уражаннем бурных падзей. Узрушаны адчуваннем перамогі новага жыцця, я, памятаю, пісаў аб «радасных далях, дзе свецяць агні». Верш быў бездапаможны, невыразны па сваіх, яшчэ не зразумелых і мне самому вобразах. Калі што і было ў ім, дык гэта ўзнёслы настрой, якім поўнілася мая душа.

Грубай, нахабнай і драпежнай сіле хутаран, а ў вёсцы — цёмнай уладзе Сямёна Пеўня з яго сыраварняй і пярэстымі бугаямі прыйшоў канец. У яго вялізным доме аснавалася праўленне калгаса, старшынёй якога быў абраны мой бацька. У гэтыя гады ў роднай вёсцы я бываў не часта, бо працаваў ужо рабочым на Бабруйскім лесакамбінаце, у той час адной з буйнейшых новабудоўляў рэспублікі, а пазней у рэдакцыі газеты, якая падтрымала мае першыя літаратурныя спробы.

І яшчэ ў маёй памяці ўзвышаецца адна незабыўная постаць настаўніка з роднай Случчыны — Кузьмы Чорнага, з якім мы былі ў самым блізкім сяброўстве з першых дзён вайны да звароту дамоў, да апошніх дзён яго жыцця. Разам перажылі доўгую разлуку з мясцінамі, знаёмымі з маленства, з дарогамі і сцежкамі, што заўсёды і ўсюды былі з намі.

Будзеш ты усюды неразлучаны
З першымі ўспамінамі жыцця,
З ціхаю тугой па роднай Случчыне,
З шолахам альховага лісця,
З тою прыдарожнаю алешынай,
Што ў зацішшы пры шашы шуміць.
Хіба ж ёсць у свеце шчасце лепшае,
Як пад небам бацькаўшчыны жыць?

Не ставячы сабе за мэту напісаць аўтабіяграфію, я вылучаю толькі тыя моманты ў жыцці, што найбольш важныя для мяне як пісьменніка. Шкада, што многія з іх яшчэ не знайшлі свайго ўвасаблення ў маёй творчасці.

Асабліва руціць мне мой сыноўні доўг перад светлай памяццю бацькі, які загінуў у студзені 1943 года ў Слуцкай турме, не вытрымаўшы катавання фашысцкіх паслугачоў. Яны на допытах заціскалі яму дзвярыма пальцы, білі так, што горлам ішла кроў. Хто аддаў яго, ужо старога і хворага чалавека, у рукі катаў, на такую жудасную расправу? Сынок

Сямёна Пеўня — Мікалай, мой аднагодак, з якім некалі мяне настаўніца вадзіла на наш першы экзамен. Тады ён праваліўся, не вытрымаўшы нават за трэці клас. Затое прыйшла пара, калі ён бліскуча здаў экзамен на здрадніка. У часе акупацыі ён паявіўся ў вёсцы як верны фашысцкі найміт — стараста.

З вышыні перажытага, калі аглядаешся на пройдзены шлях і падводзіш вынікі зробленага, з крыўдным адчуваннем бачыш, колькі яшчэ глыбінь чалавечага шчасця і гора ты не раскрыў, не паказаў людзям. І калі тыя падзеі і людскія лёсы, велічныя ў сваім значэнні, што прайшлі праз тваё жыццё, не знайшлі поўнага ўвасаблення ў тваіх творах, значыць, самая лепшая кніга твая яшчэ не напісана.

Кнігу свайго жыцця творым не мы самі. Яе твораць час і людзі, што ўвайшлі ў наш лёс.

Я не бачу сваёй біяграфіі без людзей, паміж якіх я жыў і жыву, якіх любіў і люблю. Неабходнасць расказваць пра іх вымагаецца патрэбаю гаварыць не толькі сам-насам з сабою, але і з імі — жывымі, і з тымі, якіх ужо няма на свеце, але якія асталіся ўва мне самім, бо чалавек жыве адначасова ў трох вымярэннях: сучасным, мінулым і будучым.

Кожны з нас мае сваіх настаўнікаў, якім удзячны на ўсё жыццё. Яны не толькі ва ўспамінах, яны — усё лепшае, што ёсць у нас саміх, у нашым душэўным вопыце...

Случчына, ты — запаветная паэма мая, якую я пішу ўсё жыццё, збіраю па словах, па радках. Але вось папрабаваў скласці іх разам — і бачу: паэма яшчэ не напісана. Мабыць, аднаму не па сіле напісаць яе, вартую дзівоснай прыгажосці і крынічнай чысціні роднай зямлі.

Мой доўг не паменшае ад таго, што іншыя скажуць пра цябе, мая любая, лепш і прыгажэй. Суцяшэннем можа быць толькі тое, што з адчуваннем гэтага доўгу я заўсёды думаў пра цябе, складаючы свае радкі.

*1960—1980*

ВАСІЛЬ ВІТКА

Васіль Вітка

# СЛУЧЧЫНА



# РАДАСЛОЎЕ

## ШЛЯХ

Далапямі прыцісну павекі на вочы —
Разбягуцца кругі
У бязмежнае мора,
Пойдуць хвалямі у акіян,
Здасца шлях
Да жаданае мэты каротшым,
А пад берагам шчасця
Загарыцца маяк.

Ад палескага чоўна
Да балтыйскага крэйсера
Праз вякі,
Праз пакуты
Лёг пратораны шлях.
Колькі сцежак
Даўно ўжо забыта,
Закрэслена,—
Ці палічыш, ці ведаеш,
Маці-зямля?

І дзяды, і бацькі
Тут з плытамі
Блукалі
З горкай крыўдай на долю,
На суджаны лёс,
І ў легендах,
У казках асілка гукалі
Зняць праклён
З душ людскіх,
З ніцых белых бяроз.

І прыйшоў ён —
Упарты вясляр, і асілак,
І нашчадак усіх
Тых, што ў прышласць плылі,
Сын бацькоў,
Што у рэк
Гордай волі прасілі,
Унук дзядоў,
Што гаручыя слёзы
Ў разоры лілі.

Падымаю далоні —
Прамень б'е у вочы.
Не на хісткім чаўне —
На магутным плыву караблі,
І што хваля,
То шлях да жаданае мэты — карочай,
Зырка зззяе маяк
Запаветнай, шчаслівай зямлі!

*1930*

# ГАРТАВАННЕ

Даверлівым, наіўным юнаком
Я прагнуў вызнаць кузні таямніцу.
Здавалася, пад гулкім малатком
Само жыццё мне мусіць пакарыцца.

Так навучаў мяне кульгавы Валадым,
Сусед па прозвішчу «руб дваццаць».
Яшчэ ўспамінамі віецца цёплы дым,
Шуміць увішная ля горна праца.

А кузня тоўпіцца людзьмі —
Каму сашнік, каму направіць шыну.
— Сынок,— завуць мяне,— падзьмі!
І мех пяе — чароўная машына!

Бывала, прывядуць да каваля
Каваць каня,— і мігам я гатовы
Падпілаваць, насталіць вухналя,
Падаць у абцугах гарачую падкову.

А перад жнівам колькі нам турбот!
З-пад Слуцка самага,
за вёрст пятнаццаць,
Нясуць сярпы зубіць,— і от
Ужо мне тыднямі не будзе спацца.

І каб агонь не звёўся, не затух —
Мне кузню Валадым даверыць,
А я надзену скураны хвартух
І ўпершыню сам выкую падгерац.

Я рамяство спасціг — і толькі аднаго
Дагэтуль не магу уцяміць,
Хоць і мінула многа год,
Яно трывожыць маю памяць.

То спосаб гартавання — от рубеж
Мае дапытлівай навукі,
Калі, суседзе мой, табе
Душу я аддаваў у рукі.

Ты гартаваў яе на лёдзе, на вадзе,
На колеры любыя, на адценні,
На дыме першых летуценняў
І рэдка — на няшчасці, на бядзе.

Цяпер настаўнік у мяне другі —
Суровы майстра гартавання,
Бярэ ён смела сэрца ў абцугі
І грэе на агні выпрабавання.

Да белага напаліць. Малатком
Пастукае, направіць і — у ваду.
І зноў іду вясёлым юнаком
Я праз усе жыццёвыя нягоды.

І зноў так лёгка жыць, і, як тады,
Я слаўлю верную сваю навуку,
Цябе, мой добры Валадым,
Твае ўпэўненыя рукі.

*1941*

# З ВАЙНЫ

Па тым, як светла стала ў хаце,
Як маці ў шчасці зарыдала,
Пазнаў у прышлым я салдаце
Таго, каго чакаў гадамі.

З паходнай кайстры пехацінца,
Салёным порахам прагорклай,
Дастаў дзіцяці ён гасцінца —
Дроб цукру напалам з махоркай.

І не заўважыў я, як потым
Ён адвярнуўся ў думе нейкай,
Як бліснула расінка ўпотай
На бацькавых суровых вейках.

Тады няўцям было малому,
Што мо цяжэй за ўсё на свеце
Прынесці праз вайну дадому
Ў паходнай кайстры шчасце дзецям.

*1944*

# БАЦЬКАВА ЛЫЖКА

Здавалася б, рэч непрыкметная —
Старая бацькоўская лыжка,
А стане такой запаветнаю,
Як глянеш з далёкае вышкі.

І хоць яна не ў музеі,
Не за шкляною дзверцай,
З маленства я злучаны з ею
Глыбокаю памяццю сэрца.

Я ўсе яе добрыя звычкі
Чытаю па даўніх узорах,
Што на кавалачку дзічкі
Выразаў тонкі сцізорык.

І хай сабе час па саломінку
Усю яе высушыў, выпетрыў,
У хаце старой, на прыкомінку —
Вышэй яна царскага скіпетра.

Вось сумнае наша застолле —
Старыя, малыя сышліся,
І пара да самае столі
Стаіць над жалобнаю місай.

І я ўжо з гарэлачнай чаркі
Прабую з мужчынамі крышку
І з місы салёную скварку
Ігрушавай чэрпаю лыжкай.

Нябожчыкам большаму сыну
Яна перададзена ў спадчыну
Разам з цяжкім успамінам
І з галашэннем матчыным.

З тых дзён я магутную ўладу
Маю над родным небам,
Заўсёды душою рады
Запрацаванаму хлебу,

І песні пачутай, новай,
І веснавому раздоллю,
І кожнаму трапнаму слову
У хатняй бяседзе застольнай...

Даўно ўжо юнацтва мінулася,
А памяць з глыбіняў душы
Водгуллем адгукнулася,
Прыстала, сказала: пішы.

Здавалася б, рэч непрыкметная —
Старая бацькоўская лыжка,
А стала такой запаветнаю,
Як глянуў з далёкае вышкі.

*1956*

# ДЗЕД

Напэўна, не змагу сягоння
Намаляваць яго партрэт.
Я толькі добра дзень той помню,
Калі ляжаў на лаве дзед.

І нібы на якое свята
Ці на кірмаш ён ехаць меў —
Уся яго збірала хата,
А ён збірацца не хацеў.

Як бы на ўсё махнуў рукою
І, падтуліўшы бараду,
Прасіў: пакіньце ў спакоі,
Я з гэтай лавы не сыду.

А ўжо ваду нагрэлі ў печы,
Пад пахі дзеда ўзялі,
Над цэбрам шаравалі плечы
І доўга цёрлі мазалі

Каструбаватых тых далоняў,
Што перагладзілі наўкруг
Чужыя выцерабы, блоні,
І дворны цэп, і цяжкі плуг.

Сарочку белую надзелі,
І зноў — на покуць галавой,
І сталі плакаць, як умелі,
Не плакаў толькі бацька мой.

Няўмела, доўгую, як дудку,
Ён з дзедавага тытуню
Згарнуў нязвыклую закрутку
І зацягнуўся ўпершыню.

Пра што ён думаў — я не ведаў,
Ён сам быў вельмі ж маладым,
Каб зразумець, як горак дзедаў
Не толькі лёс, а нават дым.

*1958*

# БАЦЬКА

— Маўчыш? Ну што ж, маўчы, маўчы...
І зноў дзвярыма пальцы ломяць,
Каб скатаванага павалачы
І кінуць на турэмную салому.
Счакаўшы — нанава, і так штодня,
Але ўжо і самім не застаецца часу:
— Яшчэ не перадумаў, старшыня,
Яшчэ не выракся свайго калгасу?
...Нямала ў маладосці ён зазнаў,
І вытаптаў дарог, і перабраў работы.
Да рамяства харошага дапаў —
Далёка быў чуцён, што шые боты.
І платы ён вялікай не прасіў —
Абедзве жытам ты насып халявы,
І хоць бы і хацеў, а ганьбы не дасі,
Насі сабе — і толькі тае справы.
Але і ў парабкоўстве па дварах,
І ў чаляднікаў, гнучыся крукам,
Не мог забыць ён сухазему пах,
І ў снах раллю перабіралі рукі.
За годам год жыццё гартуе нас.
Крутою незабыўнаю вясною
Вяскоўцы заснавалі свой калгас,
Яго абралі старшынёю.
Даўно было ўсё. Злыя крумкачы
Зямлю любімую запалапілі...
— Маўчыш? Ну што ж, маўчы, маўчы!..

. . . . . . . . . . . . . .

За вёскай пры дарозе ёсць магіла.
Каторы год маўчыць зацята ён.
Урос пагорак жорсткаю травою.
Раскінуў голле маладое клён
Над каменем з чырвонаю звяздою.
У непадкупны і суровы век
І я пражыць сваё жыццё так згодны,
Бо добра знаў яго, той чалавек —
Мой бацька родны.

*1958*

# СПАДЧЫНА

Тады дзяржаве сёмы год ішоў,
А мы хоць і старэйшыя былі,
Але дайсці і сэрцам і душой
Да ўсіх падзей адразу не маглі,

Бо пачыналі толькі з буквара,
Са слова першага, напісанага крэйдай,
Хоць нам было б лягчэй загон араць
І ў лузе коскаю махаць лацвей бы.

У самай сіле хлопцы-дзецюкі,
На вечарынках толькі б завіхацца,
А мы ішлі, нібыта парабкі,
У першы клас на ўсю зіму наймацца.

Адтуль вяду я свой жыццёвы след
І радаслоўную пішу спачатку,
Бо на той свет з сабою цемнік-дзед
Забраў і герб фамільны, і пячатку.

Адтуль, з вясковай першай школы той,
Што талакой мужыцкай збудавана,
З развалак, што суроваю зімой
Пад'ехалі пад самы школьны ганак,

Калі настаўнік вестку нам прывёз,
Што Леніна няма і мы адны на свеце
Адказваем за чалавечы лёс,
За будучае шчасце на планеце.

І мы адказнасць на сябе ўзялі
Няхай яшчэ няўмелымі рукамі:
Мы школаю па ўсім сяле пайшлі,
І сані ехалі ўслед за намі.

Спыняліся ля кожных мы сянец,
І хто што мог выносіў з роднай хаты:
Пшаніцы гарнец,
грэчкі карабец —
Была тады дзяржава не багата.

Нямала давялося ёй зазнаць,
Ў акопах мерзнуць, галадаць гадамі,
Каб памяць дарагую ўшанаваць
Заводамі, садамі, гарадамі.

Цяпер, калі шуміць жытамі стэп,
Пшаніца спее па аблозе плоднай,
Мы знаем — не звычайны гэты хлеб,
Паток вялікай памяці народнай.

Яе перадаём мы ў запавет
З сям'і ў сям'ю, ад хаты і да хаты,
Як тых саней глыбокі след,
Як нашы першыя зярняты.

*1958*

# ТЫТУЛЫ

Запоўніць лепш анкету,
Прыкласці біяграфію,
Чым скласці кнігу гэту,
Калі не князь, не граф я.

Ні «ваша эксцэленца»,
Ні нават «благароддзе».
З якога ж тут каленца
Пачаць аб сваім родзе?

Былі і ў нас традыцыі,
Былі свае і тытулы:
Ты ледзь паспеў радзіцца,
А ўжо цябе аблыталі

Пялёнкамі каравымі,
Як генерала стужкамі,
І званнямі, і славаю,
І на ўвесь век — мянушкамі.

Сваё ярмо, як вол, нясці
Пачаў мой прадзед рыжы
І ледзьве-ледзьве ў воласці
Накрэмзаў першы крыжык,

А з таго дня ён «пісарам»
Вярнуўся ўжо дадому,
Да галавы да лысае
Насіў свой чын вядомы.

А дзед, што «ліха матары»
Казаў за кожным словам,
Папаў у «губернатары»,
Бо лаяў адмыслова,

Як вып'е, ўсю губерню
За чыншы і падаткі,
Грaзіўся, неравернe
Усе дагары парадкі.

У найвышэйшым сане
Быў дзядзька-прастарэка.
Бывала,
як прыстане —
Уморыць чалавека:

«Паслухай, ягамосце,
Які мне сон прысніўся,
Нібыта аж у госці
Я да цара з'явіўся.

Паселі з Мікалаем,
Сядзім і выпіваем,
І толькі не сядзіцца,
Не церпіцца царыцы,

Бо вельмі ж дагаджае:
То ўрэжа хлеба лусту,
То ў місу падлівае
Гарачую капусту...»

Ўся вёска рагатала
З той дзядзькавай прыгоды,
Яго ж «царом» прызнала.
Мінаўся год за годам,

І «пісара» пісажылі
У валасной халоднай,
Лупілі скуру зажыва
З нямых, глухіх, галодных,

І з дзеда-«губернатара»,
І з дзядзькі-пустасмеха,
Што быў за «ампіратара»
Вяскоўцам на пацеху.

І множыліся тытулы.
Было іх так багата,
Што прыставы ўжо блыталі,
Як валаклі ў салдаты.
(Не вельмі разбіралі,
Як і ў астрог саджалі.)

На смех, ні за панюшку,
Мянялі на мяпушку
Прозвішча людское
Часамі на такое,

Што не дасі і веры,
Як гэта на паперы
Было пісацца дзецям
І жыць на белым свеце.

Вось вам мая дынастыя
Нямых, Глухіх, Галодных,
Што ў бой пайшлі за шчасце,
За свой закон народны,

За Голых, Босых, Бітых,
За гонар свой і права,
За грамадзянскі тытул
Савецкае дзяржавы.

*1958*

# ЛЕНІН

Першы раз убачыў на партрэце
Я яго ў далёкія гады.
Мы, вясковыя малыя дзеці,
Яшчэ ў школу бегалі тады.

Не забуду радаснай хвіліны,
Як пераступіў парог у клас:
Са сцяны сялянскае хаціны
Ён глядзеў з надзеяю на нас.

Подлеткамі пад яго рукою
Мы адчулі крыл сваіх размах.
З той пары не ведае спакою
Мой імклівы, мой крылаты сцяг.

Ён заўжды з грудзей гарачых рвецца
Ў радасці, у шчасці і ў бядзе,
А жывое ленінскае сэрца
Праз усё жыццё мяне вядзе.

Ад забытае, далёкай хаты
Ён ідзе па свеце праз вякі.
Новыя ўзлятаюць арляняты
З-пад яго бацькоўскае рукі.

*1965*

# КРАЙ ГАСЦІНЦА

На павароце, край гасцінца
Даўно пагледжаны пагорак,
Дзе мне заўсёды будзе сніцца
Мой незабыўны адвячорак,

Калі здалёк вясну пачула,
І ў клопаце аб новым хлебе
Гарачая, у твар дыхнула
Адвечная, жывая глеба.

Яна вяртала ўсё, што брала,
Апроч саміх аднавяскоўцаў,
Хоць і не ўсіх занатавала
Імёны на каменнай зводцы.

Радні гусцее — дальняй, блізкай,
Але нікому тут не цесна,
Бо аніводнае калыскі,
Ніводнае вясёлай песні

У суджаныя дні разлукі,
Як свет стаіць, яны не бралі,
Каб вечна матчыныя рукі
Паэтаў новых калыхалі.

*1972*

# СЛУЧЧЫНА

## ЁСЦЬ НА ЗЯМЛІ

Ёсць на зямлі такі куток,
З якім навек я злучаны,
Адкуль ступіў свой першы крок —
Мая радзіма — Случчына.

Не зводзіліся ўсе вякі
На Случчыне паэты.
Вянкі іх песень —
рушнікі,
Сурвэты — іх санеты.

Увекавечыў Слуцак нас
Сваімі паясамі.
А пра цяперашні наш час
Вы ведаеце самі.

Пачуўшы ад старых людзей,
На ўласны смак праверыў —
Няма нічога саладзей
Славутай слуцкай бэры.

А тыя,
хто памаладзей,
Перадаюць унукам —
Няма нічога саладзей,
Чым слаўны слуцкі цукар.

Сябры,
паверце земляку:
За век свой некароткі
Я ўпэўніўся, што случаку
Увесь наш край салодкі.

Над Случчынай салодкі звон,
Як роі паўкола маткі.
Люблю яшчэ з дзіцячых дзён
Салодкія загадкі.

## САЛОДКІЯ ЗАГАДКІ

Сітуліцы,
Мітуліцы —
Ляцяць госці
Па вуліцы.

Пазляталіся,
Паселі
І гудуць,
Як на вяселлі.

Сонца жыгае,
Джгае жывіца.
Хто не ўгадае —
Не будзе жаніцца.

Не быў я ў свеце бабылём,
І ты не будзеш, братка,
Пакуль не зарасла быллём
Салодкая загадка,

Пакуль вяселіць нас яна
Бясконцай таямніцай,
Пакуль з глыбінь жывога дна
Б'юць слуцкія крыніцы.

Прыпаўшы да зямлі, іх п'юць
Лясы і сенажаці,
І маладзіцы, што пяюць
Песні нашых маці.

Сам не паклоннік даўніны,
Сучаснасці равеснік,
Паміж радні і сябрыны
Я рады слуцкай песні —

І той, што з полымя вайны
І што бацькі спявалі,
Што нашы дочкі і сыны
Вязуць на фестывалі.

## СЛУЦКАЯ КАМАРЫНСКАЯ

Шум і гоман на двары —
Жэніцца камар стары.

Камарыху з дзецьмі кінуў,
Пададбраў сабе дзяўчыну,

Рад камар, што выбраў муху —
Загладуху, весялуху.

Толькі муха штось не рада
Камароваму акладу,

Бо па мужавай зарплаце
Шые ў тыдзень адно плацце.

Усяго купіў камар —
Модных туфляў дваццаць пар.

На гулянкі муха ходзіць,
Цэлым гужам хлопцаў водзіць.

Галавой камар панік.
Замаркоціўся мужык.

Не жыццё пайшло, а мука —
Цягне жылы злыбядуха.

Як прытупне, як прыкрыкне —
Камарочак ані пікне.

Ой, хапіў камар бяды —
Ні туды і ні сюды,

Бо старая не даруе,
Маладая запілуе.

Пайшоў з гора камарок
Не ў гаёк і не ў барок.

Запынілі камарка
Актывісты ля ларка:

— Як жывеш, як пажываеш,
Чаму нас не паважаеш?

Паважаў камар усіх.
Перш узяў ён на траіх,

Потым па сляпнёў, па трутняў
І па тых, што блізка труцца.

Так бядак развейваў смутак —
Ухапіў пятнаццаць сутак.

Намахаўшыся мятлой,
Стаў камар ужо не той.

Доўга выў, за вухам чухаў:
— Ой, не буду больш пад мухай!

## ЛЫСЫ РАМАНС

Што мне з таго пісанага,
Што мне з кучаравага.

Палюбіла лысага —
Пахаджаю паваю.

Лысага люблю я ласкі,
Лысы возіць мне каляскі,

Не адходзіць ад калысак —
У нас поўна хата лысых.

Лысы да дзяўчат не ласы,
Лысы дбае пра каўбасы,

Лысы дбае аб радні,
Зарабляе працадні.

Не бярэ і ў рот гарэлкі,
Лысы мые мне талеркі,

Чыгуны, гаршкі і місы —
За парадкам сочыць лысы.

Жонка лысага — нялыса,
Калі лысы сам не высах.

Лысыя ў нас не звяліса —
Выбірайце толькі лысых!

З лысым весела жывецца,
Ёсць заўсёды куды дзець.

Як люстэрка разаб'ецца —
Буду ў лысіну глядзець.

Каб самім вам так жылосо,
Так ішлосо, так вялосо,
Так меласо і маглосо,
Так еласо і пілосо,
Скакаласо, пеласо
І яшчэ хацеласо.

## САКУНЫ

Мы на Случы ўсе — сакуны,
Завомса сакунамі.
Спрадвеку хлеб наш сакаўны
І мова сакаўная.

Звязала рушніком рака,
Тугім вузлом злучыла
З лесавіком палевіка
І дружбе павучыла.

Здавён адзін на аднаго
Мы не глядзелі скосо,
І хоць пабачылі ўсяго —
Усё паражылосо.

Наб'е гузак, хто вытнецца,
Пацэліць той, хто меціцца.
Бо як яно рабіцьмецца,
Дык так яно і мецьмецца.

І печага аюцкаць,
Калі пастух някемны.

У Слуцку ўсё па-людску —
І случакам прыемна.

Яшчэ ў калысцы спіць сысун,
А толькі абазваўса,
І ўжо ён — выліты сакун,
Увесь у бацьку ўдаўса.

Глядзіш, мацнейшыя харчы
У місе падварушвае.
Не трэба нават і вучыць —
Так лыжкай апігушвае.

Расце сабе, у вус не дзьме,
Наказ шануе дзеда:
На Случчыне Андрэй Кузьме —
Заўсёды родны Хведар.

## І САМ УДАЎСА Я ТАКІ

І сам удаўса я такі,
Шчаслівы вам прызнацца:
З адной рукі, з другой рукі —
Скрозь слуцкае сваяцтва.

Дадому еду — і здалёк,
Нібы палотны белячы,
Бяжыць бярозавы гаёк,
Дарогу сцелюць Еўлічы.

Пра іх ніколі на вяку
Нідзе не мог забыцца.
У весніцах стары цвыркун
Пілуе марш на скрыпцы.

Чмель трубіць у гарбузны цвет
На ўсё сяло святочнае.
Не блізкі абышоўшы свет,
Канцы з канцамі сточваю.

Тут між балотнага куп'я
Ўзлятала песня кнігаўкай.

Зрасталася душа мая
З маёю лепшай кнігаю.

У ёй — імёны, адрасы,
У ёй — мае случане,
Жывых — жывыя галасы
І тых, што замаўчалі.

Падчас і я ў трубу трублю,
На скрыпачцы пілую,
Што, мілую, цябе люблю,
Зямлю сваю — малую.

А ты жыццё прайшла са мной,
У свет вяла і клікала.
Ніколі без цябе, малой,
Не знаў бы я вялікае.

Яшчэ не сплочаны мой доўг.
Перад табою немы,
Я ўсё шукаю свой радок
Дзеля тваёй паэмы.

*1976*

# МОЙ ДОБРЫ ВЕКУ

Мой добры веку, вінават,
Напэўна, я перад табою.
Яшчэ не спісаны салдат,
Я ўсё на жытнім полі бою.

Баюся, каб не нахлусіць
Ні ў чым,
нідзе і ні на кроплю.
Калісь умеў араць, касіць,
Смак ведаў хлеба і картоплі.

І зараз ведаю, але
Ты так стараешся заўзята,
Каб я ў тваім цяпле, святле
Хутчэй забыў старую хату,

Сяўню, і серп, і млын, і млён,
Касу і граблі, цэп і вілы,
Цяпло вясновых баразён,
Бусліны клёкат, сэрцу мілы.

Бывае, не прымроіш воч,
Не спіш да самага світанку.
Не спіць над Свіслаччу ўсю ноч
Тэлевізійная буслянка.

І чорна-белыя буслы
З блакітнага гнязда клякочуць,
Лагодна лашчаць даўні слых
І дзівы новыя прарочаць.

Даруйце, серп, саха, страха,
Мае вытокі і асновы,
Што адцураўся кажуха,
Куды ў кішэню лез па словы.

Не сцерпіць малады чытач:
«Расчуліўся без дай прычыны.
А мне да лямпачкі, прабач,
Твой дзедаўскі кажух аўчынны!..»

Ну што ж, і ты даруй мне, друг,—
Ты болей за мяне свядомы,
Бо перакроіў мой кажух
Па новай модзе — на дублёны.

Ліст памяці, апалы ліст,
Развітваючыся з табою,
Апошні стаўлю абеліск
Я на пакутным полі бою.

Чужою бацькаўшчынай мне
Вы не былі, мае загоны.
Не спіць і, мабыць, не засне
Мой успамін пра вас да скону.

Не чужаку, а мужыку,
Што сеяў у барозны промні,
Хай застанецца на вяку
Не камень, а сыноўні помнік.

*1977*



# ДЗІВА

* * *

На чоўне сабраўся ў бязмежную даль,
У шлях невядомы, бясконцы.
Хай бераг далёка, а я паміж хваль
На сонца вяслую, на сонца!

*1928*

* * *

Як з падзіву анямелая
І застылая ў знямозе,
Заламала рукі, заламала белыя
У адчаі
На марозе
Пры дарозе.

Раптам ветрык шугануў —
І скінуў чары.
Паднялася,
Усміхнулася
Яна.
Нездарма завейнымі начамі
Снілася мне
Блізкая вясна.

Падвязала хустку новую
І, шчаслівая, прыбегла ў вёску
З першай
Весткаю вясновую.
Добры дзень,
Мая бярозка!

*1928*

* * *

Выйдзі адвячоркам у жытное поле
І паслухай пошум спелых каласоў.
Спадзяванні светлыя ажывуць на волі,
А былое, прошлае патане ў пясок.

Патане, не вернецца, у вятрах развеецца,
Змыецца навечна хвалямі жыцця.
А твая сцяжынка сцелецца і сцелецца,
Вабіць у нязведаны працяг.

*1928*

* * *

Паглядзі на жаўталісты сад.
Вунь ідзе між яблынь лістапад
І з вялізнага лазовага каша
Прадае падсмажаныя пернікі зямлі
За цану наспелай медзі ліп.
А лісты шуршаць, шуршаць, шуршаць.

Нехта пальцамі руплівых добрых рук
Ледзь крануўся сеткі павуцінных струн.
Пэўна, хоча пад суладны ціхі шум
Прывітаць, уславіць восені прыход,
Скінуць з плеч цяжар мінулых год
І напоўніць новай радасцю душу.

Восень, восень!
Тыя песні, неразвоненыя ўсе,
Адгулі бясследна ў пустацветавай красе,
Што спяваў табе калісь паэт,
Сумаваў,
што згас пурпур параненых вяргінь,—
У жыццё прыйшоў другі
Здзейсніць свайго сэрца запавет.

Паглядзі на жаўталісты сад.
Вунь ідзе між яблынь лістапад.
Яснай песняй поўніцца душа,—
Мабыць, ведае, аб чым лісты шуршаць.

*1928*

# ВАЯВАЛІ Ў ПОЛІ

Ваявалі ў полі жнеі-маладзіцы,
Вострымі сярпамі жыта ваявалі.
«Залатая зорка-заранiца,
Не заходзь так рана...» — прыпявалі.

«Залатая зорка-заранiца,
Не стухай за гаем зялёненькім.
Будзіць свёкар, будзіць залувіца
Рана ў поле мяне, маладзеньку...

Будзіць свёкар і свякруха-маці,
Будзіць залувіца,—
За гару ў студзёную крыніцу
На дасвецці чысту ваду браці.

На цямочку ўстану у нядзелю,
Уцяку да роднай маці ў госці.
Лепш бы дзеўкай дома я сядзела,
Чым свае не бачыць маладосці...»

Ваявалі ў полі жнеі-маладзіцы,
Вострымі сярпамі жыта ваявалі,
Прыпявалі: «Зорка-заранiца,
Узыдзі над родным нашым краем...»

Ой, даўпо за лесам — ціхім борам —
Адзвінела песня ў жытніх хвалях.
Зваявалі жнеі свае ліха-гора,
Вострымі сярпамі зваявалі.

*1928*

* * *

Дагараюць кастры...
І як доўгая дзедава казка,
Абзываецца ноч
Таямнічасцю гукаў і слоў.
Я не сплю.
Дзесьці коні жалезнымі путамі ляскаюць.

Месяц з неба,
Бы спуджаны лебедзь,
Вось нырнуў і пагас
За далёкім прыціхлым сялом.

Кажуць,
Рана да ўсходу
Выходзіць русалка-дзяўчына
І збірае ў прыпол квець апалую, ліст.
З кашміровай касою,
Залатымі вачыма...
Толькі гэта ўсё ў песні.
Пра дзявочую долю і вясну
Мне спявала,
Расказвала маці калісь.

Высь, далёкая высь
І прасторы, прасторы...
Вечна б так —
Маладосць і жыццё,
Вечна б сэрцам палаць,
Як вясновыя зоры,
Каб ніколі не гас
Запаветны касцёр.

Чарадзейныя мары
Наплываюць,
Мяняюцца.
Вось даносіцца з вёскі
Першы пеўневы ўскрык.
Хутка раніца,
Свежая, золкава раніца.
Туманом малачаевым

Без трывогі адчайнае
Незабыўная, ціхая ноч дагарыць.

Дагарадь і кастры,
Затрапеча лістамі асіна,
І прачнецца,
І болей ужо не засне.
Ёй адной, толькі ёй
Я даверу ўспаміны,
Сваю першую казку
Аб начлежнай вясне.

*1929*

# ІДЫЛІЯ

Зарослыя, даўнія сцежкі,
Выхаджаныя дарогі
Ад палыновага ўзмежка
Да бацькавага парога.

Парэпаныя, нямытыя
Тут босыя ногі хадзілі,
Хадзіла ты,
незабытая,
Маленства майго ідылія.

Збуцвелы асунуўся вугал
Стагодняй акінутай хаты,
І свет мой абведзены кругам
Акенцаў падслепаватых.

Крыламі варонімі, сівымі
Стулілася ноч.
Не спіцца.
І мроіцца ўсё, што ў крапіве
Завязла ў сіле́ сініца.

Дурная!
Павісла на голлі.
Ці ж свет ёй сышоўся клінам,
Што госця аўсянага поля
Пакваплілася на мякіну?

Няхай гэта мне за шчасце
Счарсцвелага хлеба асушак,
Не згінуць каб,
не прапасці
Ад прыкрае долі пастушай.

Дасць хлебны сухар,
вузел солі
І вытра слязіну маці.
Не быць лішнім ротам болей
Мне ў цеснай,
закуранай хаце.

Зарослыя, даўнія сцежкі,
Дарожных абочын бадылле...
Горкімі йшла узмежкамі
Маленства майго ідылія.

*1936*

# НА ВЫГОДЗЕ

Зязюльчын лён, гладышыкі, чабрэц,—
Зноў пазнаю вас у траве высокай.
Са смагі поўны п'ю карэц
Халоднага бярозавага соку.

І хітраю сцяжынкаю лясной
Іду у салаўіныя харомы,
З чырванастволай гонкаю сасной
Вітаюся, як даўнішні знаёмы.

Са свежай сакавітае вярбы
Скручу я дудку з лёгкімі ладамі;
Сам-насам хочацца пабыць
З табою, шчыры бор, з тваімі жыхарамі.

Надрэжу тонкую пахучую кару,
Хай плача дрэва, пырскае на рукі;
Згадаць далёкую пару
Ужо даўно мне рупіць.

Успомніць босага маленства дні,
Грыбныя пні, малiннік і сунічнік,
І светляковыя агні,
І поўныя крыніцы.

Падлеткам за чужою чарадой
Я выхадзіў выжары і пагоркі.
Ты быў прытулкам мне,
Маёй ядой, вадой
І хлебам горкім...

Прывычна пальцы ходзяць па ладах.
Пяе вярба, паслушная падпаску.
І водгуллем далёкім у гадах
Вяртаецца нявызнаная ласка.

*1938*

# ПЕРШАЯ ПЕСНЯ

Скажы, сінявокае шчасце,
Якою сцяжынкай прыйшло ты,
Якою часінай, парою —
Не чуў я, не бачыў, не знаў.

Якім ключом адамкнула
Ты цесную, цёмную клетку,
Дзе спала маленькая птушка
Доўгім спакойным сном?

Я досвіткам раннім падняўся.
Сонца, умытае ў росах,
Нізка павісла над садам,
Аж слепяцца вочы — вясна!

Доўга стаяў і дзівіўся,
А схамянуўся — позна!
Устрапянулася птушка,
Тугім павяла крылом,

І вось я лячу ўжо: навокал
Лясы расступіліся; рэкі
Блакітнымі каснікамі
Палі і лугі абвілі.

І стала так лёгка; і песня
Празрыстай сярэбранай флейтай
Зайшлася ў пералівах,
Ў шырокі прастор паплыла,

Што людзі спыняліся, слухалі,
У чыстае неба глядзелі:
— Жаваранак! Жаваранак!
— Вястун вясны прыляцеў!

І хто б з іх падумаў, паверыў,
Што ў небе не голас птушыны,
А першая весняя песня
Юнацкага сэрца майго!

*1938*

# ЖУРАВЕЛЬ

Чаму жыццё не падняло
Яго пад хмары залатыя?
Здавён вартуе ён сяло,
Высока выцягнуўшы шыю.

І ўсё цікуе — хто ідзе
Да поўнае яго крыніцы,
Яшчэ здалёк заве людзей
Халоднае вады напіцца.

І кланяецца ўсім зычліва,
Паслушна апускае дзюбу,
Глядзіць з увагаю руплівай
У бездань выцвілага зрубу.

Пап'е сасмаглы падарожнік,
Асушыць конь сваё карыта,
А восень агалосіць пожні
Птушыным развітальным крыкам,

І, ўчуўшы кліч павадыра,
Што свой касяк кіруе ў вырай,
Ён выцягне, расправіць шыю:
— І мне пара, і мне пара

Ляцець! Ляцець! Ды толькі хто там
З пустымі вёдрамі ў варотах?
Не, мусіць, будуць век цвяліць
Са мной жанкі і маладзіцы.

Яны да цяжкага вядра
Мяне жалезам прыкавалі,
Ласкавым імепем пазвалі
І не пускаюць са двара.

*1940*

# ДЗІВА

Купіў я дачцэ салаўя —
З гліны,
Засушанага,
І ажыла
Птушка мая,
Замове паслушная.

Шапнула дзіця
Слоўка адно —
Пырхнуў салоўка
З хаты ў акно
І заспяваў на волі
У нас
У садку,
У бэзавым голлі.

Трапечацца слова —
Жывое,
Цёплае
У горле птушыным
Гулкаю
Кропляю.

Слухаюць людзі.
А я
У здзіўленні стаю:
Што ты сказала,
Дачушка мая,
Салаўю?

*1944*

# ПОМНІК ЛАСЮ

Як вадаспад, пясок сыпучы
Цурчыць струменем пад адхон...
Ён выбег з лесу, стаў над кручай
І так стаіць, усім відзён.

Пад ім шаша няспынным рухам
Шуміць, машынамі гудзе.
— Глядзіце, лось! — А ён і вухам
Не варухне, не павядзе.

Як тонкая страла, нацяты,
Рагамі ўпёрся у блакіт.
Такім на памяць ён узяты
І ў бронзе на заказ адліт.

І як далёкі адгалосак,
Дзе славу ён сваю насіў,—
І назвы навакольных вёсак
І нават прозвішчы — Ласі.

О людзі! — як сказаў бы класік.—
Не любіце прыроды вы.
Няхай бы ж ён і ў нашым часе
Стаяў над кручаю жывы.

І, спуджаны гудком машыны,
Зноў кінуцца ў гушчарнік мог
І каля цёмнае яліны
Біў капытамі рыжы мох.

*1958*

# ВЕРАСЫ

Што гэта: казка, а ці сон,
Ці лесу галасы?
Смычкоў суладны унісон
З размаху, наўскасы

Ударыў — і вясновы дождж
За хмаркаю услед
Пабег, як хлопчык, басанож
У ясны, мілы свет,

Не разбіраючы дарог,
Да пушчы, нацянькі,
Дзе прабіваюць тоўсты мох
Грыбы баравікі,

Дзе сонца пырскае з суніц
І сонныя чмялі
За дзень ад паху медуніц
Зусім абнемаглі,

Дзе ў пацерках густой расы,
Між цёплых баравін,
Нам песню дораць верасы
На дарагі ўспамін.

*1958*

# СОНЕЙКУ

Соня,
Соня,
Сонейка!
Зашумела голейка.

Пачынаецца
Вясна,
Прачынаецца
Сасна.

Точыць
Дзяцел
Долата,
Сыпле
Долу
Золата.

Залатое, уставай,
Дзень шчаслівы пачынай,
І мне, любае, свяці
Ты заўсёды
У жыцці.

*1969*

# НАЦЮРМОРТ

На белым вышываным ручніку
Адкроеная хлеба луста,
І сыракваша свежая ў збанку,
У місе — шаткаваная капуста.

Лагоднасць фарбаў. Толькі бэз
Спалохана стуліўся на самоце,
І зіхаціць на яблыку надрэз,
Застылы на трывожнай ноце,

Што вырвалася кагадзе на свет
І цішыні не хоча пакарыцца.
Адзін скамечаны канверт
Хавае ўпарта таямніцу.

*1969*

# ДОЖДЖЫК

Быў жа ён зусім малы,
А як стаў на ножкі,
Абабег усе вуглы,
Абскакаў дарожкі.

Што гарэзніку гара,
Дрэвы, агароджа!
Выбег з нашага двара
І ўстаяць не можа.

Дыб, дыб, дыб — і на сцяну,
Шлях далейшы сочыць.
У завулак сігануў,
На трамвай ускочыў.

На прыпынку светафор
Лыпнуў грозным вокам,
Ён — з падножкі і папёр
Вуліцай шырокай.

Не зважае на агні,
Смаліць на чырвоны.
Калі хочаш — дагані,
Дзе там — не дагоніш!

Толькі пырскі ад вады,
Мільгаценне ножак...
Ой, наробіш ты бяды,
Непаслушны дождж ык!

*1971*

# ШЧАСЦЕ

Закідайце нераты,
Стаўце венцер —
Столькі шчасця ў чараты
Гоніць вецер.

І пакуль трывае ноч,
Тонуць znічкі,
З возера не зводзьце воч,
Не засніце,

Каб задоўга давідна
Цэль намецiць
І спадыспаду, са дна,
Выхапіць месяц.

*1971*

# СПЯШАЙЦЕСЯ

Спяшайцеся ў поле, у луг, у лясы —
Запісваць птушыныя галасы.
Яшчэ на дасвецці, на самым золку
Зловім на плёнку
Мы перапёлку.
Няхай застанецца на стужачцы хоць
Заклік на памяць:
«Ідзі палоць!».

Нямала за век яна перапалола,
Нямала пожачак перакалола
Горкім асотам, рыжаю пiжмаю,
Родная, любая, ты ж мая, ты ж мая...
Колькі нам дзетак накалыхала,
Колькі ў дарогу перагукала...

Давайце паставім вось тут мікрафон.
Аблюбаваў гэта селішча ён,
Той, хто між птушак самы народны,
Людзям і лесу блізкі і родны,
Тут, у алешніку, дзе зацішней,—
Чуеце, чуеце? — ён, салавей!

Гэта яшчэ толькі голасу проба
I для яго, спевака, не ўвярода.
А вось і бліскучая кантылена,
Самы капёк яго, тое калена,
Адкуль пачынае сапраўдны артыст,—
Вунь па якой вышыні яго свіст,
Аж з верхавіння сыплецца ліст!

Стойце, перад гісторыяй замрыце.
Пішаце вы для нашчадкаў! Пішыце
Для тых, хто, напэўна, дасягне і сонца,
А салаўя будзе слухаць па плёнцы.

Сюды, калі ласка, кінаапарат.
Бачыце — выстраіліся на пожні
Сосны на свой урачысты парад,
Баюся, што на апошні.

Даўно пераліччаныя камлі
Прагны сухмень аблізвае.
Якія бары былі на зямлі —
Пабачыце ў тэлевізары.

Напэўна, будзеце млець у экстазе,
Як самааддана, уладарна
Грукаў калісьці дзяцел у джазе —
Самы выдатны ўдарнік.

...Спяшайцеся ў поле, у луг, у лясы —
Слухаць птушыныя галасы!

*1971*

# СОСНЫ

> Змаглі вы буры і марозы,
> Людской сякеры не змаглі.
>
> *Я. Купала*

Малая ўцеха — кожнаму свой час,
Свой лёс, свой лес, свой леспрамгас.
Да вышыні імкнешся ты з даверам,
А понізу цябе — сякерай.

І раны горкія смыляць смалою,
А ты ўсё цягнешся да сонца галавою,
Начамі не даюць спакою сны,
Што ў свеце ўжо ніводнае сасны.

Апошнія, мы ловім з паднябесся
Па кроплі цёплы сонечны прамень
І радуемся яснаму прадвесню,
Вітаем кожны лічаны свой дзень.

Трымаем каранямі жвір сыпучы,
Каб не засохла плынь жывой ракі,
А будзем падаць, дык наводмаш, з кручы
Зялёнаю маланкай — у вякі.

І, можа, па адным зярнятку кволым,
Дзе адшумелі нашыя бары,
Адкрые астраном і вылічыць геолаг,
Які тут грымнуўся метэарыт.

А буйная фантазія паэта
Дадасць, што на касмічным караблі
Ляцелі мы з далёкае планеты,
Але не даляцелі да Зямлі.

...Ва ўсмешцы скрывіцца,
хто нас судзіў сякерай,
Не перакажа наш апошні сказ.
Ён так і не паверыў, не паверыў,
Што мы жылі, што мы любілі вас!

*1972*

* * *

Не ведаючы стомы і ўвяроды,
Лагодпаю, цярпліваю была
І паслухмяна валакла
Нас па гарбу сваім прырода,

Пакуль не зазлавалі седакі:
— Гультайка! Мы твой нораў пераіначым!
І сталі штурхаць пад бакі,
І падганяць старую клячу.

Бядачка выбіваецца ўжо з сіл
І горкімі слязамі плача.
Ні белы, ні зялёны свет няміл —
Пара на жывадзёрню клячу!

Абыдземся, абыдземся мы без!..
Б'е капытамі волат новы.
...Ляціць узмылены Прагрэс,
Скрозь мільгацяць яго падковы.

*1972*

# ВЕЧНАСЦЬ

Захад пагас на рабінавай гронцы —
Агыля, дзянёк, выпраўляйся за сонцам!

Успыхнуў прамень на дубовай вяршыні —
Зноў пачынае налічваць гадзіны.

Перабірае пальцаў галіны:
Галінка, галіна — і гадавіна.

Зіма заіскрылася на сасонцы —
Агыля, гадок мой, за сонцам, за сонцам!

Час адлятае, махае крыламі —
У сонечны вырай збіраемся самі.

Сняжынка растала ў дзіцячай далоньцы —
Век мой, за сонцам, за сонцам, за сонцам!

Пчолы раяцца, кідаюць пасекі,
А на паліцах пыляцца класікі.

Але застаюцца заўжды на планеце
Верныя вечнасці нашыя дзеці.

У небе іх жаўранкі і жураўлі,
Бясконцыя вёсны ідуць па зямлі.

Зірніце, як па вясёлай дарожцы
Скача дзяўчынка на адной ножцы!

Не па саслоўі, касты і расы —
Падзелены свет на дзіцячыя класы,

На паралелі, мерыдыяны,
Што не адкрыты яшчэ, не спазнаны,

Поўныя радасных таямніц,
Без гора, няпавісці і без граніц!

*1976*

# ДЭЛЬФІНЫ СЛУХАЮЦЬ МУЗЫКУ

Славутыя даўнія меламаны,
Вызнаўшы моры і акіяны,
Ледзь не за фалды нас тузаюць —
Просяць зямное музыкі.
Блішчаць, усміхаюцца
Вочкі-гузікі:
Так падабаецца
Наша музыка.

Спрэс перапоўнены дэльфінарый,
Куды ні глянеш — пары і пары.
Адны фракі,
Адны манішкі.

Акулы-небаракі
Стуліліся ціішкам.
Не вельмі разявіш зубастую пашчу,
Самі кіты на канцэрце нашча.

У старога дэльфіна
Маладая дэльфініха —
Ні то графіня,
Ні то дафініха.

Строгі экзамен для музыкантаў:
Крый бог пераблытаць allegro
з andante,
Не дацягнуцца
Тэрцыяй
Да presto,—
Скандал! —
Не сцерпіць
Фінвал
Пярэсты.

Тонкі знаўца
Усіх мадуляцый
Ловіць быстра
Любыя рэгістры,

Радасна слухае хвалю такую,
Якое не чуў я
І не пачую.

Бывае, скорчаць горкую міну,
Пераміргнуцца дэльфін з дэльфінам,
Сумна ўсміхнуцца сабе — і маўчок:
Верхняга *do* не дабраў смычок!

То раптам зморшчацца ад перабору,
Глянуць з дакорам
На дырыжора:

— Друг паважаны, не тыя вяршыні,
Не тыя прасторы, не тыя глыбіні...

Я ўпэўнен, што так разважаюць дэльфіны.
Магутны ты, чалавек, ды зарана
Сцураўся вытоку свайго — акіяна,
Дзе б'ецца адвечнае сэрца планеты,
Адкуль пачынаюцца далі сусвету,
Які вымяраеш вышынямі ты,
А мы — глыбінямі дабраты.

Горкага азарэння хвіліны:
Вашая праўда, ваша, дэльфіны.
Гэтак сказалі,
                    нібы даравалі,
А мы ж вас нядаўна яшчэ забівалі.

І хоць бы на памяці доказ адзін,
Калі чалавека пакрыўдзіў дэльфін.
Што гаварыць —
                    я часцей усё чую,
Як у няшчасці людзей ён ратуе.

Мабыць, залішне пыхі, зазнайства
Лічыць мне, сябры,
                    вас за ўласнае царства.
І вернага друга, узяўшы за глотку,
Змусіць вышукваць падводныя лодкі,
Гнаць нам у сеці рыб касякі —
Хай служыць, калі ён разумнік такі!

Ці мала, ці мала чаго хто захоча...
Уважлівей глянем другу у вочы,
Паверым у хвілю шчасліваю гэту —
Дэльфіны слухаюць музыку свету!

*1977*

# САКАВІК

Ранак чырвоным плакатам
Цяплу абвясціў вайну.
У штыкавую атаку
Пайшла зіма на вясну.

Зазіхацела зброя,
Крышацца ледзяшы,
Б'юцца зацята героі,
Але ўжо не цяжка рашыць,

Хто ўпэўнена атакуе,
Хто сіліцца цераз край
І навіну якую
Нясе нам шчаслівы ручай,

Якія друкуюць дэпешы
Вясёлыя капяжы,
Бо перамог мацнейшы
На сонечным рубяжы.

*1977*

# ДОБРЫ ЗНАК

І шафёр, і пешаход
Кожны знае ў свеце
Знак увагі — пераход!
Асцярожна — дзеці!

Грузавік спыніў свой ход,
Сталі легкавушкі.
Асцярожна — пералёт!
Асцярожна — птушкі!

Кожны падарожны рад
Прывітаць, прывеціць:
— Добрай раніцы, дзетсад!
Добры шлях вам, дзеці!

Нават сонца маладзей
Глянула з блакіту —
Гэта будучыні дзень
Выйшаў на арбіту.

Хай заўсёды з веку ў век
Добрым знакам будзе:
Асцярожна — чалавек!
Асцярожна — людзі!

*1977*

# ТАЯМНІЦА ПРЫРОДЫ

Падумаеш, увярода —
Адкрыць таямніцу прыроды.
Давай разбяром спачатку
Яе на асобныя часці,
Каб потым ізноў па парадку
Дакладна ўсю нанава скласці.

Мінаецца год за годам,
Сталее дзіця прыроды
І гэтак па-заліхвацку
Сваю разбірае цацку —
Упэўнена, хутка, прыгожа,
А нанава скласці не можа.

*1978*

## ПАСЛЯ СВЯТА

О, колькі ў нас гасціла ёлак
Ва ўборах шчодрых і дарах,
А потым — выкінутых, голых,
Асірацелых на дварах!..

Як апусцелыя калыскі,
Лясны вятрыска лічыць пні,
А след зялёнае прапіскі
Яшчэ на памяці радні.

Матыўчык бесклапотнай песні
Прыліп навечна, як смала.
Успомню — на душы балесна:
Якой ты стройнаю была!

І так няўтульна і пяёмка,
Як пасля свята ў познім сне.
Зляцелі з ёлкі ўсе іголкі,
Адна папала ў сэрца мне.

Бывае, зашчыміць балюча,
Дакорам даўнім засмыліць...
Не мучай, ёлачка, не мучай,
Табе ж, засохлай, не баліць...

*1979*



# ПАВАДОК

## КАРАБЛІ

Даўні вясновы раўчук,
Знаёмыя берагі.
Я па адзін караблік пушчу,
А ты — па другі.

Так і вандруюць яны цэлы дзень,
А мы за імі — услед.
Твоі загудзе і мой загудзе,
І стануць разам на рэйд.

Разам нашыя караблі
Выйшлі ў суровае мора,
І хоць не заўсёды дзяліць маглі
Яны сваё шчасце і гора,

Але на мачтах вернасці сцяг
Заўжды трапятаў і трапеча,
Ён сілу даваў нам у цяжкіх баях
І веру ў сустрэчу.

*1946*

# МАЦЕЙКА

На хвіліну я заплюшчу вейкі —
Прыгадаю белую мацейку,
Што ў гародчыку у нас расла
І начамі летнімі цвіла.
Але што мне кветка,— не пра тое
Я хачу пагаварыць з табою.
Рупіць мне той час,
Першае маё спатканне,
Першае маё світанне,
На аселіцы сталетні вяз.

Прагучыць на выгане жалейка,
Ляжа на дуброву ноч,
Расцвітае ў гародчыку мацейка,
З нас не зводзіць воч.
І гамонім мы да рання з ёю,
З нашаю даверлівай сястрою.

А назаўтра сыдуцца падлеткі,
Стрэнемся на вуліцы між дня
І не можам, як і наша кветка,
Не асмелімся вачэй падняць...

Сына я цяпер заву Мацейка,
Рупіць мне той час,
Водгулле тае жалейкі
І сталетні вяз.

*1946*

# ПАВАДОК

Каторы ўжо гадок,
Як за табой па пятах
Вядзе мяне радок,
Што памяццю прыпяты

Да дужых рук тваіх
І да тваёй усмешкі,
Хоць поруч удваіх
Нам не прайсці па ўзмежку

Паміж густых пшаніц
У самым красаванні
І не збіраць чарніц
У чэрвеньскае ранне...

Намуляў мне радок,
Сцёр шыю ўсю, праклятьы,—
Не рвецца павадок,
Якім к табе прыпяты.

Як каля доўбні вол,
Я мушу на прыпоне
Хадзіць усё наўкол,
Кружыцца аж да скону.

*1946*

# БАРАДА

Бяліць везла палатно
Грэбляю Параска,
Абярнулася на дно
У рэчку каляска.

З трактарам паехаў я,
Каб ты, дзеўка, спрахла.
Эх, няўдаліца мая,
Параска, Парахна.

Даставай свой пасаг,
Што ўсю зіму ткала,
Праз цябе я зачах,
Стаў і сам няўдалы.

Засмяялася Параска
І ад шчасця ў слёзы:
— Прыйшоў трактар да каляскі,
Як каза да воза.

— Гэта ты сама каза,
Я — казёл барадаты,
Пастрыгуся, пагалюся
І прыеду ў сваты.

— Не стрыжыся, не галіся,
Любы мой, прыгожы.
Нават брытвай не краніся
Барады — крый божа!

Пражыву за барадою
Я ў вялікай чэсці.
Ты мне ёю, як мятлою,
Будзеш хату месці.

*1946*

# ПАЧАТАК ВЯСНЫ

Уначы ля цёплае вярбы,
У лістах стуліўшыся, вясна
Веек не магла падняць ад сна,
Толькі з рэхам жураўлінае трубы
Ранкам прахапілася яна.

Адгрымеў за вёскай крыгалом,
Вылецела з вулею пчала,
І дзяўчынка з гладыша пагбом
Першы сок бярозавы піла.

І такім прыгожым здаўся твар,
Блізкі мне да кожнае сузлінкі,
Сонца сакавіцкага загар
З першаю вясновай рабацінкай.

Нечакана ў гэты ясны час
Сталася па свеце дзіва,
Хоць я з ёю бачыўся не раз,
Ездзіў у начное, на папас,—
Зразумеў упершыню, што быў шчаслівы.

Пакідала нас маленства цішыня,
Казка саступала месца былі,
І адчулі мы: у птушанят
Выраслі ўжо для палёту крыллі.

Значыцца, прыйшла-такі яна,
Тая, што была жаданай, крэўнай,—
Маразамі скутая вясна,
Казачная, мілая царэўна.

*1956*

# ПЕРШАЕ, НАІЎНАЕ КАХАННЕ

Першае, наіўнае каханне...
Штодзень я выходжу на спатканне.

Балазе хадзіць не так далёка,
Цераз агароды — лічаныя крокі:

Мне валошкай вышыла матуля
З беленага кужалю кашулю.

А яшчэ ў тым незабыўным годзе
Па апошняй, самай новай модзе

З шарачка — дзе ж корту таго ўзяці? —
З кантамі мне галіфэ пашыла маці.

Дзеля шчасця трэба не так многа,
Толькі вось абуць бы што на ногі.

Ўрэшце, не бяда — і так я прыбяруся,
Каляровым поясам падпяражуся.

Гэта ж не ў чужыя людзі ехаць.
Вазьму шорсткі саламяны вехаць

І каля карыта да знямогі
Буду шараваць парэпаныя ногі.

Боль жахлівы душу праціпае,—
Хай сабе — ўсё выцерплю, стрываю!

...Першыя пакуты і ахвяры,
Першыя, даверлівыя мары,

Хай на змену вам прыйшлі другія —
Самыя вы чыстыя і дарагія...

*1956*

# НА КУРГАНЕ

Курган прыдарожны лясны,
Наверсе — дзве стромкіх сасны.
Як змалку за рукі ўзяліся,
Як змалку навекі зрасліся,
Так разам прабіліся ўвысі,
Да яснага сонца яны.

Ты першаю мне паказала:
«Зірні, як іх доля звязала.
Здалёк яны воку відны,
Іх пояць карэнні адны,
Іх вернасць, іх думы і сны
Крануць не пасмее навала...»

Павер, варушыць не хацеў
Я памяці дзён тых і дрэў,
Хоць зноў пад узлессем вясна
І тая ж дарога значна,
Ды толькі ў самоце сасна
Стаіць на кургане адна.

Другую навала зламала,
Кару ад кары адарвала,
Замоўк яе гоман, заціх.
А мне не забыць іх, дваіх,
Як песень шчаслівых тваіх,
Што ты колькі год не спявала.

Устань жа, сасонка, зірні,—
Ізноў ажылі карані,
Рубцы зацягліся смалою...
Я стану і сам тут сасною,
Навекі зрастуся з табою,
На ўсе свае ночы і дні.

*1956*

# ЗОРЫ НАД СОСНАМІ

Цёплымі вёснамі,
Начамі роснымі
Ззяюць,
Палаюць
Зоры над соснамі,

Над рэкамі чыстымі,
Барамі вячыстымі
Мігцяць, загараюцца,
Пераліваюцца,
Глядзяцца ў азёры
Палескія зоры.

Дні маладосці,
Думкі-парывы,
Узносьце, узносьце
Да зорак шчаслівых
Мае запаветныя спадзяванні
Аб самым жаданым і шчырым каханні,

Каб мы заўсёды
З каханай сваёю
Праз доўгія годы
Ішлі пад зарою,
Той, што высока свеціць над намі,
Што запалілі сваімі рукамі.

*1959*

# РАЗВІТАННЕ СА ШКОЛАЙ

Ад школьнага парога
Да бацькавае хаты —
Уся наша дарога:
Не многа, не багата.

Але ж, сябры, адгэтуль,
Дзе першы крок ступілі,
Дзе таямніцы свету
Упершыню адкрылі,

Дзе светлае юнацтва
З'ядналі дружбай шчырай,—
Не лёгка выпраўляцца
Нам у свой першы вырай.

Нас павядзе дарога
У новы свет багаты
Ад школьнага парога,
Ад бацькавае хаты.

З тужліваю усмешкай
Я вам кажу: — Бывайце
І першай нашай сцежкі
Нідзе не забывайце.

*1959*

# АРЭШЫНА

Пацешная
Між вербаў піцых
Арэшына
У завушніцах.

Цыбаты подлетак,
Яна надзела
Іх толькі сёлета
І то ў нядзелю.

І ўся выблісквае,
Высвечвае,
Такая блізкая,
Сардэчная.

Мая націначка
З вяснушкамі,
Дзяўчыначка,
Давай пагушкаю.

Траха да крохкай
Дакрануся —
І ты ўся ў лёгкай
Завірусе,

А залацісты
Пылок лажыцца
На лес бязлісты,
На ігліцу,

На ўсё зарэчча,
На палянкі,
На нашу стрэчу,
А берасцянкі
Высвістваюць
Ужо ў тумане,
Вітаюць чыстае
Каханне,

Маю арэшыну
Ў агеньчыках,

Навекі грэшную,
Нявенчаную.

І зараз помню
Да драбніцы
Світання промні
Ў завушніцах,

Гаркавы водар
Балігалову,
Што і праз годы
Займае мову.

Такі бясконы
Мой давер быў
Да ласкі сонца,
І да вербаў,

І да прадвесня,
І да выраю,
Да ціхай песні,
Самай шчырае.

Гары,
Палай, мая арэшына,
Маё жывое шчасце
Першае.

*1961*

# ЖЫТА

Бясконцай вечнасці хвіліна.
Запомніце яе і зберажыце:
І ты, мая асенняя каліна,
І позні васілёк у спелым жыце.

Як першае прызнанне і ахвяра,
Так нечакана жыта загучала.
І шчасце горкае, і страх, і кара —
Усё злучылася ў адным харале.

Адзін над намі бог — магутны Бах.
Раве арган, бушуе чад палынны,
Сасмяглы пацалунак на губах,
Як вечнасць — неўпатольны, неабдымны.

Каханая, ты ўсім сусветам правіш
Між небам і зямлёй адна.
І кожны колас — паслухмяны клавіш,
А кожная саломіна — струна.

Бясконцай вечнасці хвіліна...
Запомніце яе і зберажыце:
І ты, мая асенняя каліна,
І позні васілёк у спелым жыце.

*1971*

# ПЕРАВАЛ

Перадзімняя пароша
Прыцярушвае яры,
Познія мае, харошыя,
Лічаныя вечары.

Пад ахову сосны, букі
Нас абапал узялі,
Парадпілі нашы рукі,
Паміж кручаў павялі.

Так бы і перадавалі
Ад скалы і да скалы,
Каб над прорвай пераваду
Не ўсхапіліся арлы:

«Хіба вы павар'яцелі —
Для чаго вам перавал?
Чуеце, шыпяць мяцелі,
Паміж скал грыміць абвал?»

Любая, што нас чакае,
Калі верыць ім, арлам?
А агеньчык ўсё ж міргае —
Гэта нам, напэўна — нам.

Так і вабіць, вабіць кладка,
Аж да самазабыцця.
Хто пяройдзе без агляжкі
Над бяздоннем — ты ці я?

Дарагая, асцярожна.
Гэта мой жаданы міг.
Паасобку нам пяможна,
Наша шчасце — на дваіх...

Хай зімовая пароша
Зацярушвае яры,
Нашы позпія, харошыя,
Лічаныя вечары.

*1971*

# ПРЫЁМНЫ ДЗЕД

З вёскі ў вёску ходзіць быль
Аж па ўсім Палессі,
Як памог сусед Васіль
Удаве Алесі.

Век пражыўшы без дзяцей
Са сваёй старою,
Стаў гарнуцца ён часцей
Да сям'і чужое.

Першых яблык атрасе,
Агурок прымеціць,
На тым часе і нясе
Ўсё суседскім дзецям,

Горкім сіратам вайны,
Тым сынам салдацкім,
Што гадуюцца адны
Без бацькоўскай ласкі.

Западозрылі сакрэт
Бабіны суседкі:
— Не да сірат ходзіць дзед,
Да ўдавы ў адведкі...

Затаіла баба дух
І між цёмнай ночы
Пад страху запалку — шух
У будан сірочы.

Як насохлая трава,
Дом з агнём — упрочкі.
Ледзь паспела удава
Выхапіць сыночкаў.

А жытла як не было
У малых навельцаў.
Засмуцілася сяло
Лёсам пагарэльцаў.

І сказаў злой бабе дзед
Ад людзей употай:
— Я пазнаў твой чорны след
І тваю работу.

Дык жа ведай ты мой план,
Як бяду папраўлю:
Ты спаліла ёй будан,
А я — дом пастаўлю.

— Дом? Заб'е цябе хай гром!
Сам жа босы, голы!..

— Адплаціць за зло дабром
Дапамогуць пчолы,—

Гэтакі ён даў адказ,
Працавіты бортнік.
І не траціў марна час
Слаўны наш работнік.

Сам сякеру у руку —
І часаць бярвенцы.
Пойдзе ў лес, а там — мядку
Два і тры вядзерцы.

Як сказаў, так і зрабіў.
Аж на ўсю дзялянку
Хату новую зрабіў,
Звонкую, як шклянку.

Быў выдатным цесляром
Паляшук наш хітры.
— Колькі возьмеш ты за дом?
Кажа дзед:
— Паўлітра.

Усялілася сям'я.
Рады ўсе суседзі.
Усе хваляць Васіля.
А Васіль:
— Пры чым тут я?
— Як — пры чым?

— А хто ж памог?
Дзед смяецца:

— Мабыць, бог,
А яшчэ — мядзведзі...

— Ты мядзведзяў не чапай,—
Крыўдзяцца вяскоўцы.

— А без іх бы я прапаў —
Лепшыя дазорцы.
Хто глядзеў маіх калод,
Вартаваў у вуллях мёд?

Быў жа гол я як сакол,—
Дзед зірнуў на бабу,
Паказаў рукой наўкол:
— Не дасі мне рады.

Я лясным сябрам кіўну —
І прымчаць па бервяну.
Бервяно да бервяна —
І гатовая сцяна.

Не згарэць ёй, не спалаць.
Глянеш — і стаіць палац.

Колькі будзеш ты паліць,
Столькі буду жыць і жыць,
Будаваць яшчэ ямчэй,
Што не адарвеш вачэй.

Бачыць баба — кепскі жарт,
Перці на ражон не варт.
Чорт залез яму ў рабро,
Падбівае на дабро.

Трэба памірыцца,
Мужу пакарыцца,
Бо разлучніца-ўдава
Давядзе да згубы.
Бач,
злысела галава,
Голая як бубен.

А калісь быў чуб густы,
Кучаравы, цёмны...
— Кім жа будзеш дзецям ты?
— Дзед.
— Які?
— Прыёмны...

Вырасціў дзяцей Васіль
Добрым словам, ласкай.
Так пайшла па свеце быль,
Потым стала казкай.

*1972*

# ДЗЯВОЧАЯ ПЕСНЯ

Тайну я сваю хаваю,
Берагу бяду маю —
Аднаго даўно кахаю,
Пра другога думаю.

А яны — і той, і гэты —
Паўз маё акеначка
Ходзяць і не бачаць свету,
Ані-нічагенечка.

На ўсю вуліцу палае
Цвет на падаконніку —
Завушніцамі хістае,
Свеціцца, як сонейка.

Аніводзін не спыніўся,
Нават не прымецілі.
Трэці глянуў — задзівіўся...
Пакахаю трэцяга!

*1973*

# МАЛАДЗІК

Не замяла, а заняла зіма
Бясконцую прастору памяці —
Не сівер, не мароз, не замеці,
А толькі ты мне бачышся сама.

Ляціш з Траецкае гары да скверыка,
Спяшаешся — я пазнаю здаля
Цябе ў пушыстым шаліку каўнерыка,
Блакітную, як матыля.

Ляціш, мая высокая сняжынка,
Уніз, дзе прыпынілася рака.
Тэлевізійны шпіль скрозь аблачынку
Штурхнуў пад бок маладзіка.

І той з цікаўнасцю дзіцячай,
Наіўны, пачынаючы паэт,
Прынік, прыпаў да тэлеперадачы,
Нанова адкрываючы сусвет —

І радасны, і сумны, і трывожны,
Узрушаны прыгожасцю зімы
І асцярожны да сняжынкі кожнай,
Якую выбіраем мы.

Не бойся, любая, я затулю ў далонях
Няўпэўненую, родную руку,
Шчаслівы гэтай поўначчу сягоння,
Удзячны нашаму маладзіку.

*1973*

# ДУБ І РАБІНА

Награжацца дубу штосьці,
Зранку смыліць у крыжы,
Ломіць старыя косці —
Пойдуць, напэўна, дажджы.

Пачнецца абложная восень,
Асыплюцца жалуды.
Мала ўжо засталося —
І жалуды, як гады.

Было іх заўсёды процьма,
Думалася — не палічу.
Цяпер за сваё бясклапоцце
Горкай цаною плачу.

Сівер пілуе голлі,
Перабірае сукі.
Зірну — ні дубка ў наваколлі,—
Дзе вы, мае сынкі?

Дзе ты, мая рабіна,
Што каля тыну расла,
Што дарагім успамінам
І песняй на сэрца лягла?

Ні ты да мяне перабрацца,
Ні я да цябе — не змаглі,
А вернасці нашай застацца
Суджана ўсё ж на зямлі.

Не перапыняць кахання
Ні яр, ні гара, ні рака...
Дзяўчынка бяжыць на спатканне,
Трымаючы туфлі ў руках.

У вечаровым змярканні
Сячэ па асфальце дождж.
Верце, сябры, каханню —
Я сам бы пабег басанож,

Каб толькі яна чакала,
Каб толькі вярнуўся той час —
Нават бетон і камень
Не разлучылі б нас.

*1973*

# ТВАЯ ЎСМЕШКА

Толькі святла, што ў тваім акне,
Толькі святла!
Чаму ж ты так позна сустрэлася мне,
Дзе ты была?

Столькі за дзень свой я выбіў дарог,
Столькі за дзень,
Лепшай, жаданай пабачыць не змог,
Не змог анідзе.

Столькі дарог у завеі густой,
Столькі дарог!
Які ж ён высокі да ўсмешкі тваёй,
Гэты парог!

*1973*

# СТАРАДАЎНІ РАМАНС

Месяц схаваўся за хмарку,
У небе не хоча гуляць.
Буду пры недагарку
Даўнюю кнігу чытаць.

Што мне да шумнага свету,
Да ворагаў і сяброў.
Добра старыя паэты
Пісалі калісь пра любоў.

Мы самі, як кажуць, з вусамі.
Нямала на памяці ёсць.
Ёсць і ў самога таксама,
Здаецца, прыемнае штось.

Ах, памяць... Зноў месяц з-за хмары
Мільгнуў і пагас на вачах.
Дымам сышоў недагарак.
Кончылася свяча.

*1973*

## ДЗЕДАВА ШЧАСЦЕ

Шчаслівая старасць... Не варта
Уводзіць славечка ў моду,
Нібыта казырную карту
Выхапілі з калоды.

Бог засцярог ад азарту
І ад пустое дакукі.
Не браў сам у рукі картаў,
І не бяруць мае ўнукі.

Быў да людзей я цярплівы,
Добраму слову рады.
Сказаць, што цяпер нешчаслівы —
З дзедаўскай здымуць пасады.

*1973*

# САРАКІ

Ты думала, што барыша,
Што выкупу яна чакала,
А бедная мая душа
Усё яшчэ цябе кахала.

І прагнула твайго цяпла,
Глядзела ў вочы зблізку.
І хоць галоднаю была,
А не кранула міскі.

Прыпаўшы ўпотай да рукі,
Яна ўздыхнула моўчкі
І ў сумны дзень на саракі
Пайшла навек упрочкі.

*1974*

# ПРЫРУЧЭННЕ АГНЮ

Кінуты гаспадаром няўдзячным,
Ён памкнуўся быў за ім услед.
Доўга ў цемры бег, пакуль не ўбачыў,
Што ўжо не дагоніць, што аслеп.

Ледзь навобмацак прыпоўз у прысак
Каля прыдарожнае лазы,
У гарачы жвір уткнуўся пысай
І счарнелы прыкусіў язык.

І скапаў бы — спамінай як звалі,
І які быў верны ён, агонь,
Калі б гэтай ноччу не прысталі
Двое закаханых да яго.

Быццам пасля доўгае разлукі
Папрасілася да сябра на пастой,—
І, ласкавыя адчуўшы рукі,
Ён падскочыў, замахаў хвастом.

І такой пяшчотай і любоўю
Агарнула ўзлесак цішыня —
Родныя, жаданыя абое
Застануцца тут ажно да дня!

І з'ядналіся адным даверам —
Цемра са святлом, з душой душа...
Ціха спалі дрэвы ў змроку шэрым,
І ўздыхала сонная шаша.

Хто пра шчасце іх, траіх, раскажа?
Не пытай ні ясень, ні сасну.
І агонь знябыўся, не заўважыў,
Як на досвітку і сам заснуў.

*1977*



# ПЕРАДЗІМ'Е

* * *

Якая асалода — жыць,
Знаць вартасць кожнае гадзіны,
Тым, што адкрыта, даражыць
І адкрываць за дзівам дзіва,
З апошніх сіл узяць рубеж,
Бясконцасці жыцця здзівіцца,
Пераканацца, што жывеш,
Што сэрца яшчэ можа біцца!

* * *

Баяўся цябе, нерадзім'е маё,
Не спадзяваўся, што буду шчаслівы.
Ранкам навеяла снегу сумёт,
А надвячоркам — новае дзіва:

Сад варухнуўся, прачнуўся, ажыў,
Светлай душою наскрозь заіскрыўся.
Такі малады ён ніколі не быў,
А галава, галава — ў серабры ўся!

* * *

Я да цябе, мая вярбінка,
Прыпаў лістком і так прырос,
Што сівер не атрос узімку,
Гарачы не спаліў мароз.

Апошнім ападу вясною
На дол, у цёплую зямлю.
Ты не журыся нада мною —
Я светлую цябе люблю.

* * *

Не ўпікай, не дакарай,
Не карай за гэта,
Што ў людзей — самы май,
А маё лета

Канула за далягляд
У смузе сіняй.
Цешыўся — у цвеце сад,
Аж на голлі — іней.

* * *

У ладзе, у згодзе — і на табе: годзе! —
Ні развітання і ні праводзін.

Толькі і следу — два напаміны,
Дзве каляіны, дзве палавіны,

Дзве даты: адна так шчасліва пачата,
Другая чакае прагнай расплаты,

І разышліся, і апямелі,
А ўсё ж яны сыдуцца зноў, паралелі,

Перакрыжуюцца
Каляіны,
Непрымірымыя
Палавіны.

* * *

Долу ўпала галавою
На гасцінец апусцелы.
Нахіліўшыся над ёю,
Клён стаіць асірацелы.

Што ж ты, белая бяроза,
Не пайшла з ім да канца
І на самай паўдарозе
Кінула ўдаўца?

* * *

Невядома, колькі год
Прастаіць на скрыжаванні
Недарэчны Дон Кіхот,
Векавечны у чаканні.

А пасмеюць ветракі
Зноў пачаць усё спачатку,
Горда ён шпурне з рукі
Ім у твар сваю пальчатку.

* * *

Адышло за небасхіл
Мілае мне лета.
А ці быў я лету міл —
Ні адной прыкметы.

Утаіла свой сакрэт,
Нават успаміны.
На дарозе толькі след
Позняй павуціны.

* * *

Зіма ўжо на двары,
За позваю шле позву,
Завея верх бярэ:
Позна!

Не позна, дацягну
Да запаветнай мэты —
Хачу сустрэць вясну,
Дай развітацца з летам.

* * *

Першы лісток на дрэве
Вылузаўся з пялёнак,
Першы падбел на прыгрэве
Падняў свой сцяжок зялёны.

Першы агеньчык жоўты
Сонца ў далонях загушкала.
Вясна мая, няўжо ты
Вярнулася разам з птушкамі?

* * *

Дождж мінуўся — цёплы, ветлы,
І такая ціша ў полі,
І прастор празрысты, светлы
Поўніцца зноў гулам пчоллім.

Толькі чмель яшчэ ў бадыллі
Жоўтай піжмы прыдарожнай
Мокрыя прабуе крыллі
І ўзляцець ніяк не можа.

* * *

Выспеліў колас зерне,
Калі зберажэш хоць адно,
Пасееш — і нанава вернеш,
Коласам стане яно.

І покуль запас не растрачаны
І не мінула вясна,
Яго захавай для спадчыны —
Чакае твая баразна.

* * *

Дарэмна кажуць, у жыцця
Дарогі не пытайся —
Ледзь толькі выйшаў на прасцяг
І ўжо назад вяртайся.

Хіба магла кароткай быць
Пражытага загадка,
Каб столькі вызнаць, перажыць
І ўсё пачаць спачатку!

*1972—1975*



# ПЕРАПРАВА

## МАРОЗНЫМ ДНЁМ

Наш эшалон ідзе на фронт, на поўнач.
Мінаюць сёлы, гарады, раз'езды,
А я чакаю ўсё тоі станцыі ў прысадах,
Што ў марах стала мне прытулкам родным.
Чакаю хвілі тоі,
Калі у белым вецці
Мільгне ружовая хусцінка.

— Оля!
Ты кожны эшалон,
Ты кожны поезд
Выходзіш сустракаць,
Мяне чакаеш.
Хай дзеці спяць,
Не будзем іх трывожыць,
І мы гады шчаслівыя ўспомнім.
Прасторны дзень...
І граюць, граюць сосны,
Напятыя між небам і зямлёю,
Як струны велічнай віяланчэлі,
І вецер
Не ўпраўляецца нацерці смык жывіцай...

Мы дзеці.
От шчыглы па леташні дзядоўнік
Чародкай шуганулі.
Не палохай.
Хутчэй сіло!
Мы ўсіх іх пераловім!
Мы ўсе сады суседскія абыдзем
І высачым заечы цёплы след...

Гудок. Пара.
Не, мы не дзеці.
Не юнакі наіўныя — бацькі,
Што за спакой дзяцей,
За іх жыццё, за шчасце
Аддаць гатовыя ўсю кроў да кроплі.

І калі мне не суджана вярнуцца,
Ты ім, як вырастуць,
Пра гэты дзень успомні
І навучы любіць зіму, шчыглоў, сініц
І слухаць, як над светам днём пагодным
Звініць сасна.

*1939*

# ГОРКІ ВЫРАЙ

1

Ужо даўно спакою не дае мне
Той дзень навалы — той пакутны ліпень.
Ён неадступнаю карціць паэмай,
Ён просіцца ў радок. І ліку
Няма тым словам, што трывожаць душу
І сушаць смагаю няўтольнай дзень-удодні.

Ды хіба ж словам супакоіць змушу
Тугу сваю па бацькаўшчыне роднай?
Няхай жа ў гэты верш увойдзе
Палёў і сенажацяў свежы подых,
Хай сталасці маёй суровы поўдзень
Юнацкія атуляць годы.

Хай над пакутнаю зямлёй пральецца
Даждлом жаданым, як слязінай весняй,
Хмурынка, што на Случчыну імкнецца
Тужлівай і самотнай песняй.

За ёю ўзняцца, узляцець бы сэрцу,
Праз хмары цяжкія маланкаю прабіцца,
Між небам і зямлёй, як між жыццём і смерцю,
Пранесціся апошняй навальніцай!

2

У пакінутай хаце
Все восеньскай сцюжай,
Адзінокая маці
Па сынах сваіх тужыць.

І няма ёй спакою
У жыцці ні хвіліны:
Скруха цяжкай рукою
Выводзіць маршчыны

І на матчыны косы
Сівізною лажыцца.

Але сэрца не просіць.
Злітавання ў чужынца.

Хай адгэтуль далёка
Да жаданага шчасця,
Вобраз твоі яснавокі
Мне пакуты не засцяць.

Горак час развітання,
Горак шлях і прытулак,
Толькі веру ў спатканне,
Ў нашу радасць, матуля.

Праз нягоды ў жыцці,
Праз нязнаныя мілі —
Покуль жыў — буду йсці,
Толькі б вочы свяцілі.

А аслепнуць — тады
І праз цемру ісціму,
Адшукаю сляды
Да спусцелай хаціны.

Па сузлінках маршчын,
Па цяплу тваёй ласкі
Прачытаю ўспамін,
Боль крывавае казкі.

3

Вучыся у ракі!
Зусім змялела,
І душна ў раўчуку знясіленаму целу,
Яна ж ніколі не паддасца зморы,
А ўсё бяжыць,
спяшаецца у мора.

Грызе жарству,
гарачы крышыць камень,
За кожны куст хапаецца рукамі,
Каб толькі вузкае не перасохла горла,
Каб толькі смага не памёрла.

4

Будзеш ты усюды неразлучаны
З першымі ўспамінамі жыцця,
З ціхаю тугой па роднай Случчыне,
З шолахам альховага лісця,

З тою прыдарожнаю алешынай,
Што ў зацішшы пры шашы шуміць.
Хіба ж ёсць у свеце шчасце лепшае,
Як пад небам бацькаўшчыны жыць?

Дужым і разгалістым карэннем
Разраслося дрэва з той пары,
Як узяў на ростані ў кішэню
Ты кавалак цёплае кары.

Невядома, колькі давядзецца
Даўкую тугу ў душы нясці,
Толькі вечна маладому дрэўцу
Случчынай у памяці цвісці.

Прыйдзе час — алешына сустрэне,
Пры шашы ў зацішшы зашуміць.
Не сустрэне — адшукай карэнні,
Ласкай успаі — і дрэва будзе жыць.

5

Мой родны, сіратлівы дом —
Бязлісты вяз з пустым гняздом,
Але ўжо ловіць прагны слых
Ваш лёт, далёкія буслы.

Заселяшеў магутны вяз,—
І зноў вясна склікае нас.
Бывай, мой вырай — шлях пакут,
І я за птушкамі ў свой кут!

6

Колькі часу міне,
Колькі новых дарог —
Не забудзе мяне
Родны матчын парог.

Шлях пакутны, цяжкі
І далёкі прайду,
Як раўчук да ракі,
Плынь былую знайду.

Бо праз камень гарачы
Ўзыдзе жоўты палын,
І пазнае, убачыць
Гора матчына сын.

Гэта боль яе сэрца
Горкім лістам прарос,
Прыдарожнае дрэўца
Ад яе ссохла слёз.

Васількамі праз жыта
Глянуць вочы дзяцей...
Не, іх смерць не забыта
І драпежніка цень!..

Я змяту чужаніцаў,
Іх цяжкія сляды,
Прыпаду да крыніцы,
Да жывое вады.

Цярплівая маці!
Хто дарогу праб'е,
Хто надзеі не страціў,
Зноў абдыме цябе.

7

Бывае, ліст прысохне да кары —
Не адарваць вятрам, ні навальніцам,
Калоціцца, трасецца разам з дрэвам
І горнецца да спуджанай галіны.

А быў бы я лістом — і я трымцеў бы,
Хапаўся б за кару, за вецце,
Бо крыўдна ж доле гінуць без пары,
Хоць больш за ўсіх і жыў,
і зеляпеў вясною.

Зярняці я зайздрошчу. Паглядзі,
Як рада яно буры! Ўпасці, ўпасці,
Каб новым нарадзіцца дрэвам
І зноў пад ясным сонцам выспяваць!

8

Беларускі вакзал у Маскве,
Ты — прыпынак маіх успамінаў,
Падыду да цябе — ажыве
Ўсё, што там, на радзіме, пакінуў.

Мільгануць светафора агні,
І я слыхам да шуму тулюся —
Можа, гэта жаданы цягнік
Адыходзіць да Беларусі?

Мне адсюль — як рукою падаць.
Адна ноч — і я ў Мінску дасвеццем.
«Добры дзень!» — зашуміць па садах
Маладое, вясёлае вецце.

Родны край! Веру ў суджаны час,
Для мяне ты адзіная ўцеха,
Толькі цяжкая ноч паміж нас,
І экспрэсам яе не праехаць.

Хай вылічвае дні, хто прывык
Пачакаць і адкласці да лета,
Каб на першы ўрачысты цягнік
Запасціся плацкартным білетам.

Прагну шчасця па праву дажыць,
Каб у вочы глядзець яму шчыра.
Не дажыць —
Лепей голаў дачасна злажыць,
Чым вярнуцца дамоў пасажырам!

9

Што заслужыў — не абмінеш. Прымай!
Прымай, сусветны кат, нянавісцю кляймёны!

Збяру я слёзы, гора і адчай,
Усе праклёны.

Збяру я попел спаленых братоў,
Зняслаўленых сясцёр пакуты,
Збяру іх чыстую, святую кроў,
Іх боль і смутак.

Вось спадчына мая і запавет.
Я ўстанавіў дакладна дату
І вызначыў у сведкі свет
І дзень расплаты.

Той судны дзень у твар табе глядзіць
Бязлітаснымі, прагнымі вачыма.
Дык падніміся ж, помста, і ідзі
Па ўсёй айчыне.

І ўсюды, дзе засцігнеш, папялі
Апошніх вылюдкаў, увесь іх парад,
Ты гнеў людскі збяры з усёй зямлі,
Ляж цяжкай хмарай.

Пачнуць здыхаць,— хай чорным груганом
Пагарда прыляціць і выдзеўбе ім вочы
За спалены бацькоўскі дом,
За лёс сірочы.

За гора, слёзы, за адчай,
За ўсе праклёны,
Што заслужыў — не абмінеш. Прымай!
Прымай, крывавы кат, нянавісцю кляймёны!

*1941—1942*

## ПАЛАНЯНКА

Напаткалі — забралі, схапілі,
Не сказалі — звязалі, скруцілі,
Не спыталі — завезлі, прадалі,
На няславу салдатам аддалі.

Хай бы рукі мне накрыж зламылі,
Чым такое я ганьбы дажыла.
П'яны немец мне ў вочы рагоча
Над маёю красою дзявочай.

Абвіваюць, сціскаюць шыю
Ненавісныя рукі чужыя,
А мне думка ўсё страшная рупіць —
То пятля, то пятля, а не рукі,
То бізун, што над роднымі свішча,
Над радзімай, над папялішчам.

Цешся ж, злыдзень, з дзявочае сілы,
Дай і я абдыму цябе, мілы,
І павісну, павісну на шыі,
Сцісну — воўкам завыеш, завыеш.

Не віном, а тваёю крывёю ўп'юся,
Так уп'юся, ажно паваліюся.
І не ўстану, не падымуся,
Хай жа словам хоць добрым напомпуць
Мяне ў Беларусі.

*1942*

# ВЕРНАСЦЬ

Ледзь грэчка цветам поле зацярусіць,
Дык чайкі ў вырай — даўняя прыкмета.
Не бачыў іх адлёту з Беларусі
Я ў тое лета.

За хмарамі самотных бесхацінцаў
Самога ў свет пагнала
Мяне па Чэрвеньскім гасцінцы
Вайны навала.

Не па дубах замшэлых, не па зорах
Ішоў я на усход — па сэрцу,
І леглі ў ім разоры гора —
Гадам не сцерці.

Не сцерці з памяці трывожны рокат,
Жахлівы цень драпежніка над вёскай,
Дзе хлопчык трохгадовы яснавокі
Туліўся да бярозкі.

Аберуч агарнуў, як з маткаю абняўся,
І ў сполассе сачыў за бамбавозам,
І нават у пажары не расстаўся
З бярозай.

Няма мне з той пары спакою днямі,
Начамі доўгімі не спіцца —
Дзіця ўрасло ў душу, як дрэва каранямі,
І плача ў навальніцу...

Зямля мая! Да самае магілы
Я буду прад табою вінаваты,
Як не знайду ў сабе такое сілы,
Каб спапяліла ката.

Мне у цябе вучыцца тым законам,
У кожнага тваіго дзіцяці,
Як да апошніх дзён, да скону
Быць верным маці.

*1943*

# ПЕРАПРАВА

Як з крэменю адвечнага, жывога,
З душы мне выкрасаць такое слова трэба,
Каб асвяціла родную дарогу
І хоць палоску матчынага неба,

Срабрыстую істужку ціхай Случы,
Што паўз гаі бярозавыя ўецца,
Па жвірыстых узгорках,
паміж кручаў
І хвалямі тугі мне ў сэрца б'ецца.

Да крохкае крушыны, да затокі
Пайду сцяжынкаю,
што ясны месяц вытча,
І, нібы ў люстры,
ў памяці глыбокай
Свайго маленства ўбачыў я аблічча.

Напрыканцы сяла магутны вяз
Да неба ўзняў разгалістыя вілы,
З яго вяршаліны я першы раз
Угледзеў свет да краю небасхіла.

Так блізка ўсё! Але па кладцы,
Па мосціку самотным, летуценным
Ракі не перайсці,
не перабрацца
У родны дом,
што прагне вызвалення.

І сціску ў лютай ярасці тады
Сапёра цяжкую сякеру,
Каб прыступам узяць у ледзяной вады
Свой запаветны бераг.

Драпежнік цэліць бомбамі ў насціл,
І леглі на вадзе крыві салдацкай меткі,
Мо суджана і мне не перайсці,
Але грымяць імклівыя танкеткі,

І рэха сцелецца на сотні вёрст.
А з дыму і туману
На доўгія вякі ўстае ўжо мост,
Жыццём заваяваны.

*1943*

# СМЕРЦЬ КУЛЯМЁТА

Узятае ў абход знянацку
Сяло ўжо наша, а з варот
Іклатую ашчэрыў пастку
На нас шалёны кулямёт.

Цераз парог скакаў, кідаўся,
Падыспад лез, пад самы ніз,
А потым з прывязі сарваўся.
У немым шале камень грыз.

Але, спасцігнуты гранатай,
Заскрыгатаў, заціх і лёг
Ля прызбы беларускай хаты,
Ля скурчаных нямецкіх ног.

І доўга ненавісным вокам
Яшчэ нацэльваўся ў прасцяг...
А над застрэшшамі высока
Чырвоны развіваўся сцяг.

*1944*

# ДРУГОЕ НАРАДЖЭННЕ

Паставілі нас чатырох над ямай,
Не ўласны лёс, а вораг нас судзіў.
Былі з маленства мы сябрамі,
І клятве воіна не здрадзіў ні адзін.

Нас чорнаю зямлёю прыдушылі.
І толькі аднаму стаў цесным роў.
Я ўстаў, я выбраўся спадыспаду магілы
І, хоць на вейкі наліпала кроў,

Разгроб зямлю змакрэлую рукамі,
Намацаў поблізу і тых траіх.
Усталі зоры першыя над намі
І загарэліся ў вачах сяброў маіх

Не промнямі святла, а тым дакорам,
Што болем працінае да душы.
— Я лягу з вамі тут,
пад небам зорным,
Памру я каля вас, таварышы...

— Не, ты не ляжаш. Куля чужаземца
Яшчэ не выпіла тваёй крыві,
Навылет не прабіла твайго сэрца —
Жыві!

Сяброў сваіх запомніў пазаўсёды,
Бо аж да самага канца вайны
Ішоў наперадзе свайго я ўзвода,
А поруч утраіх ішлі яны.

Вы бачылі, як дрэва асыпае
Зярняты спелыя з сваіх галін,
Як кружацца за ветрам і лятаюць
Яны пушынкамі па ўсёй зямлі,

Кладуцца ля дарог, у каляіны,
Паміж куп'я ў балоце, у трысці,
Хоць цераз цяжкую, бязлітасную зіму
Нямногім ім вясною прарасці.

А я прарос, прарос праз жвір, праз камень,
Праз тоўсты пласт жалеза узышоў,
Знясіленымі, цяжкімі рукамі
Разгроб скарэлую зямлю і кроў.

Яшчэ не будзе доўга мне спачыну,
Бо жыць мне за траіх, як біўся за траіх,
А буду паміраць — перакажу і сыну
Імёны іх.

*1945*

# РУЖА І ШТЫК

Перасохла рэчышча,
Дзе крыніца бегла.
Дзе стаяла печышча —
Учарнела цэгла.

А мясціна бою
Зарасла травою,
Лебядою сіваю,
Стрыклівай крапівою.

Толькі там, дзе ўпаў ты,
Каля самай хаты,
Дзе твой след крывавы —
Не растуць там травы.

Помнік твой увіты
Непадкупнай ласкай —
Штык у жвір убіты,
А паблізу — каска.

Беражэ ўспаміны
Пра цябе, мой дружа,
Куст густой шыпшыны,
Ўвесь у буйных ружах.

Хай хто дакранецца
Да яго рукою —
Упадзе на сэрца
Кроў жывой расою.

Прарасло жалеза
Вострымі шыпамі,
Будзе вечна свежай
Аб салдаце памяць.

*1956*

## АПОШНІ ПАТРОН

Каржакаватая бярэзіна,
Што пры шашы здаўна расла,
На хатні абыходак зрэзана —
Ледзь рады ёй дала піла.

На гузыры тоі сухастоіны
Наросты чорныя адны,
А пад карою куль прабоіны —
Іржавыя сляды вайны.

Але знянацку дрывасекам
Быў знойдзены ў камлі патрон.
Прызначаны для чалавека,
Бярог шматок паперы ён:

«Было паслана нас дванаццаць
Сюды, на мінскую шашу,
Каб на Маскву не даць прарвацца
Варожым танкам... Я пішу,

З жывых апошні, цяжкаранены,
Крывёй сыходзіць галава.
Усе іх танкі намі спалены,
Жыва любімая Масква!..»

Так піша нам салдат з бяссмерця
І пасылае свой паклон,
А разам з ім жывое сэрца
І той апошні свой патрон,

Што выстраліў з такою сілай,
Каб вораг век ужо не змог
Таптаць зямлю, што нас расціла,
І нашых сцежак, і дарог.

*1958*

## ЗЯМЛЯ Ў ПАТРОНЕ

Свяшчэнную зямлю ў патроне
З пагранзаставы я прывёз.
Патрон і сёння ў абароне,
Вартуе мой і дом, і лёс.

Няхай даўно з уліку зняты,
Але ў абойме мы адной
І назаўсёды з ім — салдаты,
Ён — верны спадарожнік мой.

Змагла ж у сэрцы ўся змясціцца
Яна, здабытая ў баях,
Бясконцая ў сваіх граніцах,—
Радзіма мілая мая.

*1973*

# ПАМЯЦІ ПАРАХОДА

Як птушцы ў цёплую пару б
І мне ляцець на крылах,
Калі б не востраў Ітуруп,
Не шлях цераз Курылы.

Тут караблі сцішаюць ход,
І я спынюся ў скрусе:
На дне пад намі — параход,
Ён зваўся «Белоруссия».

І хоць жаданага гудка
Не чуў і не пачую,
Бяссмертнай славе земляка
Я сэрцам салютую,

Як салютуюць караблі,
Што ўслед ідуць за намі.
Шырока хвалі паплылі
Зялёнымі вянкамі.

Успомню родную зямлю,
Між соснамі сцяжынку,
Пашлю герою-караблю
Я верасу галінку.

Дарэмна кажуць, што слядоў
Вада не зберагае,
А памяць столькі ўжо гадоў
Ідзе, ідзе кругамі

Цераз нянавісці сцяну,
Праз полымя пажараў,
Як ён ішоў цераз вайну
Вакол зямнога шара.

І перамог такую даль,
І штормы, і засады,
Але страшнейшая шаленства хваль
Затоеная здрада,

Крывая ўхмылка на губах
Зласлівага суседа...
Спадыспаду рванула гмах
Японская тарпеда.

І колькі іх усіх было —
Ніхто са дна не ўстане,
Трывожна рэха прагуло
Па Ціхім акіяне,

Апошняй роспачы гудкі,
Як весточка дадому,
Як развітальныя радкі
Усім сябрам, знаёмым...

Дарэмна кажуць, што слядоў
Вада не зберагае.
Мінула столькі ўжо гадоў,
А рэха не змаўкае.

Да безыменных тых магіл
Плывуць вянкі і словы...
Плыві і ты за небасхіл,
Лісток мой верасовы.

*1973*

# ЗОЛАК НАД УСУРЫЙСКАМ

Здасцца, не блізка,
А зыркасць якая —
Над Усурыйскам
Золак палае.

Сонца гвардзейцы,
Вам вечна свяціцца,
Тры сэрцы:
Луцкі,
Лазо,
Сібірцаў.

Тры яркія знічы
У перамозе —
Жывыя абліччы
На паравозе,

На паравозе,
Судзілі каторэму
Каты-забойцы
Быць крэматорыем.

Вы не згарэлі
У чорным прыску —
Брацкая топка
Стала калыскай,

З якой развінацца
З новаю сілай
Сонцу, юнацтву
І верным крылам.

Прыціх на світанні
На плошчы вячыстай
У хваляванні
Строй урачысты.

Ранак праменіцца
Вераснёвы:

— Юныя ленінцы,
Будзьце гатовы!

Гэта над плошчаю
Трох камуністаў
Сонца ўздымае
Сцяг прамяністы

І пакідае
Сваю калыску,
Зусім маладое,
Мілае зблізку —
Такое ж,
Як над Масквою
І над Мінскам.

Толькі на ўсходзе
Зніч
Застаецца —
Ніколі,
Ніколі не гаснуць
Тры сэрцы.

Хоць і не блізка,
А зыркасць такая —
Над Усурыйскам
Золак палае.

*1973*

# СПАКУСА

Злосцю пянавісць не выб'еш, зямля,
Як выбіваюць клін клінам.
На тысячу градусаў вышай пуля
Раптам падскочыць твой клімат.

Вачэй не паспее аслеплы свет
Расплюшчыць на паўгадзіну —
Дакладна разлічана колькасць ракет
На лік чалавека-адзінак.

Хто ў гэтай драме — герой,
хто — статыст,—
Распішуць стратэг і статыстык,
Схаваўшы лоб за бранірваны ліст,
Сумленне — за фігавы лісцік.

Адзін толькі дотык, узмах рукі —
І радасны ўскрык Герастрата...
Няўтольнай спакусай глядзіць праз вякі
Хіжае вока вар'ята.

*1975*

# ВЫШЫНІ СВЯТЛА

Вышыні святла — святыні,
Саласпілсы, Хатыні,
Крэпасці Брэсцкай руіны,
Вы ўжо не толькі ўспаміны,
Што душы людскія крояць,

А памяць, прысяга і споведзь,
Запісаныя навечна
На дрэве магутным, рассечаным
Маланкаю да карэння.

Не вытрывала зняменяя,
Загаварыла каменне
Такой невымоўнай пакутай —
Не чутай яшчэ, не адкутай
Ні ў бронзе, і ні ў жалезе,
І ні ў радках паэзіі.

На попеле, на руінах
Шуміць пераможнае жыта...
Вышыні святла — вяршыні
Жыцця, што бяссмерцем здабыта.

*1975*

## СУНІЦЫ

*Памяці*
*Рыгора Лынькова*

Яшчэ няспелае, дачаснае
Упала ніцам
І запалала лета краснае
Усё ў суніцах.
Упаў на шлях апошні ясень,
Як пагранічнік.
Пад гусеніцамі не гасне,
Гарыць суніччнік.
Світанак у смузе дыміцца
На пераправах.
Гараць чырвоныя суніцы
У чорных травах.
Цівосе жыта палілося,
Запалавела —
Агнём калоссе запялося
І спапялела.
Пад устрывожанай Айчынай
Маланак рэха.
Гарыць ляшчэўнік у лагчыне —
Вянкі арэхаў.
У лесе снайперы кукуюць,
А не зязюлі.
І, затаіўшыся, цікуюць
Дарогу кулі.
І колькі нас у тых лагчынах —
Не злічыць рэха.
Чарнее завязь на ляшчыне —
Вянкі арэхаў.
Далёкі досвітак дыміцца
На пераправах.
Гараць жалобныя суніцы
У чорных травах.

*1976*

# ПОЎДЗЕНЬ

1

Я слова запаветнага шукаў,
Яно здавалася мне патаемным промнем,
Які асвеціць мора глыбіню,
І неба высь, і вырыс той паэмы,
Што не напісана яшчэ, але даўно
Збіраецца, як хмарка, па дажджынцы
І толькі жджэ ўладарнае маланкі,
Каб на зямлю засмаглую праліцца.

Вось блізка ўжо калёсы грукацяць,
То навальнічны воз наўчвал імчыцца,
Конь грывай трасянуў — і яркая дуга
Знікае за далёкім краем лесу.
Па вуліцах, па плошчах, па дварах
Бягуць навыперадкі ручаіны
І ловяць небасхіл — спакойны, чысты,
Нібы сумленне шчаснага паэта,
Які ўжо выплакаў людское гора,
Што замінала грудзям вольна дыхаць.
Зямля прыціхла ўся і прагна п'е,
Не могучы напіцца ўдосталь.
Нарэшце гром так неба скалануў,
Што ўпала і разбілася вясёлка
І морам разлілася скрозь.

Я кідаюся ў залатыя хвалі,
Крычу, аж сэрца замірае ў шчасці...
А што, каб гэтак вось і жыць мне,
У пырсках сонечных ляжаць на жвіры,
Глядзець на бераг у смузе далёкай?
О не! Напэўна б, я з нуды зайшоўся,
Каб не спазнаў ніколі смагі
І радасці — знайсці крыніцу ў спёку,
Прыпасці да яе гарачымі губамі,
І піць, і піць — і яснымі вачыма
Зноў зазірнуць у глыб людскога сэрца.

Няхай нялёгка мне даецца шчасце,
Затое ведаю цану я кожнай кроплі,

Сусвет увесь у ёй бясконцы бачу,
Як пада мпой маланкі б'юць у хмарах,
З душы, як з крэменю, красаюць слова.

А слова тое ў кожнага жыве
У самых запаветных таямніцах,
І чым глыбей яно — чысцей і сэрца,
І чалавек дужэй сваёю воляй,
Бо ў цяжкі час яго сагрэе шчасце,
Што над калыскай матчынай спявала,
І сонца, што свяціла над радзімай,
Палоска неба над бацькоўскай хатай.

2

Запала ў памяць мне, як маці цалавала,
Падняўшы з долу, хлебную крыху,
І сам я цалаваў, бо змалку ведаў,
Якою працай хлеб даецца людзям.
Не думаў я, што прыйдзецца зазнаць
Той праўды горкае яшчэ і дзецям.
Не думаў, бо вакол цвіла зямля
Не цветам макавым — крывёй салдацкай,
Крывёй людзей, што самі леглі зернем,
Каб зашумець магутным ураджаем.
Прызнаюся, мне крыўдна было думаць,
Што дзеці, можа, і не ўспомняць,
Якой пакутай абышлося шчасце.
Ну, што ж, няхай. Няхай іх небасхіл
Заўсёды будзе чысты і бясхмарны.
Хай светлы будзе шлях і ясная зара!
Няхай ласкавае іх сонца зззяе
І над маёй бацькоўскай галавою.
То — поўдзень мой,
то — поўдзень пакалення
Людзей пары, шчаслівай і прыгожай.

Але не ведала і не хацела ведаць
Цішы маё пяўрымслівае сэрца,
І дзень і ноч сумленню рупіў доўг,
Вялікі доўг перад табою, маці:
А чым жа я сплачу пакуты,
Якія выцерпела ты ў жыцці,

Калі ішла ў далёкі горад
З апошняю куліткай за плячыма
Да сына, што «харошую навуку,
Бог дасць, спасцігне — стане кавалём...».
Пакутніца мая! Яшчэ б хоць раз
Цябе пабачыць, галавой схіліцца...
Якраз за дзень да страшнае навалы
Ты наказала мне: «Ратуй дзяцей, сынок!»
І словы гэтыя назаўтра сталі явай.

Я з сынам на двары стаяў уранні
І ў неба яснае глядзеў. Неспадзявана
Над намі чорныя завылі «месершміты».
І рухнуў дом. Пад цэглай — чалавек.
Грызе агонь раскінутыя рукі.
Вайна. І толькі сын не разумее,
Не хоча ён баяцца самалётаў.
Яны, як гусі-лебедзі, не раз
На лёгкіх крыллях хлапчука ўзнімалі.
Так у дзіцячыя спалоханыя вочы
Ўвайшла нязнаная дагэтуль казка:
Крумкач над намі крыллі распрасцёр
І сочыць прагна ненасытным вокам,
Каб рынуцца наніз і трупамі засеяць
Пакутныя дарогі Беларусі.
І я ляжаў на іх крывавымі начамі,
А ўдзень, як нанава народжаны на свет,
Зноў радаваўся ліпеньскаму сонцу,
Што так высока нада мною ззяе,
Што зноў над самай галавою поўдзень,
Якому суджаны нязнаныя дарогі.
І ўпершыню я зразумеў тады,
Якое шчасце жыць пад родным небам,
Глядзець на дрэвы, слухаць іхні шум,
Заўважыць першы пажаўцелы ліст
І кожную назнаць на ім сузлінку!

3

Хай будзе Магілёўская шаша
У памяці маёй да дзён апошніх,
Дзе я на трэці дзень свайго выгнання
Знайшоў скарынку хлеба напал з пылам,

Дзе зыркі промень мне працяў душу,
Дзе мілая паўстала постаць маці
І я адчуў — нясу не чэрствы хлеб,
А ўпэўненасць нясхісную і веру,
Што пройдуць праз усе выпрабаванні,
Як праз стагоддзі матчына бяссмерце.

Наводшыбе ад страшнае шашы
Тым поўдзенем я ўбачыў парадзіху;
Ёй полагам быў дол, травой засланы,
У галавах зацвітвала каліна,
І вочы ціхае зняможанай жанчыны
Свіціліся нявыказаным шчасцем.
Яна адчула першы дотык губ
Таго, хто быў адзінаю надзеяй,
Каго ад бомб і куль фашысцкіх катаў
Для нашай будучыні ўратавала,
Каму у грудзях кроплю малака
Праз мукі вынесла і зберагла ў спякоту.
Салдатка-маці! Суджана табе
Яшчэ нямала дзён далёкае дарогі
Па ўздзірванелым полі з цяжкім плугам,
З касой на вытаптанай сенажаці,
З сярпом па жытняй пожаці гарачай,
З вінтоўкаю па сцежках партызанскіх.
Салдатка-Беларусь! Каторы раз
Драпежнікі ірвуць тваё жывое цела
І выдзеўбаць імкнуцца вочы,
Каб ты не ўбачыла сваіх дзяцей,
А ты нясхісна стаіш на скрыжаванні
І з-над далоні на Усход глядзіш
З упэўненасцю, верай і надзеяй.
Няхай жа благаслаўлёным будзе дзень
Народзін будучага чалавека,
Гаспадара і тубыльца зямлі,
Каб ні яму, ні дзецям і ні ўнукам
Не давялося ўжо бадзяцца па дарогах!

4

І у мяне і у маіх дзяцей
Украў чужынец мілае маленства.
Мінуліся вясёлыя забавы —

І матчын рупесак, яе трывогі
Душу дзіцячую кранулі без пары.

З вайны і на вайну, з акопа ў акоп
Бадзяўся бацька цэлымі гадамі,
І доўга потым я не мог прывыкнуць
Да прышлага ў сям'ю салдата
У выцвілай ватоўцы, цяжкіх ботах.
Так і маім расці прыйшлося дзецям,
Жыць успамінамі далёкіх дзён
І матчынай маркотнай песняй.
І калі суджана нам быць жывымі —
Мне і таму, чый сын радзіўся ў лесе,—
Я ведаю, ніколі нашы дзеці
Не папракнуць нас крыўдным словам.
Яны ўжо добра ведаюць, што шчасце —
Не цукру дроб і не асушак хлеба,
А сонца, што над роднаю зямлёю
Заззяе і ў суровы поўдзень
Асветліць шлях да будучыні нашай,
Якая разам з нашай маладосцю
І разам з нашай сталасцю прайшла
Праз горкія пакуты, роспач, смагу
І чыстай стала, як сумленне маці,
Як песня, што ў душу навек запала.

Гарачы поўдзень над зямлёй стаіць.
Куды ні глянь — адны руіны, попел.
Дзень добры, Беларусь! У горкі час
Вяртаюся я ў родныя мясціны.
Паспелі ўжо травою зарасці
На папялішчах ямы ад снарадаў,
Сагнулася ад першага ўраджаю
Малая яблынька. Жаўцее
Асірацелы колас — скора, скора
На поле выйдзе першая жняя.
А восенню глыбокаю разорай
Тут пройдзе па іржэўніку салдат,
Што выхадзіў ажно чатыры леты
За плугам цяжкае вайны.
Увесну глянуць з жыта васількі,
А ён пазнае вочы тых,
што ў бітвах палі.

І перакажа іх імёны сыну,
Таму, што поўдзенем гарачым нарадзіўся
І ў кроплі матчынага малака
Увесь сусвет убачыў неабдымны,
Зазнаў гаркоту палыновых сцежак
І промень шчасця — жыць пад родным небам!

*1944*



# ДОМА

* * *

Лёгка адшукаць яшчэ
Родную руіну —
На зарослым хацішчы
Расцвіла шыпшына
І гняздо салаўя
Туліць галінай...
Маладосць мая,
След твой не загінуў.

*1946*

# ТРЫПУТНІК

Уздоўж дарожных каляін,
Уздоўж абходжапых сцяжын
Яго заўважыць
Кожны падарожны.

Яго нямала топча ног —
І босых, і абутых.
Другі б ужо змарнеў, знямог
У крыўдах і пакутах,
А ён расце, трыпутнік,
А ён цвіце, пакутнік.

Я думаў, можа быць, людзьмі
Ён гэтак пакараны,
А людзі раяць — прыкладзі
Яго лісток да раны:
Суніме боль трыпутнік,
Ўсё выцягне, пакутнік.

З дзіцячых год запомніў я
Шырокі ліст прыкметны
І добрае тваё імя,
Мой дружа запаветны,
Зялёны мой пакутнік,
Трывалы мой трыпутнік!

*1946*

# ДОМА

Чарэшня звісла цераз плот,
Жаўцее цындалея,
Гарбуз свой выкасаў жывот
І на прыгрэбцы грэе.

Напэўна, прыцемкам кажан
Крылом мяне крануўся,
І я ў акопах не ляжаў,
Не быў у завірусе

І ні ў атаках, ні ў баях,
І ні ў цяжкім паходзе...
Стаіць пад вартай жураўля
Дубовы наш калодзеж,

І ўжо ў руках не кацялок —
Знаёмае вядзерца,
І вышываны ручнічок
Аб жорсткі твар мой трэцца.

Са скавародкі стус блінцоў
Наскідвала ўжо маці,
І зноў я пазнаю хлапцом
Сябе ў гэтай хаце.

Сяджу і слухаю зімой
За комінам на печы,
Як тонкай ніткай ільнянай
Звініць марозны вечар.

Над галавой снуе павук
Для навіны аснову.
І веру я,
малы хлапчук,
Прыкметам і замовам.

На Новы год на дно вядра
Кладу ў ваду я грыўню,
Каб наша хата ад дабра
Ламалася у жніўні.

Вясной, пачуўшы першы гром,
Я грэйма цераз лужы
Бягу да дуба — б'юся лбом,
Каб быць мне самым дужым.

Каб добры лёс убачыць свой,
Я верны спосаб знаю,—
Расою першай лугавой
Я вочы абмываю.

З тых дзён мне родны кут відзён
Заўжды пад ясным небам,
З тых дзён у ростані жадзён
Я матчынаму хлебу.

Напэўна, прыцемкам крылом
Мяне кажан крануўся...
Стаіць здаўна знаёмы дом
Каля раўка пры лузе.

Яго я помніў па вайне,
Як біўся за айчыну...
Глядзіць радзіма на мяне
Шырокімі вачыма.

*1946*

# ШКОЛА

Пазнала ты ці не пазнала,
Але знаёма ўсё тут мне:
І на партрэце малады Купала,
І выцвілая карта на сцяне.

Я нават адшукаў і лаўку тую,
Дзе выразаў сцізорыкам імя.
Няхай Таццяна Мікалаеўна даруе,
Бо перад ёю вінаваты я.

Калі жыве яна яшчэ на свеце,
Хай дойдзе гэта слова да яе,
Бо і цяпер мы перад ёю дзеці,
Таварышы, аднагадкі мае...

Ізноў вярнуўся я на месца тое.
Над партаю сагнуўся і пішу.
Звіні ж, маё маленства залатое,
На сэрца ападай, зялёны шум!

Пшаніцай нахіліся над сярпамі
І грушы сапяжанкай у садку...
Няхай настаўніцу заменіць памяць
І павядзе за словам па радку,

Па гэтай карце, да драбніц вядомай,
Дзе вызнаў, выхадзіў мясціну не адну...
Прыйшоў нялёгкай сцежкай я дадому
Праз доўгую пакутную вайну.

У чыстым небе над маім калгасам
Плыве ў Берлін штодзённы самалёт
Па звычнай, па дакладнай трасе,
Здалёк чуваць яго знаёмы ход...

Сыходзіць чэрвень. Сама касавіца
У гэтую спякотную пару.
Ідуць грабельнікі —
падлеткі, маладзіцы,
Між іх я пазнаю сястру...

Любімая мая! Нядаўна ж браў на рукі
І русыя разгладжваў валасы,
А гэта і тваїму ўжо сэрцу рупіць
Маленькі Васілёк, белагаловы сын...

Але ён вучыцца ўжо іншым словам
І сэнсу ўжо другіх прыкмет,
Каб зноў упершыню, каб зноў нанова
Адкрыць вялікі і дзівосны свет.

*1946*

# ПРЫМАК

Гавораць, што прымачы хлеб — сабачы,
А я, браткі, па праўдзе вам скажу:
Жыву сабе, не ныю і не плачу,
Па бацькаваму дому не тужу.

Калі адпісвалі мяне ад часці,
Пытаюцца: куды ж табе білет?
Нашто ён мне, маё пад бокам шчасце,
Чаго мне вандраваць за свет.

Ускінуў я за плечы свой мяшэчак,
Прымайстраваў на рэмень кацялок,
Іду знаёмаю дарогаю пяшэчкам
І ўбачыў ваш калгас яшчэ здалёк.

Мне абысці яго ніяк няможна.
— Дзень добры! —
і карціць падаць руку.—
Стаміўся от, кажу, у падарожжы,
Перадыхнуць дазвольце земляку.

Даю цукеркі дзецям і — паверце —
Яшчэ не ўспеў мяшэчка развязаць,—
Пазналі хлапчукі мяне, от чэрці,
І нават слова не далі сказаць.

Прыпомнілі. Маленькі нават бацькам
Пачаў па тым жа часе называць.
Не вытрываў і большы: «Гэта ж дзядзька,
Што хату нам дапамагаў стаўляць!»

Падаў я кашміроўку маладзіцы.
— Даўно на памяць дзеля вас прыпас,
Хоць бачу, вы паспелі ўжо забыцца,
Як з фронту прыязджалі мы ў калгас,

Як хату крыў я, як пруты падвязваў,
Як ваш бярозавік збаночкам піў...—
Заплакала ўдава: «Пазнала я адразу,
Як толькі ты парог пераступіў...»

Калгасную сядзібу абышлі мы.
Паказвае яна мне: «Паглядзі!
Да нашай вішанькі дубок прыстаў у прымы,
Адкуль узяўся ён?»
— Я пасадзіў!

Не клалі у парозе мы падковы —
На добрае найшлося ў нас і так.
І выраслі ўжо дзеці прымаковы,
І прозвішча забылася — прымак.

*1946*

# СІВІЗНА

Невядома, калі ты яе і заўважыш.
Паглядзішся ў люстэрка — і вось табе на́ —
Навіну нечаканую сам сабе скажаш:
У мяне сівізна.

Так, не вельмі прыемная гэта прыкмета.
Толькі што тут паробіш — прывыкай,
мілы друг,
Калі ў самай палове гарачага лета
Пачынае над намі кружыць белы пух.

Пэўна, гэта і селі пушынкі на скроні,
Учапіліся так, што не вытрасем мы.
Бачыш, дрэвы ў лістах — і густых і зялёных,
А зямля пабялела яшчэ да зімы.

З маладосцю нялёгка развітацца, дружа,
Слоў уцехі не трэба, не гавары.
Шчасце наша прайшло праз сувеі і сцюжы,
Многім з нас давялося пабялець без пары.

Смутак нашых дзяцей, у сіроцтве ссівелых,
Нашых матак украдзеная вясна...
Перад вамі схіляюся сэрцам збалелым,
Прад табою, суровая сівізна!..

Толькі ёсць і такія, што рады дачасна
Для красы ў валасы прыпусціць серабро.
Для спакус легкаверных ён выбеліць пасму:
Сівізна ў галаву, бач, а чорт у рабро.

І за чаркай гатоў выхваляцца да ранку
Пра ахвяры свае, што адкінуты ніц,
Колькі раз ён жаніўся і колькі яшчэ на
прыманку
Трапіць мілых, наіўных дурніц.

Так прыгожа яго галава серабрыцца,
Быццам самы шыкозны класічны парык.

Ён упэўнен, што ёсць яму чым ганарыцца,
Ён даўно ўжо да славы прывык.
Хто пад п'яную руку і пазайздросціць,
Скажа: слаўна на свеце пажыў, старына.

. . . . . . . . . . . . . . . . .

Правам старасці, правам сваёй маладосці
Праклінаю такую цябе, сівізна!

*1956*

## ПАЛЕССЕ

Палессе, звонкае Палессе,
На гэтай сонечнай зямлі
Мы новыя пачулі песні
І шчасце тут сваё знайшлі,

Хай шлях бацькоў быў камяністы,
Ішоў праз багну, валуны —
Не адступілі камуністы,
І не адступяць іх сыны.

Мінуць гады, і ў светлай яве
Устане ўвесь палескі край.
Не, мы не думалі аб славе,
Нам часу не было. Няхай

Раскажуць новыя паэты
Пра нашы маладыя дні,
Пра тых, хто над зямлёю гэтай
Запальваў першыя агні.

*1959*

# ЭПІТАФІЯ ВІРУСАМ

## ПРЫЗНАННЕ

О, рыфмы, рыфмы... Я падчас,
Як здраднікаў, баюся вас.

Вам толькі вымавіш: люблю,
А вы ўжо мыліце пятлю.

Паслухаешся вас, даверышся,
Вы шэпчаце: пішы аб верасе,

Пішы аб восені, аб просіні,
Пішы аб тым, аб чым папросім мы.

Бывае, аж завыеш: годзе!
Не раз пісаў я аб прыродзе,

Пісаў пра росы, верасы,—
Хачу праславіць вірусы.

## ГРЫП

Дальбог, ён мне ні сват, ні брат,
Ні сябра на капейку.

Адны гавораць — азіят,
Другія — еўрапейскі.

Як ліст ад веніка, прыліп
І з ног зваліў пракляты грып.

П'ю аспірын, пацею
І маю ўсё ж надзею:

Пацеюць акадэміі —
Дрыжыце, эпідэміі!

## ФАРБЫ

Я ў мікраскоп не глядзеў электронны,
І так я пазнаю лыча тваіго выраз:
Такі ты паважны,
надзьмуты,
фасонны,—
Ты здорава вырас,
Разбойнік вірус.

Самаўлюбёна глядзішся ў люстра.
Ты ўжо філосаф, прарок Заратустра.
Распаразаўся, зазнаўся,
Цынік,
Плюеш на вакцыны,
На біяміцыны.

І спіш спакойна, з каханкамі водзішся,
Даволі густа і плённа плодзішся.
Ад здавальнення мурло ільсніцца,
Табе ўжо царства павальнае сніцца.
Стаяць гарой
За цябе заступнікі,
Вы нават нагой
На мяне прытупнеце.
«Ён фарбы згушчае!» —
Вішчаць мяшчане.

Як
Гаварыла
Адна гарыла,—
Кожнаму міла
Роднае рыла.

## ПРАМОВА НА ХАЎТУРАХ

Бясспрэчны наш поспех —
Знішчана воспа,
Знойдзены меры
Супраць халеры,
Вакцына прывіта
Ад поліяміэліта.

А дзе чума?
Даўно няма.
Раструшчым,
Расплюшчым
І раку клюшні!..
Кадзілам шуруе
Поп на клірасе:
«Алілуйя, алі-лу-йя
Усопшаму Ві-ру-су...»

## АСЦЯРОЖНА!

Памёр Вірус,
Закапалі ў магілу,
А ён вылез,
Збудаваў вілу

На сто тысяч з гакам,
З гаражом, агароджай.
«У двары злы сабака.
Асцярожна!»

Відно адразу —
Салідны мужчына:
Загадвае базай,
Кіруе машынай,

Сябруе з музамі,
Знаёмствам рад,
Развівае сувязі,
Мацуе блат.

Паглядзець люба,
Новых звычаяў знаўца,
Ён вянец шлюбны
Бярэ ў прафпалацы,

Зіхацяць пярсцёнкі
У самога, ў жонкі,
А шаппе славечка —
Запаляць і свечкі.

Сямейнай заруkі
Вянчаюцца ніці,
Злучаюцца рукі,
Яднаюцца кінці.

Вітаюць нябожчыка,
Віншуюць з пагасам,
З адказнаю цёшчаю,
З новай пасадай.

## ПАЖАДАННЕ

Навошта заглядваць у мікраскоп.
Я добра бачу твой нізкі лоб,
Хіжай нажывы
Хітры мікроб.

Канчаю, вірус, твой жыццяпіс.
Нямала ты сэрца маё папагрыз,

А ўсё ж спадзяюся — можа, патраплю
Яшчэ і табе напісаць эпітафію.

*1961*

# КРУМКАЧ

Успышкі выбліскваюць рэдкія
На трансфарматарнай вышцы.
Каму ты каркаеш рэквіем,
Прарок у чорнай манішцы?

Можа, убачыўшы чэрап
На мачце высакавольтнай,
Успомніў сярмягі шэрыя,
Бізун ашалелага войта,

Орды захопнікаў прагных,
Што тут, у палескіх дубровах,
У балата́х, у багнах
Склалі навек галовы...

Здзіраюць часоў наносы
Землечарпалкі кіпцямі.
Гудуць трыумфальныя сосны
Абапал зорнае Прыпяці,

Якая злучыла поясам
Хвалю марскую з крынічнай
І колас зрадніла з коласам —
Жытнёвы з пшанічным.

Кажуць, гадоў за трыста
Жыве ён, аслеп, аглох.
Да нас прыляцеў турыстам
З далёкіх, сівых эпох.

Як чэрап з пустымі вачніцамі,
Тырчыць на высокай мачце.
Смейцеся, вербы піцыя,
Смяяцца не зможаце —
Плачце.

*1962*

# ДАРАГІЯ СТРЭЛКІ

Шчаслівы той, хто не хварэе,
Не лічыць тыдняў і гадзін,
Не адзначае юбілеяў
І не спраўляе імянін.

І я не меў такое звычкі,
Гадоў пражытых не лічыў,
Любіў спрачацца, лез у стычкі
І часам нават чарку піў.

Паўвека грукнула паэту,
І рады ўсе сябры мае
Увекавечыць дату гэту,
Ў гісторыю ўпісаць яе.

А каб запомніў імяніннік,
Што йдзе не ўгору, а з гары —
На памяць залаты гадзіннік
Падаравалі мне сябры.

Не мае права выйсці мелкім
Цяпер ні слова з-пад пяра:
Час лічаць дарагія стрэлкі —
За розум брацца, брат, пара.

*1962*

# КРУГІ

Накапаваная мінута,
Нікога ты не абышла.
Над безданню ўзнялася крута
Твая няўмольная скала,

З якой і я зірнуць павінен,
Пачуўшы суджаны сігнал,
Калі на акіяне сінім
Падымецца дзевяты вал

І паласне ў пястрымным шале
Бязлітаснай маланкі меч,
І з хмарамі сальюцца хвалі,
І завіруе чорны смерч,

І, пацяшаючыся, з кручы
У вір, у прорву штурхане...
Так толькі кат ахвяру мучыць —
Ты ж не спалохаеш мяне.

Апошні раз спакойна ў сэрца
Маё сумленне зазірне,
Бо плынь жыцця не перарвецца,
А толькі кругам варухне.

Калі ж ты быў патрэбен людзям,
Сваёй душой ім дарагі —
Людская памяць доўга будзе
Кругамі біць у берагі.

*1962*

# НАШЧАДКАМ

Далёкае прышласці гіды,
Усё вам будзе вядома:
Егіпецкія піраміды
І нашы ракетадромы,
Касмічныя акіяны,
Глыбінныя айсбергі,
Што вызнаны і спазнаны,
Як новае сэрца Блайберга
Пасля яго перасадкі,

І нашы пасадкі на Марсе,
Злыя згрызоты і звадкі,
Што выцерпела зямля ўся,

Якія нам дзьмулі
Пасаты,
Якія мусоны,
Якія нас гнулі
Насатыя
Фараоны,
Якія адважныя гены
Ахвяравалі сабою
Дзеля шчаслівай змены
Адной галавы другою.

*1969*

# У ІМЯ АЙЦА...

У імя айца і сына
І ўсемагутнага духу,
Божа, не грукай у спіну
І не лупі па вуху.

Ты так мяне, грэшнага, перыў,
Што я ўжо ва ўсім вінюся,
Самаахвярна веру
Кожнай тваёй аплявусе.

Нібыта на прывязі човнік,
Снуюся ў жыццёвых кроснах,
Раб твой, слуга твой, чыноўнік,
Якому ад страху млосна.

Ледзь тузанеш нагавіцы,
Урэжаш казённай папругі,
Прысыплеш азадак гарчыцай,
А потым прызнаеш заслугі.

Падымеш мяне, балеснага,
Спагадай прылашчыш урэшце,
І я ўжо спяваю песні
Пра дзіўнае дзіва ў рэшаце.

Аж выпінаюся з сілы,
Першы бягу за пратэсам
Навысцілкі перад усімі,
Наперад самога прагрэсу.

Таўку ўжо іншых у спіну,
З размаху луплю па вуху
У імя айца і сына
І ўсемагутнага духу.

*1969*

# СТАРАСЦЬ

Ты была яшчэ слабай і кволай,
Пабяліла адзін толькі волас.

Мне з табой было лёгка змагацца.
Я схапіў валасок паміж пальцаў

I рвануў — знай маю ты натуру:
Не дазволю псаваць шавялюру.

Што мне волас адзін! А праз месяц
Серабром заіскрылася дзесяць.

Ды не здаўся я — рваў іх дачасна,
Скуб са злосцю за пасмаю пасму.

Цераз год спахапіўся: абскубан,
Галава мая ўся — быццам бубен.

Што паробіш — прывык да такое.
Часам злёгку пагладжу рукою,

Варухнецца ў душы ціхі голас:
Хоць бы волас, адзін хоць бы волас.

*1969*

# ПЕРАД ПАРОГАМ

Многа я парогаў перамог —
Холаду, нянавісці і зла,
Гукавы пераступіў парог,
Да парога падышоў святла.

Прарываюся праз цемру скал,
Цераз ноч да сонечнага дня,
А за пераваламі — перавал,
А за вышынёю — вышыня.

Дзякуй, недасяжны мой парог,
Мне цябе пабачыць памагло
Цераз пстры будучых эпох
Душ людскіх высокае святло.

*1973*

# ЯДЛОЎЦАВЫ КУСТ

Не парушаючы плыні штодзённай,
Буду шчаслівы ціха знямець.
Прашу — не кладзіце ў стадоле казённай
І не трубіце ў жалобную медзь.

Не прымушайце плакаць прамоўцаў —
Баюся, што могуць расчуліць мяне.
Пагасне зялёны агеньчык ядлоўцу
І нават галінкай не варухне.

Усіх вызваляю ад сумных візітаў,
Загадзя дзякую ад душы
Таму, хто даставіць хуткім транзітам
Без перасадкі па слуцкай шашы

Да ўзгорка таго, што пагляду прыкметны
Між родных і мілых прастораў здалёк.
Як лёгка мне будзе дыхаць паветрам
Лугоў канюшынных, пшанічных палёў.

Прыпынак мой ціхі. Няхай не знайшоў я
Ні надпісаў гучных, ні нават прыкмет
Далёкіх вытокаў свайго радаслоўя —
На бацькавым бацьку страціўся след,

Але папярэднік і продак мой ведаў,
Што не канчаецца вечнасці рух,
Распачынаючы зноўку ад дзеда
На дрэве жыццёвым памяці круг.

Не парушаючы плыні штодзённай,
Добра надзейны прытулак свой мець.
Ядлоўцавы куст, абеліск мой зялёны,
Вечна табе на радзіму глядзець.

*1974*

# ВАРТАВЫ ЧАСУ

Ён — лепшы наш прыхільнік,
Спаць позна не дае.
Вы скажаце — будзільнік,
Э, не, сябры мае.

Вы скажаце, напэўна,—
Найлепш вартуе час
Гарласты бабін певень,
Што нас будзіў не раз.

Прычыну знойдзе кожны,
Хто сам наспаць ахвоч.
Вартаўніку няможна,
І ён не зводзіць воч.

Ноч цемраю агорне
Навокала зямлю —
Упарты, непакорны,
Ён кажа: — Я не сплю!

Праб'е шчыліну ў небе,
Уважліва глядзіць —
Каму на працу трэба,
Каго пара будзіць.

І ночы шкарлупіну
Крамсае на шматкі,
Не знаючы спачыну
Бяссонныя вякі.

Світаннем пачынае
Ён свой працоўны дзень.
Ён першы нас вітае,
Сонечны прамень.

*1975*

## СЭРЦУ

Не наміраўца канфлікт з інфарктам,
Хоць яны адзін другога варты.
Прывыкаем пакрысе да засцярогі,
Да карэты «хуткай дапамогі».

Што з табою, што з табою, сэрца?
Не баялася глядзець ты ў вочы смерці,
Давяраючы апошняму патрону,
На вышыні падымаючы свой сцяг чырвоны.

Ад якога ж страху ты трапечаш,
Хочаш дацягнуць да немачы старэчай?
Калі навучылася баяцца —
Лепш тады дачасна разарвацца!

*1975*

# МУЖНЫ ВЕК МОЙ

Хто ў пяту Ахілесу
Пацэліць ямчэй?
Паскарэнне прагрэсу —
Хутчэй жа, хутчэй!

А навошта, уласна,
Нам здалася пята?
Гэта ўжо не сучасна —
Цемната, цемната.

Лепш прыдасца гуманны
Ахілесу нейтрон.
Сыпанём з неба манны —
І душа з яго вон.

Так не справіўся гром бы
І маланка — наўрад,
Як лагодная бомба,
Міласэрны снарад.

Кругабег непазбежны,
Ты адстаў,
Ахілес,
А драпежны грабежнік
Паскарае прагрэс.

Свет сыходзіцца клінам,
Ледзьве-ледзьве жывы,
Так імчыцца імкліва,
Як на злом галавы.

Сплanаваны канечны
І прыцэл, і размах,
І трапечацца вечнасць
У зладзейскіх руках.

Зноў сініць падкалодны
Са старых сваіх гнёзд,
Да таго ўжо халодны,
Што па скуры — мароз.

Войны, здрады і змовы,
Голад, подкуп і яд...
Мужны век мой суровы —
Будаўнік і салдат,

Каб да новых сузор'яў
Даплылі караблі,
Самым пільным дазорным
Стой на варце зямлі.

Веру я, што ўратуеш
Ты жыццця вышыню,
Назаўсёды ўтаймуеш
Апалеласць агню.

*1977*

* * *

Ужо не словам, а пажарам
Сваю адданасць сведчаць догме.
Зямля пад ядзерным цяжарам
Зусім знясіленая стогне.

З нахабнай пыхай і апломбам
Напагатове крутасветы
Ператварыць самую ў бомбу
Малую нашую планету.

Як забаўка, блакітны шарык
Трапечацца на тонкай нітцы.
Што лепей — журавель за хмарай
Ці кволая ў руках — сініца?

А ім аднолькава — і птушкам,
І стручаным у моры рыбам,
І нашым чалавечым душам
Пад атамным апошнім грыбам.

Намарна абяцанні, клятвы
Без глебы, без апоры цвёрдай,
Калі ўжо нават дыпламаты
Хапаюцца за шнур бікфордаў!

Што лепей — журавель за хмарай
Ці кволая ў руках — сініца?
У космасе блакітны шарык
Трапечацца на тонкай нітцы.

*1978*

# ЗАГАДКА МУДРАСЦІ

Убывае нашага заводу,
Верх бяруць імклівыя гады.
Адыходзіць племя безбародых,
Што зжыло свой век без барады.

Кажуць, барада — адзнака мудрых.
Мы, на жаль, нямудрымі былі.
Пад адзіны грэбень стрыглі кудры
І шчаціну ўпартую скраблі.

Сцяўшы зубы, ледзьве даскрыпелі,
Лічаныя сведкі тых часоў.
І хоць самі нашы карыфеі
Дарасталі толькі да вусоў,

Час, наводзячы парадкі,
Разгадаць, аднак, не змог
Намі пражытае загадкі.
Спадзяемся на сваіх нашчадкаў.
Дарагія нашы, дай вам бог!

*1978*

## ЗІМОВЫЯ ЖУРАЎЛІ

Снягі і снягі, недасяжныя воку,
Стрыміць на марозе старая вярба,
І раптам, як з выраю, голас далёкі —
Запела сярэбраная труба.

Сумёты ў калена, што ўжо не адужаць.
Дапраўды, не воін у полі адзін.
Віруе завея і понізу кружыць,
А гляпуў у неба — і вось ён, мой клін,

Крыламі вяслуе над галавою,
Плыве, не кранаючыся зямлі.
О, як я вам рады такою парою,
Нечспадзяваныя жураўлі!

Зімовае сонца ў дзіцячай далоньцы
Гатова схавацца, а вы і ў бядзе
Грудзьмі прабіваеце шлях свой бясконцы
З даверам, з надзеяй да нас, да людзей.

А людзі... Я слова не выкіну з песні —
Сам крыўджу любімых, нялюбых цярплю.
Як часта, папэўна, бывае балесна
І цяжка ў палёце майму жураўлю.

Лягчэй на зямлі, хоць няшчадна і груба
Сячэ ў вочы сівер, з ног валіць мяцель,
Здарожыўся, змогся, а верыш — затрубіць,
Затрубіць над галавой журавель!

*1978*

# РАЗМОВА З КАСМІЧНЫМ ГОСЦЕМ

Таямнічая асоба,
Грозны вораг мой ці друг,
Мой двайнік ці мудры робат,
Ты — матэрыя ці дух?

Хоць адзін на пробу зараз
Дай мне спадчыны твой ген.
Хто ты: з колбы новы Фауст,
З даўняй бочкі — Дыяген,

А то — помснік за Ікара,
Што па сонцы спапялеў,
За яго прыйшоўшы з карай,
Каб на мне спагнаць свой гнеў?

Свет трымае ў страху атам,
Грозіць выбухам нейтрон.
Быў руплівым я аратым,
Ведаў ласку баразён,

Не на ўцеху фарысеям
Зерне кідаў у раллю.
Для якога ж перасеву
Ты абраў маю зямлю?

Рыцар у крылатых латах,
Занябесны пасланец,
Дзе дабра твайго пачатак
І дзе зла твайго канец,

Дзе пачатак той дарогі,
След маіх бадзяжных ног,
Калі сам зусім убогі,
Вымавіў я слова: бог,

Потым, выляпіўшы з гліны,
Біў яму паклоны лбом,
Стаўшы ад тае хвіліны
Таямнічасці рабом.

Выразаў, вычэсваў з дрэва,
З каменю упарта сек,
Хоць крычаў, бывала, ў гневе:
— Ідал ты, не чалавек!

Але ў самым ідэале,
Што сабе ні гавары,
Ён мне бачыўся ў метале
Лепшым другам з тої пары.

Вось ён, мой жалезны ідал,
Запаветны ідэал!
Ў акіян сусветны выйду,
Вазьму новы перавал.

Дапаможа ён прабіцца
Навылёт зямлі, наскрозь...
Адгукніся, тайны рыцар,
Страшны і жаданы госць!

Я цябе па ўсім сусвеце
У сузор'ях лаўлю.
У якой, скажы, ракеце
Спусцішся ты на зямлю?

Мабыць, ты адзін па мерцы,
Па размаху роўны мне,
Аж знянацку ты — ў талерцы,
Як у казцы, як у сне!

Не зусім надзейны сродак
Для касмічных, зорных трас,
Але ж, кажуць, так твой продак
Прылятаў калісь да нас,

Нават не ў талерцы — ў сподку!
Ёсць і сведкі тых часоў,
Хто з тваім таемным продкам
Абмяняўся парай слоў.

Хтосьці моршчыўся скептычна,
Хтосьці госцю нагрубіў.
На сеансе спірытычным
Я, на жаль, тады не быў.

Калі ж ты, мой першы стрэчны,
Не зламыснік, не хітрэц,
На далёкай сцежцы млечнай
Сам гатоў цябе сустрэць.

Толькі загадзя засведчу:
Строгі я завёў улік —
З хіжым намыслам разведчык
Будзе першы мой язык!

Там, дзе завязь таямніцы —
Галавой гатоў у вір,
Хоць да Зеўса ў калясніцу,
Хоць на Валтасараў пір.

І няхай сабе ўжо зараз
Вораг на маёй сцяне
Піша: мене, тэкел, фарэс [1]...—
Страхі ўсе не для мяне!

Кожны доказ у зародку
Мне заўжды загадкай быў.
Ні адной яшчэ на спodку
Я адгадкі не здабыў.

Мне ніхто яшчэ ў талерцы
Лёгкіх ісцін не паднёс.
Толькі розуму і сэрцу
Давяраю я свой лёс.

І пакуль сусвет спрадвечны —
Вечны я спаборнік твой
У бясконцай нашай спрэчцы
Паміж небам і зямлёй.

*1979*

---

[1] Падлічана, узважана, падзелена... Вогненныя магічныя словы пагрозы цару Валтасару *(бібл.)*.



# ХЛЕБ

## МТЗ

Хоць не кожнаму вядома і мінчаніну,
Што такое МТЗ —
Не прызвычаены
Яшчэ слых,
А слову дадзеп ход:
Мінскі
Трактарны
Завод.

І хоць ранкам не гучыць сірэна —
Цішыні ўжо не ўпільнуе бор.
У гушчар ударыла
Маланка
Аўтагенная —
Зіхаціць заводскі двор.

Навакол пляцоўкі будаўнічай
Сосны, поле,
А праз год
Тут я ўбачыў горада аблічча,
А яшчэ праз год
З варот

Выйдзе трактар
І дымка істужку
Панясе наш пасланец
Па Арлоўскай,
Курскай
І Калужскай,
Па усёй зямлі —
З канца ў канец.
Будзе радасна
І ад таго яшчэ мне,
Што праславілі
Сваю мы старану:
Мінскім трактарам
Зямляк мой Шчарбачэня
Слуцкую ўздымае цаліну.

На работу нашу кожны гляне:
— Трактарысты вашыя, касцы, жанцы
І будаўнікі не падкачалі,—
Што ж, мінчане
Працаваць умеюць,
Малайцы!

*1946*

## ПАРУС

З маленства,
Яшчэ з піянерскай пары,
Разведчыкі шчасця,
Па сэрцу — сябры,
Ў жыцці мы наставілі першую хатку —
Паходную
Нашу
Палатку.

Як белы той парус,
Напяты вятрамі,
Высока ўзмахнула
Хаціна крыламі
І з горада ў горад,
З сяла да сяла
Па роднай зямлі
Паплыла.

З тых дзён
Не адна адшумела вясна,
А песня далёка
Па свеце чутна:
«Узвейцеся кастрамі, сінія ночы...»
Бялее наш парус...
А дзеці рабочых
Самі дзяцей ужо маюць дарослых
І ўнукаў гадуюць...

А вёсны,
А вёсны
Палаюць да неба ўсё тымі ж кастрамі,
Пад тымі ж нястомнымі парусамі
Плыве
Палатняная хатка,
Паходная
Наша
Палатка!

З тых дзён
Між навалаў,

Падняты высока,
Бялее наш парус
Не адзінока —
Ўся маладосць
Паднялася,
Як хваля,
Ад Беларусі
Да Забайкалля.

Наперакор снегавым віхурам
Горад паставіла над Амурам,
Па рыштаваннях
Магнітагорска
Цэглу насіла,
Праз камень жорсткі
Шлях пракладала
Свой векапомны
Мартэнамі,
Шахтамі,
Полымем домнаў.

Яшчэ не было на зямлі гарадоў,
Цяпер і абжытых
                і звычных,
А мы са сваіх палатняных шатроў
Ўжо іх разглядалі абліччы.

Ля печкі жалезнай,
Вясёлым цяплом
З'яднаныя ў гурт свой сяброўскі,
Тады яшчэ ўбачылі велічны дом
На Ленінскіх Горах
Маскоўскіх.
А па салдацкім шляху на Берлін,
Не зняўшы шынельнае скаткі,
Мы ставілі ўжо сярод мінскіх руін
Рабочыя
Нашы палаткі...

Мінаюць гады,
Не мінаецца мара,
Шчасліваю думкай жыве.
А наш неспакойны,

Крылаты
Наш парус
Нястомна,
Упарта
Плыве...

Далей у дарогу!
Далёкі Алтай
На новыя землі нас кліча.
За нашай палаткай
Шуміць ураджай
І ў парус б'е хваляй
Пшанічнай.

І хоць пасівелі даўно нашы скроні,
А мы ўсё ў дарозе,
Ў дарозе і сёння,
І скрозь пазнаём яго ўсюды
І зараз,
Сваёй маладосці
Вандруючы парус,
Як цёплую ласку
Знаёмага дома,
Як заклік,
Наказ
І пуцёўку райкома.

Ляці ж,
Неспакойны,
Мяцежны,
Між хваль,
Не бойся ліхое напасці,—
Мы знаем,
Ў якую імкнешся ты даль,
Якога шукаеш ты шчасця!

*1954*

# ЗУБР І ФОРД

Нядаўна на выстаўцы аўтамабільнай
Сустрэліся два ўладары:
Форд — кароль манаполіі фамільнай —
І зубр, што сілы збіраў да пары,

А потым, як волат, прыйшоў і горда
На самазвале магутным стаў,
Каб зверху ўніз на апошняга Форда
Спакойна зірнуць са свайго паста:

— Ну як, паважаны калега, справы?
Не можаш часу забыць, калі
З кішэні маёй маладой дзяржавы
Кіпцямі драў залатыя рублі,

Калі яшчэ дзед твой,
нябожчык «фордзік»,
Чмыхаў па ўсіх каляінах дарог,
З пагарднай ухмылкай на тоўстай мордзе
З натугі хрыпеў, ад знямогі глох?

Нам прадракалі — сыдзе ў крыві ўся
Зямля, што стала на ўласны шлях.
Нямала хто ў злосці і выў, і крывіўся,
Убачыўшы веліч яе і размах.

А што ты прарочыў маёй краіне —
Балоты, каўтун, камарыны звон?
А тое, што я на сваёй машыне
Цяпер падымаю аж сорак тон,—

Ты чуў, спадзяюся, і ведаеш гэта.
Марна хваліцца я не люблю.
Вось бы такую, скажам, карэту
Табе персанальна, як каралю!

За фурмана я гатоў бы згадзіцца,
Хай паглядзела б мая зямля,
Як на народнай слаўнай традыцыі
Я пракаціў бы разок караля.

Чаго ж адступаешся ты асцярожна
І на адказ не знаходзіш слоў,—
Такое турысцкае падарожжа
Хіба не па густу для каралёў?..

Гэтак на выстаўцы аўтамабільнай
І разышліся два ўладары:
Даўні кароль манаполіі фамільнай
І волат, што сілы збіраў да пары,

А потым на радыятары горда
На мінскай магутнай машыне стаў,
Каб зверху ўніз на апошняга Форда
Спакойна глядзець са свайго паста.

*1958*

# ХЛЕБ

Нямала яго праслаўлялі паэты.
З усімі сябрамі я згодзен.
Успомніць хачу толькі дзень неапеты,
Дзень яго слаўных народзін.

Калі кажухамі старымі накрыты,
Спачатку лагодны і млявы,
Ён раптам стагнаць пачынае сярдзіта,
Нібыта мядзведзь у аблаве.

Тады раскрываюць яго асцярожна
І рукі закасвае маці,
І вось у вясёлае падарожжа
Едзе наш хлеб на лапаце.

Спадыспаду высланы лістам дубовым,
Духмяным пасыпаны кменам,
Вяртаўся ён з печы,
як сонца, ружовы
І доўга свяціў на стале нам.

Але і нас чорныя дні не мінулі.
Раз'ятраны ўласным бяссіллем,
Чужынец апошнюю драў з нас кашулю,
Зямля парасла чарнабыллем.

Кашчавай бясхлебіцы хцівыя пальцы
Ужо каля самага горла.
Млыны апусцелі,
у печах не паліцца —
І хата за хатаю мёрла.

Дзяжа так усохла і зачарсцвела,
Што хлебная завязь звялася,
Калі б рашчыніць гаспадыня сумела,
Дык рошчына б не прынялася.

І раптам па хатах пайшла пагалоска —
Збірацца на сход ёсць патрэба:

З усіх каміноў над суседняю вёскай
Дымок падымаецца ў неба.

Нібыта з вайны пасланец там з'явіўся,
Мяшэчак аддаў гаспадыні
І гэтак сказаў:
«Хлеб з дарогі ваш збіўся,
Ён хутка вярнуцца павінен.

Дало мне начальства запасу на месяц —
Дзяліце на роўныя часці,
І нанач жанкі няхай густа замесяць
На наша салдацкае шчасце.

Калі на кулітку сабраць хто не зможа,
Я мушу вам гэтак параіць:
Адразу ж за мною вы ў падарожжа
І тоў выпраўляйце акраец.

Як дойдзе да нас,
да пярэдняга краю,
Ад кожнае вёскі даніна —
Тады і закончыцца скруха людская,
Зможа чужынца краіна...»

Гэта не выдумка,
гэта не казка —
Паверыла кожная хата:
Споўніла слова ў слова наказ той,
Не падманула салдата.

Пайшоў у вялікае падарожжа
Хлеб да пярэдняга краю,
Адтуль —
да Палесся і да Заволжа,
Да стромых вышыняў Алтаю.

Спадыспаду высланы лістам дубовым,
Духмяным насыпаным кменам,
Ён коціцца з печы,
як сонца,
ружовы
І свеціць ізноў на стале нам.

Па праву яго праслаўляюць паэты.
З усімі сябрамі я згодзен.
Успомніць хачу толькі дзень неапеты,
Дзень яго слаўных народзін.

*1958*

# ДЭСАНТНІКІ

Яшчэ невядома, вясною ці ўвосень,
Праз год, а можа, праз пяць
Галоўны штаб міжпланетных зносін
Будзе ў палёт карабель выпраўляць,

А ўжо заявы шлюць камсамольцы,
Што прагнуць пабачыць сусвет,
Крылатыя рамантыкі дабравольцы,
Разведчыкі першых планет.

Даўно іх песні гучаць на Юпітэры,
Лунае на Месяцы сцяг,
Яны па сустрэчных сузор'ях, як літарах,
Увесь прачыталі ўжо Млечны Шлях.

Даўно спадарожнікаў нашых арбіты
На памяць да дробязяў знаюць яны,
Нібыта стэп казахстанскі абжыты,
Нібыта барозны тае цаліны,

Што будзе на Марсе ўзарана, засеяна
Зусім гарачай яшчэ, як чарэн,
І нашым смехам вясёлым заселена...

Трывогу, трывогу б'е бізнесмен,
Усюды на біржах падаюць акцыі,
І хіжы, учэпісты камерсант
У космас сабраўся перасяляцца,
Пакуль не з'явіўся савецкі дэсант

І не рассеўся наўкола Сатурна,
На яго туманным кальцы.
Рыдаюць газеты маршам хаўтурным,
Што хутка ўжо свету канцы.

І над знямелым, спалоханым Захадам,
Над яго галавой сівой
Сучасны дзікун размахвае
Атамнаю булавой:

«Купляйце хутчэй на Нептуне плантацыі,
Венеру ў арэнду бярыце,
Не паддавайцеся агітацыі
Аб мірным сужыцці,
Бо ўжо ва ўсім узбраенні дэсантнікі
Сусвет штурмаваць гатовы!..»

Так разумеюць рамантыку
Кручаныя галовы.

Не ўпершыню падымаюць сковыт,
Гатовыя сонца засціць,
Ворагі нашае праўды жыццёвай,
Ворагі нашага шчасця.

Смялей жа у новыя далі, разведчыкі!
Кідайце дэсанты заўсёды
Туды, дзе будучыня высвечвае
Праз цяжкасці і перашкоды.

Мы не чакаем сцежачкі гладкай,
Без каляін, без ухабаў,
Але, дзе ставім сваю палатку,
Знаем, што быць ёй штабам,

Быць ёй плацдармам для новых узлётаў
У зорныя высі сусвету
Бясстрашных дэсантнікаў, мужных пілотаў,
Рамантыкаў і паэтаў.

*1958*

# ШАРАЯ ГАДЗІНА

Пеўневым барвовым грабянцом
Запалаў лясок на даляглядзе.
Развітальным, сумным пасланцом
Сонечны прамень упаў у садзе

І на шыбе так зазіхацеў,
Што міжволі жмурыліся вочы.
Летні дзень упарта не хацеў
Саступаць рубеж раптоўнай ночы,

За зямлю трымаўся з усіх сіл,
Ні вяршка не аддаваў без бою,
І сыходзіў вузкі небасхіл
Чырванню гарачаю, густою.

Нездарма, напэўна ж, нездарма
Даўняя прыкмета ёсць такая:
Недзе там, на захадзе, вайна,
Калі гэтак полымя шугае.

І я доўга з-над рукі гляджу:
Не, мая радзіма не ў трывозе.
Сяду і хвіліну пасяджу
На знаёмым бацькавым парозе.

Цьмее край зямлі і ледзь трымціць
Тонкаю, агністаю палоскай,
І, наструненая ўся, звініць
Вечаровым водгаласам вёска.

Вось апошні валасок пагас,
Прыцемак плыве ўжо над нізінай.
Гэты час на Случчыне у нас
Называюць шараю гадзінай.

У цішы вячэрняе пары
Добра пра наступны дзень памарыць...
На начную змену трактары
Выйшлі ў поле,
запаліўшы фары.

Значыць, сонечны прамень не згас,
Ён на варце нашай мірнай працы.
Выверыўшы дум сваіх запас,
Трэба мне ізноў за песню брацца.

Хай паверкай перад новым днём
Будзе гэты час мой вечаровы.
Нездарма ж такім агнём
Небасхіл палаў барвовы.

*1958*

# ТВОЙ ЖНІВЕНЬ

*Янку Брылю*

Араты, сейбіт і салдат,
У ясны дзень і ў непагоду
Па жмені сонечных зярнят
Збіраў ты дбайна год ад году.

Дакладна знаючы цану,
Адзіным, плённым, самым верным,
Ты слоў мякіну, як ману,
Старанна адлучаў ад зерняў.

Заўсёды быў напагатоў
Уберагчы свой колас кожны.
Магутных шэсцьдзесят снапоў,
Як волаты, стаяць на пожні.

Ды хлебу новаму жадзён,
Ты далей цаліною рушыш
І сонцам сееш свой загон,
А промнямі — людскія душы.

*1977*

# ГОД КАНЯ

Павялося так здавён,
Што іменамі завём:
То Дракон, то Скарпіён —
Паслужы, браток, канём.

Нібы ліст перад травой,
Стань, дружок, перада мной.
Мой таварыш вараны,
Казкаю надораны.

Ты палёгкі не прасіў
На сяўбе і на касьбе.
Сёння аж у трыста сіл
Капытом нашчадак б'е.

Не стае адной жывой
Добрае твае душы.
Но, мой косю, родны мой,
Баразну надварушы.

Ты якраз у самы раз,
Калі мой стаміўся плуг
І задзірванеў папас,
Забуяў лазою луг

І дзядоўнікам зарос
Недагледжаны надзел.
Ледзь паскрыпвае ўжо воз
Планаў, замыслаў, надзей.

Вобмаль дзённага святла
І спакою на начах
Пад сузор'ямі Арла,
Пад крыламі Крумкача,

Хоць на варце Гончы Пёс,
Нават цэлая гайня...
Дзякую, мой добры лёс,
Што падараваў каня.

*1978*

# ПАСЛЯ РАБОТЫ

Шчаслівы, хто ўмее дзівіцца
Заўсёды — і ў святы, і ў будні:
Улетку штовечар садзіцца
Сонца ля нашае студні.

Хочаш пабачыць зблізку —
Прыжмур на хвіліну вочы:
Ляцяць на ўсю вуліцу пырскі,
Ходарам ходзяць ночвы.

Няма тут загадкі таемнай.
Папрацаваўшы ў ахвоту,
І сонцу таксама прыемна
Памыцца пасля работы.

*1978*



# ПЕСНЯ

## ІВАНКА

Баю, бай, Іванка,
Прыйшла калыханка.
Павярніся на бачок
І засні, мой хлапчучок.

— Мама, мне ўжо два гады —
Пайду ў лес па ягады,

Буду рваць ігрушы
На калакалушы,
На ляшчыне — шчаўе,
На шыпшыне — траўе,
На алешыне — чарэшні,
На крушыне — песні,
На явары — звон, звон,
На ясені — сон, сон...

А дзе калыханка?
— Я з табой, Іванка.

*1967*

# БАРВІНАК

Барвіночку, барвіночак,
Мой сярэбраны званочак,
Скрозь і ўсюды ты са мною
І вясною, і зімою.

Барвіночку, любы цвеце
Вечна юнай Украіны,
Праз усё жыццё мне свеціш
Самым чыстым успамінам.

Я шчаслівы, што адмалку
Песняй ты запаў у сэрца
Пра Наталку, пра Палтаўку,
Пра азерца, пра вядзерца

І пра тое, як Васілю
За ракою сена косіць.
Добры вецер з тае хвілі
Голас мне яго даносіць.

І як рады бачыць вочы
Вас, завітых у вяночку,
Украінскі барвіночак,
Беларускі васілёчку.

Дзякуй вам, лугі, дубровы,
Рэкі звонкага Палесся,
Што зраднілі нашы мовы,
Што з'ядналі нашы песні,

І табе, мой барвіночак,
Мой сярэбраны званочак,
Што заўсёды ты са мною
І вясною, і зімою.

*1968*

# ДОБРЫ ДЗЕНЬ

Я люблю свайго дзеда,
Хай сабе ён стары.
З ім куды ні паеду,
Скрозь і ўсюды — сябры.

Запрасілі ў Расію —
Еду з дзедам удвух.
— Здравствуй, Вася-Василий!
Добрый день, старый друг!

Нібы маці да сына,
Мне насустрач ідзе
Дарагая Ўкраіна:
— Добридень!
— Добры дзень!

— Добры дзень, малдаване!
А ў адказ мне: — Нарок!
Сустракае вітаннем
Кожны братні парог.

За руку вазьму дзеда,
Ўсю зямлю пакажу.
— Лаба дзена! — суседу
Па-літоўску скажу.

Мы на вечныя векі,
Як з душою душа.
І гаворыць мне: — Свейкі! —
Кожны дом латыша.

Сінь каўказскага неба
Я бяру на ўспамін
І наказ: — Гамарджвэба! —
І сардэчнасць грузін.

Цераз горы і рэкі,
Як найлепшым сябрам,
Я таджыкам, узбекам
Пасылаю: — Салям!

Любы, родны мой дзеду,
Як жа добра ісці
Па сяброўскаму следу,
Што праклаў ты ў жыцці.

Цераз пушчы, даліны
Ажно рэха гудзе.
Гэта я ўсёй краіне
Гавару:
— Добры дзень!

*1969*

# ОРДЭН ДРУЖБЫ НАРОДАЎ

Не арламі драпежнымі
І не хіжымі львамі
Векапомны свой снежань
Увянчалі мы з вамі.

Рукі ў поціску братнім
Над зямлёю злучыла
Пад штандарам крылатым
Дарагая Айчына.

Серп у еднасці з Молатам
Як ударнікі вахты
Ад якуцкага золата
Да палескае нафты.

Ад вышыняў касмічных
Да глыбінь акіянаў —
Пазнаём іх аблічча
Мы ва ўсіх сваіх планах,

І ў задумах, і ў мэце,
Ў запаветным жаданні,
Каб лунаў па планеце
Сцяг людскога яднання,

Мацавалася брацтва
Нашай вернасці мужнай —
Ордэн рыцараў працы,
Ордэн рыцараў дружбы!

*1972*

# БЕЛАРУСКАЯ КАЛЫХАНКА

*У кожнага народа яна — запаветны дар. Знаў бы я мовы ўсіх народаў, я ўзяў бы ў кожнага па адным лістку, па адной калыханцы — якая б гэта была песня песняў, кніга вечнага Быцця!*

*Хто спявае маю калыханку? Галасы людзей — тых, якія адышлі ў нябыт, пакінуўшы свой след на зямлі, і тых, што жывуць вечна.*

*Першая сярод іх — Маці. Самыя велічныя манументы ставяць ёй. А калі не ставяць, яна сама прыходзіць да сваіх дзяцей, на месцы людскіх трагедый, на папялішчы вёсак, на руіны гарадоў.*

*Яна прыходзіць заўсёды ў самую цяжкую хвіліну, калі з нашай душы вырываецца крык: мама!*

*На адным лістку — жыццё чалавека, у адной калыханцы — жыццё народа. У адным атаме сэрца — цэлыя эпохі.*

*Я быў бы ўдзячны лёсу, каб на магутным дрэве жыцця затрапятаў і мой лісток — калыханка маёй маці.*

Паэт

На карце вялікага свету
Яна — як зялёны лісток,
Сасмаглая песня лета,
Жывое вады глыток,

Адвечная калыханка,
Душы запаветны куток.
Трапеча гарачым ранкам
На дрэве нястомны лісток,

А ў навальніцу б'ецца,
Нябачны паміж лісця,
Як роднае матчына сэрца,
Што мне даражэй жыцця.

Хор

Навошта лісток
Праслаўляеш, паэт?
Шырэй, браток,
Паглядзі на свет.

Як вокам абняць, без краю,
Гудзе наш магутны гаю.
А што адзінокае дрэўца?
Нікому нячутнае сэрца.

А разам усе мы — салдаты,
Строй урачыстай кантаты,
Якая гучыць і гучала
Без жалю і без адчаю.

Пытаешся, хто ў нас — салісты?
Дуб прыдарожны вячысты,
Што вузлаватым карэннем
Урос у глыбінь пакаленняў,
Вяршыняю хмары калыша,
Паэму спрадвечную піша,
Шпурляе на жвір, на камень
Лістамі,
Лістамі,
Лістамі!

Колькі
Лістоў
Абляцела
З галля,
Колькі
Пластоў
Перацерла
Ралля...

## Маці

Зялёны лісточак,
Жаданы сыночак,
Чаму адлятаеш,
Мяне пакідаеш?

Ці ж я не любіла,
Ці ж я не туліла,
Пад сэрцам, пад сонцам
Цябе не насіла?
Ніхто не палічыць
Слязін на абліччы.

На кожнай суздіне
Гарыць па слязіне.
Без часу бялее,
Без часу сівее
За воласам волас...

Хор

Чыя гэта голас?
Хто абазваўся ў пакінутай хаце?

Маці

Маці.
З тых дзён, як жыву, як хаджу я па свеце,
Я помню вас кожнага, дзеці,—
Паверце.

Хор

Адкуль жа ты з намі гаворыш?

Маці

З бяссмерця.
Ад нараджэння мне доля судзіла,
Каб я па вашым следзе хадзіла,
Ваша сумленне заўсёды будзіла,
У шчасці спявала, ў бядзе галасіла,
Звала з чужых і далёкіх дарог
У родную хату, на матчын парог.

Сейбіт

Маці, якія я ведаў дарогі!
Я лес карчаваў, я разорваў аблогі.
Быў я не зломак,
Не пустадомак,
Надзел свой вылузваў з адвечных пялёнак.
Цэлыя горы — камень на камень —
Пераварочаў сваімі рукамі.
Ляжаць і цяпер, як праклёны, яны:
Куды ні зірні — валуны, валуны,
Ад палыновай мяжы да парога.
Я нават маліўся каменнаму богу,
Як жменю за жменяю кідаў зярняты.
Ды што ўспамінаць, калі жала сама ты.
Нялёгкая ў сейбіта летам капа,

Далёка-далёка сноп ад снапа.
Пакуль пераловіш па каліву жніва...
А мліва? Ты ж ведаеш нашае мліва:
Зноў камень на камень —
труцца жаронцы,
Трэцца жыццё,
Труцца
Сэрца
І сонца.
Сцёрся —
Абулі ў ліповыя лапці,
Світкай накрылі —
Лата на лаце.
Людзі даўно ўжо забылі мой крыж.
А ты?

М а ц і

Не забыла.

С е й б і т

Чаго ж ты маўчыш?
Стаіш, углядаешся з-пад рукі...

М а ц і

Зірні і ты, сыне.

С е й б і т

Куды?

М а ц і

У вякі.
Чуеш, і ён на мой голас азваўся,
І хоць з далёкіх дарог, а сыскаўся.

Г о л а с

Добры дзень, маці!

П а э т

Хто гэта ў маццi?

С е й б і т

З кнігай пад пахай?
Важная птаха...

Маці

Што, надакучыла, сынку, чужына?

Скарына

Мяне нездарма ты назвала Скарына,
Маці, я — нашага хлеба скарына.
Шчыра скажу:
У людзей
Ён бялей,
Далікатней,
Але не смачней.
Болей на свеце ёсць такі хіба,
Такія духмяныя чорныя скібы
На лісці дубовым?
На лісці кляновым?
Я цалаваць твае рукі гатовы.
На гэтых далонях,
Спавітых
Вузламі,
Кожнае зерне
Паліта
Слязамі.

Сейбіт

Нам хлеба ніколі свайго не ставала.

Маці

Я кожны акраёчык яго шанавала.

Скарына

Кожную з долу крыху надымала,
Перахрысціўшыся, цалавала.

Сейбіт

То як папытацца ў цябе палацвей бы —
Хто ты, вандроўнік?

Скарына

І я, браце, сейбіт.
Многія я абышоў гарады.

Маці

Надоўга ж дадому, сынок?

С к а р ы н а

Назаўжды.
Як пчолы трымаюцца вулляў раямі,
Гэтак і людзі. Якімі б шляхамі
Ні спасцігалі вышынь невядомых —
Не выракаюцца сцежак дадому.
У Кракаве, Падуі, Празе, Мілане.
Ніхто мяне словам благім не памяне,
Я сеяў у сэрцах людзей паспалітых,
У душах зняверанных і знябытых.
Ды птушкі спяшаюцца
Ў родныя гнёзды,
А зерні вяртаюцца
Зноў у барозны.

Вось маё поле,
А гэта зярняты.

С е й б і т

А ураджай жа ці будзе багаты?

С к а р ы н а

Хочацца верыць, узыдзе пасенне!
Не знаю — калі, у якім пакаленні.

Х о р

Як вокам абняць, без краю
Шуміць акіян ураджаю.
І толькі самотны колас —
Нікому нячутны голас.
Знямажаны навальніцай,
Дадолу ён падае ніцма.

А разам, а разам усе мы —
Строі урачыстай паэмы,
Якая гучыць і гучала
Без жалю і без адчаю.

М а ц і
С е й б і т
С к а р ы н а

А можа, і наша ніва
Да сонца праб'ецца шчаслівa,

Падымецца дужы колас,
І людзі пачуюць наш голас.

Маці

У зярнятку каласок,
У калысцы спіць сынок.

Буду я яму спяваць,
А вятрыска — калыхаць.

Будзе мой сынок расці
Для вялікай радасці.

Перад ім увесь прастор,
Ад зямлі да самых зор.
А-а, а-а,
Лю-лі...

Хор

Лісты за лістамі, пласты за пластамі,
Пяскі за пяскамі, за каменем камень.

За крыжам крыжы,
За курганам курган.
Годзе кружыць
Над зямлёю,
Груган!

Паэт

Вырас сынок, палюбіў сваю песню,
Да сонца падняўся жаўранкам веснім
І раптам — дадолу,
У жвір,
У пясок.

Маці

Сын мой, сыночак,
Дачасны лісток!

Хор

Сын
Не адзін
Яшчэ сыдзе ў нябыт.
Як зьнічка, мільгнецца
І будзе забыт.

М а ц і

Кім, вы скажыце?

Х о р

Часам, зямлёй.

М а ц і

Але не мною!
Толькі не мной!

Г а л а с ы

Маці!
Матуля!

Х о р

Зноў кружыць крумкач.

П р ы с т а ў

Даўно ты не плакала, баба,—
Паплач.

М а ц і

Чаго табе трэба?

П р ы с т а ў

Сына твайго.

М а ц і

Толькі здала ў пастухі я яго.

П р ы с т а ў

А трэба — у рэкруты.

М а ц і

Пане!

П р ы с т а ў

Маўчок!
Як хлопец завецца?

Маці

Багрым,
Паўлючок.

Прыстаў

А, што складае сцішкі —
Грамацей?

Маці

Значыць, спужаўся маіх ты дзяцей?
Сына спужаўся?
Не маці, не бацькі...

Прыстаў

Вядзіце сюды яго!
Чуеш, дзесяцкі?

Багрым

Будзь здарова, маці міла!
Каб ты мяне не радзіла,
Калыханак не спявала,
Столькі б гора не зазнала.
Гэтак я расці баяўся,
А ў салдаты ўсё ж папаўся.

*Ой кажане-кажане,*
*Чаму не сеў ты на мяне,*
*Каб я болей не падрос,*
*Як ад бацькавых калёс?*
*Заграй, заграй, хлопча малы,*
*У скрыпачку, у цымбалы,*
А ты, дудар, у дуду,
Што дадому не прыйду.

Маці

Сыночак, сыночак!

Багрым

Не гневайся, маці.
На развітанне дазволь пагуляці.
Не плачце, дзяўчаты,
Тут воля мая —
Ух, я!

Дудар

Ну-тка, дудка мая,
Ух, я!
Весялушка мая,
Ды ух, я!
Весяліла мяне,
Ух, я!
На сваёй старане,
Ды ух, я!

Лірнік

Былі ў бацькі тры сыны,
У белы свет пайшлі яны.
Першы згінуў як герой
За людскі за гонар свой.
Другі выбіўся ў чыны,
Ля турэмнай стаў сцяны.
Трэці... Трэці здраінцам стаў,
Бацьку роднага прадаў.

Дудар

Пад каменем бацька спіць,
І дуда пры ім ляжыць.
Ой, дуда, дуда, дуда,
Праз цябе мая бяда.
Давяла мяне да згубы...

Жабракі

Чуеце? Во! Трубяць трубы.

Маці

Замаўчыце, трубачы,
Не кружыце, крумкачы!
Дайце з сынам развітацца...
Больш ці ўдасца дачакацца...

Катрыншчык

Разлука ты, разлука...
Чужая старана,
І слёзы, і дакука,
І немарач адна.

Не дай бог разлучацца,
На адзіноце жыць —
Ні словам абазвацца,
Ні ў песні патужыць.

Мацi

Выпраўляю маладога,
Ці пабачу хоць сівога?

Багрым

Не рві, маці, сэрца ў скрусе.
Калі выжыву — вярнуся.

Катрыншчык

Разлука ты, разлука...

Багрым

Сціхні, дзеду, не дудукай!

Жабракі

Ад пяволі не ўцячы.
Во! Зноў трубяць трубачы.

Рэкруты

Салдатчына, салдатчына,
Нядоля бабыля.
Што перадам у спадчыну
Табе, мая зямля?
Салдатчына, салдатчына,
Чужы, далёкі край.
Бывай, хаціна матчына,
Часцей успамінай!
Хоць мы навек разлучаны,
А доля ў нас адна.
Рэкрутчына, рэкрутчына,
Праклятая вайна.

Жанчыны

Маці, каханкі, удовы,
Сціхлі нашы дубровы.
Лісток абляцеў вераспёвы —
Хто знае, ці вырасце новы.

Х о р

Колькі
Лістоў
Абляцела
З галля,
Колькі
Пластоў
Перацерла
Ралля.
Не развінецца новы
Дачасны
Лісток
Дубовы.

П а э т

Гляньце, а ён развінуўся.
Толькі паслухайце пільна.
Гучыць над усёй Беларуссю
Голас з мяцежнае Вільні.

М а ц і

Што бачу! Бяда за бядою —
Сын мой
на шыі
з пятлёю!
І ён за сустрэчу са мною
Жыццё аддае маладое.

К а л і н о ў с к і

З-пад шыбеніцы царскай
Звяртаюся да вас:
Няхай жахлівай казкай
Запомніцца наш час.

Не траціце толькі веры,
А сейце, дзецюкі.
Што пачала сякера —
Дакончаць хай лісткі.

Лісткі мужыцкай праўды,
Што пасылаю вам.

Я пакланіцца рады
І хатам і лясам,

Што берaглі ад кулі,
Ад кіпцюроў арла,
Я дзякую зязюлі,
Што шчодраю была,

Што мне лічыла ў гаю
Жыць доўгія вякі.
Я вам іх пакідаю —
Жывіце, дзецюкі.

У роўнасці і згодзе
Свой пракладайце след.
Рві ланцугі, народзе,
Ідзі ў шчаслівы свет!..

## Маці

Сыночак, сыночак,
Няўжо ж было мала
Усіх маіх ночак,
Што недаспала?

Куды ж, маё гора,
Цябе мне занесці?
Пашлю вас на мора,
Жалобныя весці.

Ды мора не хоча
Гора прымаці,
Самое ў пясочак
Стала ўцякаці.

Пашлю сваё гора
У чыстае поле,
Каторую пору
Не ўбачу мо болей.

Ды выйсці за вёску
Яно не паспела —
Засохла палоска,
Удзірванела.

Куды ж мне, сыночак,
Падзець свае слёзы?
Занесла ў гаёчак —
Пасохлі бярозы.

Давай, маё гора,
Я лягу з табою —
Няхай нас засыплюць
Сырою зямлёю.

Каліноўскі

Мама!

Голас

Матуля!

Хор

Нашто гэтак дзерці,
Рваць на кавалкі душу ў паняверцы?
Якім ланцугом да дзяцей ты прыкута?

Маці

Вечнай любоўю і вечнай пакутай,
За кожны лісток, адарваны ад сэрца,
Памерла б сама, каб магла я памерці.

Хор

Столькі
Лістоў
Лягло
У раллю,
Столькі
Пластоў
Абвіло
Зямлю.
Мінаюць гады за гадамі,
А пушча шуміць лістамі.
Дуброва гудзе,
Дуброва пяе.

Паэт

Хто там ідзе?

Маці

Сыночкі мае!
Не марна па шчасце я вас выпраўляла,
Вякамі на скрыжаваннях шукала,
Вякамі чакала,
Вякамі гукала.
Дайшоў,
Не згубіўся
Мой голас.
Дзень добры, Купала!
Добры дзень, Колас!
А прычакаць не ставала ўжо змогі.
Знаю, цяжкія былі ў вас дарогі.

Колас
Купала

Нашы дарогі
Ялі праз астрогі,
А спадзяванні —
Праз катаванні,
Нашыя мары —
Праз чорныя хмары,
Нашыя словы —
Праз цёмныя сховы,
А ўсё ж мы праненслі
Родную песню
І гордае права
На шчасце і славу.

Хор

*Беларусь на куце*
*Ў хаце сваёй села.*
*Чарка мёду ў руцэ,*
*Пазірае смела.*

*Сядзіць важна, сама*
*Сабе гаспадыня,*
*І прыбрана яна —*
*Ніхто не закіне.*

*А з тутэйшых музык*
*Гучная капэля —*

*Хто ў дуду, хто пад смык*
*Граюць ёй вяселле.*

Лявон

Ты паслухай, ты паслухай,
сябрына уся мая,
Ты пацешся, беларуская зямля,
Падзівіцеся, суседка і сусед,—
Пра Лявоніху спявае
Увесь свет.

Лявоніха

Праўду кажа,
Праўду кажа
Мой Лявон —
Дачакалася і я
Шчаслівых дзён.
Выйшла ў людзі,
Выйшла ў людзі —
Шырай круг!
Як прытупну чаравічкамі —
Самой займае дух.

Галасы

Ну, а маці?
Чаму маці не пяе,
Калі дзеці весяляцца
Ўсе яе?
Што з табою, маці?
Родная, прабач.

Маці

Дзеці, дзеці, я на варце.
Чуеце, ізноў крумкач!

Галасы

Мама! Маці!
Крумкач крача!
Мама! Маці,
Дачка плача.

Паланянка

Ці ж на тое мяне гадавалі,
Сіроцінку-націнку,

Каб чужынцы забралі, прадалі
На нявольніцкім рынку?

Ці ж на тое мне сонца свяціла
У маёй Беларусі,
Белы свет каб зрабіўся няміла
У палоне, у скрусе?

Колькі вёрст да жаданага краю —
Столькі гора між намі.
Толькі вочы звяду я — гукае
Мяне маці начамі.

Цяжка з нелюддзю жыці мне, быці
З ненавіснай чужынай.
Занясіце, вятры, занясіце
Мой лісток на радзіму.

Перадайце, дубровы,
Вы дамоў мае словы,
А вы, ніцыя лозы,—
Мае горкія слёзы

Вечаровай зарою,
Лугавою расою,
Што мне, маці, з табою
Не сустрэцца жывою.

### Маці

Ашалелыя крыважэрцы,
Ненаедныя груганы,
Колькі ўжо адарвалі ад сэрца
Вы дзяцей маіх дзеля вайны!

Нават куля зямная прыстала
Валачы свой пакутны цяжар,
А вам мала ўсё, мала, мала —
Патрабуеце новых ахвяр.

Па кругах маіх год, як па дрэву,
Прачытайце трагедыю маю.
Для якога, скажыце, засеву
Вы рыхтуеце нашу зямлю?

Хор

Зямля
Спавіта
Пятлёй
Пакут,
Крывёй
Паліты
Тут
Кожны
Кут.

Але паслухай —
На твой праклён
Азваўся рэхам
Магутны звон.

Маці

Дачушкі мае, сыночкі —
Лісточкі,
Лісточкі,
Лісточкі!

Хор

Колькі
Лістоў
Лягло
У раллю,
Колькі
Пластоў
Абвіло
Зямлю —
Грамат пахвальных
І пахавальных.

Невядомы салдат

А вы ім, матуля, не верце —
Казёнкам у чорным канверце,
Не варушыце пластоў!
Жывых нас успамінайце,
Жывымі дадому чакайце,
Чакайце
Нашых
Лістоў.

В а р т а в ы
В е ч н а г а а г н ю

Маці, мы біліся смела,
Мы не баяліся смерці.
Падняў капітан Гастэла
Над намі паходню сэрца.
Развеяўся морак ночы,
Гарыць неўміручы зніч...

М а ц і

Сыночак,
Дачасны лісточак!

Г а с т э л а

Маці, мы чулі твой кліч.
Дазорныя роднага неба,
Думак тваіх і надзей,
Не аб кавалачку хлеба —
Мы дбалі аб шчасці людзей,
Сябе пры няўмольнай расплаце
Аддаючы да канца...

М а ц і

Сыночак, і я ўжо на варце,
Пільна гляджу з Трасцянца,
З Хатыні,
З вышыняў курганных,
З брэсцкіх маўклівых руін.
Усім воінам і партызанам
Я вечная маці, мой сын.

В а р т а в ы
В е ч н а г а а г н ю

Усе твае дзеці на варце,
Бо ў кожнага ты адна,
Калі на сусветнай карце
Зданню ўстае вайна.

К а л і н о ў с к і

Матуля, калі навісае
Бяда над тваёй галавой,
Мы, мёртвыя, ажываем,
Жывымі ідзём за табой.

Паэт

Мы чуем тваю калыханку,
Дзе б ні ступілі свой крок,
Як б'ецца бесперастанку
Сэрца твайго лісток.

Касманаўт Клімук

З арбіты касмічнай калыскі
Чую,
як ты пяеш.
Такою здаецца блізкай
Зялёная Белавеж,

І Брэст, і мая Камароўка,
І школа, і родны калгас.
І гэтак мне хочацца зноўку
Душой прытуліцца да вас.

Я нават з другое планеты
Пазнаю цябе здаля,
Блакітная зорка сусвету,
Мая дарагая зямля.

Паэт

Як зерні спяшаюцца
Зноў у барозны,
Так людзі вяртаюцца
Ў родныя гнёзды.

Маці

У зярнятку каласок,
У калысцы спіць сынок.

Буду я яму спяваць,
А вятрыска — калыхаць.

За гадком міне гадок,
Пойдзе ад мяне сынок.

Толькі б ён паміж людзей
Не хаваў сваіх вачэй,

Як пачуе матчын спеў,
Пошум лісця родных дрэў.

Мой сынок, не забывай,
Для сваіх дзяцей спявай,

Праз вякі нясі, як я,
Гордае сваё імя

І любі сваю зямлю
Так, як я яе люблю.

А-а, а-а,
Лю-лі,
А-а, а-а,
Лю-лі...

*1968*



# СЛОВА

## ДЗЕСЯЦЬ МІНУТ ПАЭЗІІ

Упарта рыфма лезе
І навінаю радуе:
Дзесяць мінут паэзіі
Штодня па радыё.

Дзесяць мінут —
Строгі статут:
Прывыкай к парадку,
Пачынай зарадку.

У каго ляпота,
У касцях ламота,
Станавіся першы,
Слу-хай вершы.

Гарантыя нязвычная
Усім без выключэння:
Зарадка паэтычная —
Найлепшае лячэнне.

Калі сам не бюракрат,
Ні намеснікі,
Там, як правіла, і штат —
Адны песеннікі.

Тыя дзесяць мінут
Не заўважыш, як мінуць.
Павялічце порцыю —
Вельмі ж праца спорыцца.

Добра хвошча свежы душ,
Востраў рыфмай чэша.
Падпялася якасць душ
І працэнт усмешак.

Вершы сам пісаць гатоў,
Слухаць колькі ўлезе,
Жыць яшчэ сто гадоў
І дружыць з паэзіяй.

*1962*

# СТАРЫЯ РЫФМЫ

Што слоўца, то пятак.
Так год за годзікам.
Так-так, так-так —
Лічылі ходзікі.

Нарэшце песенька
Адпета,
Здаюць на пенсію
Паэта.

Ідзе ўрачыстасці
Віноўнік,
Прыстойны, чысценькі
Чыноўнік.

Усё жыццё сваім начальнікам
Спяваў ён оды велічальныя.
Цяпер прыйшла яго часіна —
Паднеслі папку з лідэрыну

І па заказу торт, як вежу.
Сам чорт яго не ўесць, не ўрэжа,
Бо спечаны ён з рыфмаў бітых,
Тых, што любілі фаварыты.

Жыве паэт, свой торт жуе.
Ён да салодкага прывык.
І толькі моршчыцца, злуе,
Як трапіць рыфма на язык.

*1962*

# СЛОВА

З аднаго зярнятка малога
Вырастае магутны вяз.
Колькі год яму жыць? Вельмі многа.
Сто і дзвесце — залежыць ад нас.

Колькі год на яго верхавіне
У гняздзе клекатаць буслам?
Гэта самі мы ведаць павінны,
Гэта ўсё падуладна нам.

Колькі раз адлятаць ім у вырай
І вяртацца дамоў у свой час?
Ўсё залежыць ад нашае шчырай
Дабраты — і ці ёсць яна ў нас.

Лес, і рэчку, і клёкат бусловы,
Чалавечую ўсмешку ўраз
Можна знішчыць адным толькі словам,
Што бяздумна вырвецца ў нас.

Стогнуць пілы, скрыгочуць бульдозеры —
Наламана нямала дроў.
І чарсцвее душа ад карозіі
Безадказных, бяздумных слоў.

Іх не возьмеш назад, іх не вернеш.
Камяком боль у горле засох.
І ніколі не ўзыдзе зерне,
Што ўпала ў бясплодны пясок.

*1971*

# ПАЭЗІЯ

Хто прагне хіжасці арла,
Хто — ястрабава спрыту,
З усіх набыткаў зберагла
Ты лепшы свой набытак.

Яго адзіны валадар,
Ніколі ў паняверцы
У пераможаных ахвяр
Не вырывала сэрца.

Штурмуючы святла рубеж,
Свайго не шкадавала
І самы запаветны верш
Жывым перадавала.

*1973*

# НІ ДНЯ БЕЗ РАДКА

Вінюся перад табою,
Што стольхіх не дагледзеў —
Не вынес адных з поля бою,
Другіх абмінуў у бядзе.

Не густа яны падняліся —
Усходы маіх радкоў,
За канчатковаю рысаї
Болей галодных гадкоў.

Да дзён далучаю ночы,
Але не даецца ліміт.
Даруй, калі цяжкія вочы
Выкацяцца з арбіт

І слова на самым зрэзе
Не ўлезе ў абойму радка.
Ні ў чым не апраўдвай, паэзія,
Як будзеш судзіць даўжніка.

*1973*

# ПІСЬМЕННІЦКІЯ ЎДОВЫ

Колькі вас? Болей чым удаўцоў,
Чым нашых рэдактараў і выдаўцоў.

Калі без пары аддаём мы канцы,
Вы — нашы рэдактары і выдаўцы,

Даследчыкі нашы і нашы музеі...
Усе запаветныя новыя землі

І астравы, пра якія мы снілі,
Вы ўжо без нас і знайшлі, і адкрылі.

Цяжка было вам з намі ў жыцці,
Намнога цяжэй крыж удовін нясці.

Столькі турбот, а спачыну ні трошкі.
Мрояцца мемарыяльныя дошкі,

Вуліцы, школы, шматтомнікі, помнікі,
І ўсе жыхары на планеце — паломнікі...

Родныя нашы, вы гэтак нам верылі,
Мералі самай вялікаю мераю.

Даруйце, калі хто не выйшаў па мерцы,
Не здолеў з музыкаю памерці,

Так і паехаў, даўжнік няўдзячны,
На калектыўную вечную дачу.

Даруйце нам, верныя добрыя ўдовы,—
Я ўсім пры жыцці пакланіцца гатовы.

*1973*

# МАЛАГАБАРЫТНЫ КЛАСІК

Сябры! Я томаўласнік
Жывы, сапраўдны класік!
Жыву на два тамы,
Нібы на два дамы.

І жыць бы колькі ўлезе,
Як раіць добры розум,
Калі б мая Паэзія
Маю любіла Прозу.

З іх кожная — ў томе,
Як гаспадыня ў доме.
Замучылі гаспадара,
Што не магу падняць пяра.

Сказаўшы па сакрэту,
Яшчэ ў мяне ёсць дама,
Прыхільніца паэта,
Завецца дама — Драма.

І Крытыка, як цёшча,
Глядзіць зацятым зверам.
Нязручная жылплошча —
Двухтомная кватэра.

Цярэбяць дамаседа,
Гудуць суладна ўнукі:
— Расказвай казкі, дзеда,
Табе ж і кнігі ў рукі...

Нямала я нажаў бы
Засеяных старонак,
Не мірачы ўсіх жанраў,
Нібы раўнівых жонак.

Не ведаючы меры,
Яны без дай прычыны
Мне грукаюць у дзверы,
Яшчэ часцей — у спіну.

Цярпі і выслухоўвай,
Чаго не падзялілі.
Трашчаць па шву асновы
Сямейнае ідыліі.

Прасіў у бога ласкі,
А мне ў адказ — усмешка:
— Ты добра баяў казкі,
Спявай цяпер пацешкі.

І так сказаў па часе,
Нібы адрэзаў брытвай:
— Класік-то ты класік,
Ды малагабарытны.

На вялікую кватэру
Не дам табе прапіскі!..
І выкінуў за дзверы.
Я — ў слёзы, ён — ні блізка.

Так без пары, дачасна
Усё мне стала ясна.
Паспець сабраць бы томік
Пакутніку на помнік.

*1973*

# ГАТОЎНАСЦЬ

І славе паэта, і званню
Належную меру знайдзі:
Вышэйшае выпрабаванне —
Гатоўнасць нумар адзін.

На самай апошняй наверцы
Хай будзе дакладны зарок —
Бясстрашны набой твайго сэрца,
Радок, як пад пальцам — курок.

У курсе падзей і на пульсе
Гартуйся і мужнасць гартуй.
Няма ў цябе слова — ратуйся!
Ёсць абавязак — вартуй

Будучыню ў калысцы,
Як дарагое дзіця,
Не дзеля ўласнай карысці —
Для перамогі жыцця.

*1974*

# ПАДРАДЧЫК

Бяру падрады на даклады
І на праекты пастаноў.
Усе, якія ёсць, пасады
У вершах выславіць гатоў.

Складаю прытчы павучальныя,
Пішу сцэнарыі вянчальныя,
Паэмы тронна-велічальныя
І электронна-вылічальныя.

Гатовы славіць юбілеі,
Вяселлі, жаніхоў, нявест
Суцэльнай рыфмаю, з ялеем,
Са знакам якасці і без.

Прасцей мне паранае рэпы
Любы, з любое мовы эпас —
Мне не патрэбен нават слоўнік,
Вы толькі дайце падрадкоўнік!

*1976*

# РАЗБОЙНІК

Дальбог, ні кроплі не схлушу,
Скажу, як на малітве:
Нож за халявай не нашу,
Не давяраю брытве.

І нават доўбняй не глушу,
Не валаку крукамі.
Я здрадніцу сваю душу
Уласнымі рукамі.

Уночы лямпу патушу,
Аловак — пад падушку,
І толькі загудзе ўвушшу,
Я — цап яе за вушка.

— Ага! — ад радасці крычу.—
Папалася, галубка!
Ў казіны рог цябе скручу,
Не вырвешся ўжо — дудкі!

Але яна — хоць бі, хоць рэж,
То лашчыцца, то дрыхне.
Вось так і прысвячай ёй верш
І вер праклятай рыфме!

*1976*

## ДРУГУ-СТЫЛІСТУ

Маеш, браце, рацыю —
Стыль твой адмысловы.
Ўзяў па зуб абзац я:
Цукар — твае словы.

Цукар — твая мова,
Слодыч скрозь адметна.
Сведчу, адным словам —
Пішаш дыябетна.

Вымераны нормы,
Вывераны жэсты:
Стылізацыя формы —
Стэрылізацыя зместу.

*1976*

# ЗМОЎНІЦЫ

Ад правай левую
Адрознiш ледзьве.

— Кляпёмся! —
Выстаўляецца адна.

— Здаёмся! —
Падымаюцца абедзве.

Праклятыя,
Хто вы такія?

Не вінаватыя —
Адна другую мые.

*1978*

# МАЙМУ ЛЮБІМАМУ ІШАКУ

Ішак твой верш — сказаў Маякоўскі.
Чыстая праўда, так.
Хто сцежкаю стромай і коўзкай
Выцягне лепш, чым ішак?

Яго ты у сябра не сцібрыш
І не прывяжаш за кол.
Абрыдлі мне рэбры верлібра,
Санет, як заезджаны вол.

Даруй, мой пакутнік, што мучаю,
Ты ж бачыш, і я, брат, не ўлегцы.
Вядомых вядуць, а вядучыя
Толькі патузваюць лейцы.

Пегас падласы ці лысы —
Адна яму паласа,
Абы пачапілі па пысу
Аброчную торбу аўса.

Зняможашся ты ў запрэжцы —
Дарожных слупоў не лічы.
Сам стану ў аглоблі нарэшце,
Каб цяжкі свой воз валачы.

*1979*



# МАСКІ

## ГОСЦЬ
## У ПАДПЕЧКУ

Жыў-быў на свеце певень-галагут,
Галагут-Галагуцкі,
У бабкі Хаўронні,
У вёсцы Кут,
Ні то за Грэскам,
Ні то за Слуцкам.
Так і жылі ўдваіх душой:
Бабцы — скарынка, пеўніку — крошкі.

Так і вялося ў хацінцы той
На курыных ножках.
Ды ў ноч навагоднюю — шась к бабцы госць.
Рада не рада — просіць садзіцца.
— Як жа завуць цябе, ягамосць?
— Фрыцам.
— Не чула такога. А божа ж мой,—
Дзівіцца бабка,— такія напасці.
Хто заблудзіў да мяне, старой:
Насланне?
Няшчасце?
А госць па покуць, пад абразы
Сеў і шапку ўсё цягне па вушы.
Зірнула Хаўроння — аж два гузы
Госцеву шапку так і варушаць.
«Рогі! — мільгнулася ў галаве.—
Бач, як стуліўся, нячысцік абдзёрты,
Думае, мусіць, што я за свой век
Ніколі не бачыла чорта».
А нячысцік скрывіў ухмылкаю рот.
І шнырыць, і шнырыць вачыма па хаце:
— Я вітай вас новы шчаслівы год,
А ві мне гарэльк і сала дайце.
Пакланілася бабка:
— Паночку Чорт,
Чым багаты, тым рады,
Садзіся, любы.
Чым фашысту паганаму ў тоўсты жывот,
Лепей лысаму чорту ў зубы.
— Што сказаль? — усхапіўся няпрошаны госць.—
Не пазналь, баба, Швэндаля Фрыца?
— Ды хіба ж я пра вас, пра чарцей, ягамосць,
Я пра гэтых... каб ім падавіцца.
Абабралі, аб'елі, самі бачыце от...
Я забыла, паночку, як пахне сала.
Хіба ж так сустракалі б мы Новы год,
Каб праклятых халера забрала?
На стале тут было б парасят, і курэй,
І грыбоў, што улетку сама насушыла...
Што казаць, каб прымела — рукой бы сваёй
Таго гіцаля Гітлера я задушыла.
— Фюрэр хайль! — аж зароў пабялелы Фрыц,
І канцы б тут насталі Хаўронніну веку.

Ды не вытрымаў певень і як закрычыць:
— Ку-ка-рэ-ку!
— На пагібель маю абвясціў Новы год,
От дурны, от дурны галагут.
Толькі чуе бабулька — шэпча чорт:
— О, майн гот!
Вас іст дас?
А, пятух! —
Гут! —
І як кінецца-рынецца снопам наўпрост,
І прапаў.
Стала бабка, ў здзіўленні пытае:
— Чорт, а чорт, а дзе ж твой хвост
І ногі з капытамі?
Ды цяпер і не ўбачыш —
пайдзі, дагані.
Сеў на вожаг і недзе вандруе у хмарах...
Раптам голас знаёмы:
— Гэй, хутчэй адчыні,
Ты пра што там так соладка марыш?
Адчыняе Хаўроння настылыя дзверы,
І вачам сваім бабка не верыць.
На парозе не чорт,
а з жардзінаю дзед,
Дзед Мароз — даўні бабін сусед.
— Дзякуй, баба, табе, твайму пеўню,
А то я заблудзіў бы, напэўна.
Хоць памры, не шанцуе мне сёння.
Дай ты рады якое, Хаўроння.
Так жа добра, здаецца,
я трэснуў дубінай
Два разы па ілбе таму сучаму сыну...
— Чорту?
— Што ты, бабка, не чорту, а фрыцу,
Каб яму скрозь зямлю праваліцца.
— А ён быў у мяне кагадзе.
— Фрыц?
— Ён-то Хрыцам назваўся...
— А дзе ж ён, дзе?
Так няскора да сэнсу дайшлі б удваіх
Дзед і баба, ды певень зноў выручыў іх.
Як узніме ён крык —
Усхапіўся стары:

— Дай хутчэй, баба, свечку,
Гэта ж госць у падпечку.
Эх, Хаўроння!
Так на старасці год памыліцца —
Не пазнала паршывага фрыца.

*1942*

# ГЕНЕРАЛ ВЕРАБЕЙ

Гэй, дарогу, гэй, шырэй,
Лес густы, высокі —
На машыне верабей
Едзе да сарокі.

У пагонах, у шнурах,
У шпорах са звонам.
Белабока толькі: — Ах! —
Сказала з паклонам.

— Калі ласка, ваша чэсць,
Я даўно чакала.
Запрашаю за стол сесць
Госця-генерала.

Налучыўся тут мядзведзь
На такое дзіва:
— Цьфу, няма на што глядзець! —
І ўсміхнуўся крыва.

Усхапіўся верабей,
Адважны задзіра,
Як падыме крык: — Не смей
Зневажаць мундзіра!

Загрудкі мядзведзя — цап:
— Ведай, з кім заняўся!
Ледзьве з вераб'ёвых лап
Мішка ўратаваўся.

*1962*

# ППШ

Я спытаўся ў малыша:
— Што такое — ППШ?

Доўга думаў малыш:
— Ну й загадку задалі ж...

Думаў дзень, думаў два —
Забалела галава.

Вас цяпер я папрашу:
Памажыце малышу.

Хто адразу адгадае,
Хай руку ён падымае

І гаворыць: — Я гатоў
Растлумачыць тайну слоў...

Нешта ж доўга я чакаю...
Што? І з вас ніхто не знае?

Рук паднятых я не бачу.
Сам тады вам растлумачу:

Першым П стаіць вышыннае
І чытаецца: ПТУШЫНАЯ,

П, што выгнута падковаю,
Азначае: ПАЧАТКОВАЯ,

Ну, а што такое Ш —
Ясна і для малыша.

Пойдзеш з намі ў ППШ,
Ўсе, што ўбачыш, апішы.

А то, можа, ты ляўша,
Дык дзяцей лепш не смяшы.

Навучыся правай перш,
Тады сілу папрабуй.

Хоч — пішы адразу верш.
Хоч — ракетаю кіруй.

— А хіба мы на ракеце?
Не, давайце пехатой.
Бачыце, як блізка свецяць
Літары на школе той,
На ўсю браму:
ППШ.

З-пад свайго капелюша
Пазірае на нас, дзеці,
Сам дырэктар, слаўны Пеця.

Пётр Пятровіч ён для вучняў,
Для мяне — друг неразлучны.

— Здароў, Пеця-Певунец,
Бурштыновы грабянец!

Ты даруй, брат, што я мусіў
Да цябе прыйсці з экскурсіяй.

Можа, мы прыйшлі зарана,
Што яшчэ ў вас не прыбрана,

Не расстаўлены і парты
І не вывешаны карты?

— Ат,— махнуў крылом дырэктар,—
Так бывае ў нас нярэдка.

Празвінеў даўно званок,
Не прыйшоў ніхто на ўрок.

Я прачнуўся на зары,
Сабраў сшыткі, буквары,

Па надворку пахадзіў,
Потым вучняў пабудзіў,

Па чарзе пачаў пытаць:
— Як умееце чытаць?

І ніводзін мой сынок
Не знаў урока назубок.

Ні адной задачкі
Не рашылі качкі.

Дзюбаю вадзіла гусь
І па карце лазіла,

Ўсё шукала Беларусь
Ў Афрыцы і ў Азіі.

Так шукала ўпарта —
Выдзеўбла ўсю карту.

А дачушка курачка,
Як зляцела з седала,

Выбегла на вулачку:
— Я ж яшчэ не снедала.

А ў нас сёння бліны,
Тата, дай мне выхадны.

Тары-бары, растабары:
Ты купі мне акуляры,

А то я не бачу,
Як рашаць задачу.

— Ты, малая, не хітры,
Не гуляй у жмуркі.

Колькі будзе 2 + 3? —
Я спытаўся ў куркі.

Адказала курка: — 7.
Збегаю дамоў, пад'ем.

А пасля прыйду з дружком,
З выдатнікам індыком.

А індык дык індык,
Ён старацца не прывык
Ні лічыць, ні пісаць
І не знае 5 + 5,
Толькі ўмее балбатаць:

«Блу-блу-блу,
Блу-блу-блу —
Вельмі ж я чытаць
Луб-лу».

Пяты год буквар дзяўбе,
А запомніў:
А і Б.

— Грамацей, грамацей,
Ты парадуй нас, гасцей.

Калі знаеш А і Б,
Дам загадку я табе:

Дзве сястрыцы А і Б
Добра гралі на трубе.

Памагчы заўсёды рад
Быў сястрыцам меншы брат.

Сам залез ён у трубу
І як крыкне:— ту-бу-бу!

Чуюць сёстры — гук не той.
Ах ты, жэўжык, ну пастой!

А браток з трубы — скок, скок,
І няма — прапаў браток.

Папрабуй улаві,
Назаві яго імя,
Назаві, назаві!
Хто падкажа, дзеці?..
— І!

А выдатнік індык
Сюды — пык, туды — мык:

— Брата іх не бачыў я.
Я не быў у трубе,
Знаю толькі А і Б.

Вось прывёў дырэктар нас
У свой самы лепшы клас.

— Гэта самы клас культурны.
Хто сягоння ў нас дзяжурны?

— Я, пляменнік ваш, Яўтух.
— А прозвішча?
— Пі-я-тух.

— Чаму стол на адной ножцы?
І адкуль у вас на дошцы
Тут кляновыя лісты?
Растлумач, дзяжурны, ты.

Нешта я не разбяруся:
Палачкі, driving кручкі, калябкі...
— Пётр Пятровіч, гэта ж гусі
Малявалі свае лапкі!

— Дзе спіралка?
— Ўкрала галка.

— Бачыш, пылам клас пакрыты?
А чаму ты сам няўмыты?
Непарадак, Піятух!

А Яўтух той — хітры зух:
— Пётр Пятровіч, скажу вам,
Дык я ж — сан і ўсюды сам:

Я ж і тут, я ж і там,
Хоць вазьмі ты разарвіся...

— А які ж у цябе сан?
— Старшыня ж я
Сан-
Камісіі.

От якая ППШ,
Лепш маўчыце, дзеці, ша.
Нізашто больш не вазьмуся
Я туды вадзіць экскурсіі.

Даў зарок
І падпісаўся:
Ваш дружок —
Вясёлкін Вася.

*1962*

# ПРАВОДЗІНЫ СНЕЖНАЙ БАБЫ

Чаму ля дзетсада
Маршы і песні?
Снежная баба
Едзе на пенсію.

Едзе з двара,
Бо прыйшла пара.
— Салют! Ура! —
Крычыць дзетвара.

Губны гармонік
Склікае збор.
Выходзіць дворнік,
За ім — шафёр.

Пад ручанькі белыя
Бабку ўзялі
І саслабелую
Павялі.

Бабка садзіцца
На самазвал,
Баіцца
Спазніцца
Яна на вакзал.

— Хвілінку! — з усмешкай
Сказаў кладаўшчык.—
Да гэтакай спешкі
Я не прывык.

Глянуў сурова
Бабулі ў твар:
— Прашу, паважаная,
Здаць інвентар.

Здайце, бабуля,
Па акту ў кладоўку
Кій і каструлю,
Мятлу і маркоўку.

Здайце, бабуля,
Казённыя рэчы.
Праз год вам сустрэчу
Я зноў забяспечу...

Доўга ішоў бы
Ўрачысты парад,
Доўга цягнуўся б
Службовы агляд,

Каб не спасцігла
Бабу бяда:
Закапала ў бабы
З носа вада.

Са звонам упалі
Са стрэх ледзяшы.
І загукалі
Услед малышы:

— Спяшайся,
Бабуля!..
Вяртайся
Зімой
Снежнаю,
Свежаю
І маладой!

*1967*

# МАСКІ

1

За лагоднасць, за спагаду
У пашане ён.
Спаць залегчы быў бы рады,
Так гарнула ў сон —

Налучылася нагода,
Упрасіў народ:
— Трэба перад Новым годам
Нам правесці сход.

Слова мудрае нам скажаш,
Ну, а потым спі.
Да вясны сабе заляжаш,
Сёння — пацярпі:

Засталося ў лесе мала
Знаных пасялян.
Дарагі Міхал Міхалыч,
Ты ў нас — ветэран.

За турбацыю, за небыт
Ты ўжо, брат, даруй
І па форме ўсёй, як трэба,
Намі пакіруй.

Дзень апошні ў гэтым годзе
З намі памадзей,
Каб і ў нас было на сходзе
Так, як у людзей.

2

Чухае Мядзведзь за вухам,
Пачынае сход:
— От, скажу вам, заваруха,
Гэтулькі турбот,

А яшчэ і незадача,
Недаглядзік вось —

Я сакратара не бачу...
Нехта крыкнуў: — Лось!

Лось стары сказаў: — Ласіха.
Ў нас яна адна.
Болей сарамлівай, ціхай
Над яе няма...

Тут Ліса Лася ўкалола:
— Гэта ж — сваяўства!
Я складу вам пратакола,
Скажаце ўсе — во!

Выскачыў Казёл, галёкнуў,
Стаўшы ў першы рад:
— У мяне непадалёку
Лепшы кандыдат,

А праўдзівей, кандыдатка,
Незвычайны дар.
А грызе, а піша гладка —
Во дзе сакратар!

А як знаецца на нотах,
Як яна пяе!
Кожны дзень добраахвотна
Слухаю яе.

Можа сам Мядзведзь засведчыць,
З ёй мы — не радня.
Далучы сваё славечка,
Браце-старшыня.

— Нежывога ты расчуліш,
Аж нагнаў слязу...
Ты каго нам прапануеш?
— Я ж сказаў — Казу.

— Падтрымаць Казу гатовы?
Можа, ёсць адвод?
Паспускаў уніз галовы
І ні слова — сход.

— Калі згодны — падымайце
Дружна капыты,
Капытоў не маеце,
Можна і хвасты.

Сціхніце, я сам маўчу,
Бачыце — лічу, лічу...
Усе аднагалосна — за,
Перамагла Каза!

І Каза з ухмылкай кволай
Свой займае стол,
Апусціўшы вочы долу,
Піша пратакол.

3

— Ну, а хто ж...— акінуў зборню
Вокам старшыня,—
Нам даложыць па ўсёй форме
Распарадак дня,

А ці ёсць у нас дакладчык,
Як вядзецца скрозь?
І гукнуў з трыбуны Зайчык:
— Я ўжо тут! Я — ёсць!

Выхапіў з-пад лапкі папкі,
Разгарнуў даклад..
Як рвануў — мільгаюць пяткі
На ўвесь кругагляд.

Гэтакі палёт фантазіі —
Рогам не дастаць,
Пагражае ў кожным сказе
Некага «таскаць».

Але стаў найболей храбры
І хвастом затрос,
Як хапіў за рогі кадры —
«Кадравы вапрос».

Разлажыў усіх па спісы
І пералічыў:

У адным асобна — пысы,
У другім — лычы.

Каму ў лес, каму — па дровы,
Угару, наніз...
Каб ты, Зайчык, быў здаровы,
Каб ты, браце, скіс.

Доўга калупаў бы ў носе,
Каб не слухачы:
— Заяц, годзе, Заяц, досыць —
Сціхні, памаўчы!

І такі падняўся лямант
Аж з усіх радоў:
— Кончыўся даўно рэгламент,
Касавокі, до!

— Вы дакладчыка не лайце,—
Кажа старшыня,—
Просіць нас таварыш Зайцаў
Даць яшчэ паўдня.

А на сонца паглядзеўшы,
Так зазначыў сам:
— Не паспаўшы, не паеўшы,
Цяжка будзе нам.

Да таго ж і часу вобмаль,
Нават у абрэз.
...Заяц павярнуў аглоблі
І з трыбуны злез.

4

— Дык якія прапазіцыі
Мае хто дадаць?
Нехта крыкнуў: — Пагадзіцца!
Хтось сказаў: — Паспаць.

Старшыня паспаць бы рады,
Высунуўся Янот:
— Не дазнаўся я з даклада —
Калі ж Новы год?

Старшыня скрывіўся: — Дзіўна,
Ты ж у лесе рос.
Роўна праз наўгадзіны
Прыйдзе Дзед Мароз.

— Праз колькі, праз колькі?! —
Аж зароў Бабёр.—
Застанемся мы без ёлкі —
Я згубіў тапор...

Крот у лапы як заплешча:
— Чуеце? Ур-ра!
Можа скончыцца нарэшце
Ўлада тапара!

Хіба вам глядзець не горка,
Як рыдае бор,
Калі цягнуць ёлку ў норку
Кожны ліс і тхор?

Дай абавязкова ёлку
Кожнай Мышцы, нават Воўку...

— Стойце, дайце мне славечка,
Дайце мне сказаць!
Ёлка — гэта не авечка,
Нават не каза.

Зразумеў даволі колкі
Тонкі ваш намёк,
Але ж я ніводнай ёлкі
З лесу не звалок,

На мяне дарма намоўка...—
Ён сказаў і змоўк.
І шкада ўсім стала Воўка —
Горка плакаў Воўк.

5

Ноч насоўвалася глуха,
Выплыў маладзік.
Чуйна натапырыў вуха,
Лыч наставіў Дзік:

— Я такой зімовай цішы
Ў лесе не люблю,
Ад марозу нават мышы
Лезуць у зямлю.

Спяць сабе або націху
Лушчаць арахі...
Пачакайце, што за ліха,
Што там за «хі-хі»?

— Хі-хі,— сказала Мышка,—
І я прыйшла на сход.
Не сплю, чытаю кніжку
Якраз пра Новы год.

Вось дзе цуды і дзівосы,
Вось дзе весялосць:
Бураціна з доўгім носам
І Мядзведзь наш ёсць...

— Га, дык гэта ж... гэта ж — маскі! —
Выгукнуў Мядзведзь.—
З даўняй навагодняй казкі —
Нечага глядзець!

— Нечага? — сказала госця.—
Гэта вы — дарма.—
І паклала ў кнігу хвосцік:
Дагляджу сама.

Але кожны лез да Мышкі:
— Мой!
— А мой партрэт?!
Мыш схавала кніжку нішкам.
— Што, сакрэт?
— Сакрэт.

Толькі ўсе сакрэты блізка,
Цуды, што ні крок...
— Дзе? — не вытрывала Ліска.
— Тут, непадалёк.

Не за борам, не за морам,
Побач акурат

Казачная ёсць кантора:
«Маскі напракат».

І якую хто захоча —
Тую і бяры...
— А ці справімся да ночы?
Гэй! За мной, сябры!

6

Як сігане Лісіца,
За ёю следам — Зай.
Давай усе прасіцца,
Хоць сход ты закрывай.

Сказаў лагодны Міша
З дакорам: — Ну, народ!
Яшчэ ж і час не выйшаў,
А ўвесь разбегся сход.

Услед самотна глянуў,
Не цямячы, ў чым соль:
— Сабрацца на паляне
Роўна — у ноль-ноль!

Зірнуў на сакратарку
І так сказаў Казе:
— Пасада не па карку
І воз не па вазе.

Кіруюць хай другія,
Болей не магу —
Так мучыць настальгія
Па роднаму лагву.

Наверсе я прасіўся,
Не вызваляць — памру.
— Перадасі Ласісе?
— Сказалі, што Зубру.

Турбот залішне многа,
Не для мяне яны.
Кладуся ў лечбярлогу
Да будучай вясны.

7

А тым часам ля канторы
«Маскі напракат»
Не пазнаеш: хто — каторы,
Чысты маскарад!

З пашчы кракадзілавай
Выскаліўшы клык,
Зачараваны дзівамі,
Стаяў на ганку Дзік.

Кружылі ў пары згодна,
Нібы адна сям'я,—
Алень Высакародны
І Дзікая Свіння.

А што перад люстэркам —
Не павярнуць лыча!
Занятыя прымеркай,
Хто рохкаў, хто мычаў.

Пантофлі Бегемота
Казлу не па назе,
А вось Катовы боты
Былі якраз Казе.

Спакойная за ножкі,
Умiг яна знайшла
Імпартныя рожкі
Для свайго Казла.

Адкуль і спрыт,
І імпэт —
Ах, імпарт,
Імпарт,
Імпарт!..

Але найбольшы клопат
Быў з маскаю слана:
Адны цягнулі хобат,
Другія — ўсю спаўна.

Фарсіў не па сезону
Пасвісцел-русак
Пры барадзе Бізона
І ў Тыгравых вусах.

А вожыкі заўзята
Прыкідвалі на трох
Даволі цяжкаваты
Насарогаў рог.

Па сціпласці пасаду
Аблюбаваў Хамяк,
І адпаведна заду
Дабраў зуброў сваяк.

Адна старая Выдра
Прыбралася Куной.
І Воўк абнову выбраў,
Якой шукаў даўно.

Яна прыйшлася бліжай
Да душы Ваўку:
Берэт з чырвоным крыжам
І сумка на баку.

Шорты-безразмернікі
Ухапіў Барсук,
А Лісіца — пеўніка,
Перніка — япрук.

Пасля Ліса шукала,
Перапарола склад:
— Ці ёсць партрэт Шакала?
Ён — мой замежны брат.

Дзе бачна і дзе відна,
Каб крыўдзілі сястру —
Далі парык Яхідны
І торбу Кенгуру.

Важным элегантам
Пахаджаў Пацук
У бліскучай мантыі
Доктара навук.

Крот быў кандыдатам,
Але йшоў наніз,
Хоць капаў выдатна —
Вельмі слаба грыз.

Быў рады акулярам
Падслепаваты Крот...
— А вунь што за пачвара? —
Насцеражыўся сход.—

З хваста нібы Зубрыха,
З рагоў — Ласю раўня...
І раптам:
— Хопіць, ціха!
Я — ваш старшыня!

Я пакажу вам форму —
Забудзеце парток! —
Як грукнула платформай,
От гэта капыток!

Сам волат бурай масці
Стаяў —
гарой гара:
Спадчынніца ў масцы
Была страшней Зубра...

8

Яшчэ адна падзея
Успалашыла сход.
— Мае калегі, дзе я? —
З нары спытаўся Крот.—

У Афрыцы ці ў Азіі,—
І атарапеў:
— Што гэта за аказія,
Адкуль узяўся Леў?

Зірніце, што за грыва,
А як хрыбціну гне!
Вунь лыпнуў вокам крыва —
Дальбог жа, на мяне.

— Разводзіш тары-бары! —
Сказаў Янот стары.—
Здымі лепш акуляры,
Або чысцей пратры.

Тут дадала і Выдра,
Сказала: — Галава,
Слухаць мне абрыдла —
Ну, дзе ты бачыў Льва?

— Я маю дома кніжку,
Там ён — цот у цот!
— Схлусіў са страху лішку,—
Кальнуў Крата Янот.

— Ну і нагнаў ты жаху,
Дзе Леў? — спытаўся Дзік.
— Вунь, з папкаю пад пахай
Якраз на нас глядзіць.

Дзік галавой панік,
Прапала нават злосць:
Непадалёк на пні
Стаяў нязнаны госць.

Магутны, як у казцы,
Застылы на скаку.
— А можа, ён у масцы?
У львіным парыку?

Гадаць было запозна —
З нацятай цішыні
Пачуўся раптам грозны
Голас старшыні:

— Ты вельмі слаба петрыш,
Ты слаба сочыш, Дзік.
Да нас прыехаў з цэнтра,
З цырка прадстаўнік...

— Прабачце, недабачыў,—
Спалохаўся Япрук.
Не рохкае, а плача,
Выгнуўшыся ў крук:

— Яшчэ з часоў Мядзведзя
Такое — першыня,
Каб я ды недагледзеў,—
Даруйце, старшыня...

Пагардліва зірнула
Зборня на Дзіка,
Але тут пачула
І прадстаўніка:

— Нармальна, мальна, мальна,—
Прамовіў ён і змоўк.
А Дзік пачуў: «Пахвальна» —
І падступіў на крок.

А потым бліжай, бліжай
Стаў рыць наўкола пня.
Замарачыўся рыжы —
Ледзь галаву падняў:

— Дазвольце — перарыю
Я ўсю перыферыю.
Я рыць — тварыць прывык,—
Зірніце на мой клык!

Хваліцца не хачу,
Што ўсё мне па лычу,
Але ж і мне, і Свінцы
Тут цесна ў правінцыі...

І Леў Дзіка вітае,
Ажно чуваць здаля,
Што цвёрда абяцае
Нават медаля.

— Цьфу, гэтак агінацца! —
Не вытрываў тут Воўк: —
Вы не пазналі Зайца? —
І — цап таго за бок.—

Ну, што — папаўся, шэры?
Кінь, болей не дуры...
Спураўся Зай кар'еры
З той сумнае пары.

Ён знае абавязкі
І спраўна іх нясе,
Для лесу і для казкі
Працуе пакрысе.

9

Многа нарабілася
Падзей у тую ноч —
Траха не перабіліся
Усе, хто быў ахвоч.

Ледзь не дайшло да згубы —
Так енчыў бор густы:
Даліся ў знакі зубы,
А болей — капыты.

Хто ныў, хто выў, хто плакаў,
Было і смехаты —
Глядзелі разявакі
І рвалі жываты.

Хто ў куст зашыўся сціхам,
А хто ў нару запоўз.
І ледзьве старшыніха
Свой адшукала хвост.

А як далей там пойдзе,
Пасля такіх падзей?
Не так, як на тым сходзе,
А так, як у людзей.

Цяпер і ў лесе судзяць
Пасля прыгоды той:
Няхай заўсёды будзе
Кожны сам сабой.

*1975*

## БЕЛЫ БЫЧОК

Харошых свят багата,
Я ўсе святкую іх.
Ды не люблю я свята
Дзеля чытання кніг.

Нагрузкі многавата,
Ажно на семярых. . .
Ну што гэта за свята —
Сем дзён без выхадных?

Цяжкія абавязкі,
Каб гладка, без сучка
Сем дзён чытаць вам казку
Пра белага бычка.

Сябры ад ранку клікалі
На лыжы, на канькі.
Плакалі канікулы,
Вясёлыя дзянькі.

Пракляты бык! Няхай бы
Мядзведзь цябе задзёр,
Ганяюць хлопцы шайбу,
Ажно раве наш двор.

Чацвёрты дзень чытаю,
Амаль не ем, не п'ю,
Начэй недасыпаю,
Трымаюся, цярплю.

Я пяты дзень пацею,
Над кнігаю сяджу,
Я шосты дзень па тэле
Хакея не гляджу.

Цяпер адна ўжо мама
Няспынна сёмы дзень
Хварэе за «Дынама»,
Лік за мяне вядзе.

Вы ўсе зрабілі ўрокі?
А я... але — маўчок.
Вось да якої марокі
Давёў мяне бычок.

Адстаў я па футболу —
Ў свае вароты б'ю.
Хутчэй, хутчэй у школу,
На ўроках хоць пасплю!

*1976*

## НОС

Чаго ходзяць у бальніцы?
Кожны ведае — лячыцца.
Там ёсць многа дактароў,
І так лечаць — будзь здароў!

Захварэў і я, пайшоў.
Доктар кажа: — Здайце кроў.
— Ой, не дам, не дам крыві!
Доктар кажа: — Не раві!

Калі можаш — пацярпі:
Усю ноч не еш, не пі
І прыходзь да нас галодны,
Калі ў школе ты свабодны.

Я яшчэ мацней зароў:
— Для чаго мая вам кроў?
Я прыйшоў прасіць даведкі...
Доктар кажа: — Ну і дзеткі.

Што баліць?
— Усё баліць,—
Зноў расказваю ўрачу я.
— У вушах звініць?
— Звініць.
Ў школу не магу хадзіць,
Я настаўнікаў не чую.

Доктар за руку мяне,
Цераз калідор наўскос
Паказаў на кабінет:
«Вуха, Горла, Нос».

Дактароў нам трэба слухаць,
Калі ўжо бяда прыпёрла.
Вуха... няхай будзе вуха,
А пры чым, скажыце, горла?

Я — сапраўдны эскімос,
Эскімо грызу ў мароз,

Мог бы з'есці цэлы воз.
А пры чым, скажыце, нос?

Вуха... Вуха хай праверадь.
Я пастукаў ціха ў дзверы.
Думаў я, што там іх трое,
Аж адзін перада мною
Дзядзя з люстрам на ілбе:
— Што, мой дружа, у цябе?
Тут зусім ажыў я духам:
— Вы па вуху?
— Я па вуху.
— А дзе Горла, а дзе Нос?

— Ах, каб ты здаровы рос!
Я дамоў адправіў іх —
Сам працую за траіх.
Я падумаў: вось ён дзе,
Хто паможа мне ў бядзе!
Доктар казырок люстраны
Апусціў ніжэй на лоб:
— Ну, таварыш паважаны...

— Стоп! — крычу я.— Стойце, стоп!
Вы мне вушы правярайце,
Не чапайце вы мой нос,
Лепш хутчэй даведку дайце,
Каб я класнаму занёс.

— Ах, даведку,— сказаў Нос,—
Так бы з самага пачатку.
У мяне іх — цэлы стос.
Бачыш, з подпісам, з пячаткай.

Напішу табе па форме,
Так, як мае быць:
«Горла ў норме, вушы ў норме,
Нос — укараціць».

Досыць галаву марочыць,
Дарагі мой друг.
— А хто будзе... укарочваць?
— А я сам — хірург.

Бачу, кончыліся штукі,
Бачу, доктар мые рукі —
Даў я з кабінета чосу,
Рады, што застаўся з носам!

Чаго ходзяць у бальніцы?
Кожны ведае — лячыцца.
Там ёсць многа дактароў,
І так лечаць — будзь здароў!

*1976*

# ЁЖКА

Я ўжо вам — не крошка,
Сама ў дзетсад хаджу.
Мая сяброўка — Ёжка,
Я з Ёжкаю дружу.

З якою? З тою самай,
З даўгімі валасамі,
З той самаю, ага,
Каторая — Яга!

Не хочаце — не верце,
Увесь пацвердзіць сад:
На Новы год к нам чэрці
Прыйшлі на маскарад.

Толькі мы насталі,
Пабраліся за рукі,
А тут — яны з хвастамі,
І ўсе такія злюкі!

Ну, проста немагчыма —
Палохаюць дзяўчынак,
Настаўляюць рожкі,
Падстаўляюць ножкі.

Не вытрывала Ёжка:
— Дзеўчачкі, за мною! —
Як дасць чарцям падножку
Нагою касцяною!

Чарцей як не бывала,
Нібы змяла мятла.
Зазіхацела зала
Усмешкамі святла.

Зноў карагод дзяўчынак
Павяла ўкруга
Навакол яліны
Мілая Яга.

Так песню выцінае,
Нагою тупаціць.
Няўжо ёй касцяная
Ніколі не баліць?

— Ах, дарагая Ёжка,
Тупай, ды глядзі —
Касцяную ножку
Не падверадзі.

Прыпыніся, мамачка,
Адсапіся трошкі...
Яга скідае тапачкі,
А пасля — панчошкі,

І ад здзіўлення карагод
Да вушэй разявіў рот.
Усім такія б ножкі,
Як у нашай Ёжкі!

А ёй было замала
Гэтакага дзіва —
Ніц галавою стала,
Стаяла з паўгадзіны,

Радасным урокам
Цешачы гасцей
І тых, хто скокам-бокам
Цёрся ля чарцей.

Глядзяць зачараваныя
І госці і дзетсад:
— Просім, паважаная,
Нам зрабіць даклад.

Такіх на свеце мала,
Што ні гавары,
Каб так стаялі ўдала
Нагамі дагары.

Дзе вы навучыліся,
Хто вам дапамог,
Як вы налаўчыліся?
— А мой дзядуля — ёг.

Дзедаву навуку
Спасціглі пакрысе
І сыны, і ўнукі,
І праўнукі — усе.

Сягоння ёгі ў модзе,
Але мае сябры
Ўжо не стаяць, а ходзяць
Нагамі дагары.

І каб пайшла навука
У нас яшчэ ямчэй,
Нам трэба на парукі
Узяць усіх чарцей.

Я вас запытаю,
Хто адказаць гатоў —
Чаго нам не хапае?
Сказалі ўсе: — Хвастоў!

— Яны не вінаватыя...
— Вярнуцца ім пара...
Як закрычаць хвастатыя
З усіх куткоў: — У-р-ра!

І каб віну загладзіць
Хоць бы пад канец,
Як пачалі вылазіць
Хто з кухні, хто з сянец,

Хто з-пад стала, з-пад ложка
Да нас на маскарад,
Слухаючы Ёжку
І яе загад...

Вось якая Ёжка,
З каторай я дружу
І адной дарожкай
У дзетсад хаджу.

*1976*

## НУЛЬ БУЛЬ-БУЛЬ

Ішло трое бабуль,
Бачаць на дарозе — нуль.

Сталі бабкі ўперабой
Развважаць паміж сабой:

— Што рабіць і як тут быць,
Як знаходку падзяліць?

Было б толькі двое нас —
Разабраліся б ураз,

Падзялілі б адмыслова:
Кожнай — роўная палова

Па памеру, па вазе —
Кожнай бабе па дузе.

Кожнай — роўна паўкруга:
Мне — дуга, табе — дуга.

Жаль, што так у нас не выйдзе —
Вельмі ж трэцюю пакрыўдзім...

Трэцяя сказала: — Не,
Будзе вам і будзе мне.

Дзякуй, дзякуй вам, бабусі,
Ў крыўдзе я не застануся.

Мілыя мае падругі,
Забірайце свае дугі.

З вашага дазволу я
Вазьму дзірку ад нуля.

Дзякуй вам, што памаглі
Мне застацца пры нулі,

Бо навокала
Нуля
Круціцца
Уся зямля.

На ўвесь свет
Праславіў Нуль
Сваё прозвішча:
Буль-Буль.

Добра дзецям быў знаём
Круглым тварам,
Круглым лбом.
Малачко любіў, булён,
Возьме бутлю — і нагбом:

Буль, буль, буль,
Буль, буль, буль.
Гляне,
А на дне ўжо —
Нуль.

Нуль-Буль-Бульчык круглатвары,
Не любіў ён акуляры,
Бо замест вачэй былі
Ў Буля круглыя нулі.
І заместа носа — нуль,
А пад носам: буль, буль, буль.

І заместа рота — нуль,
Вось адгэтуль і дасюль,
А то, можа, і шырэй,
І вышэй нулёў — вушэй.

Матчын сын, унук бабульчын,
Быў ён самы лепшы вучань.
Не гарэзнік-беспрытульнік,
Нуль Буль-Буль быў круглы нульнік.
Тры гады быў у адным
Ён у класе нулявым.

Больш за ўсё любіў Нуль Буль
З мыла бурбалкі: буль, буль.
Як пачне ў саломку дзьмуць —

Пухіры плывуць, плывуць
І па небе, па зямлі —
Каляровыя нулі.

А аднойчы выдзьмуў шар,
Што падняўся вышай хмар,
І тады надумаў Буля:
Выдзьму я зямную кулю.
Хай яшчэ адна зямля
Круціцца вакол нуля.

Але мыла
Не хапіла.
Мыла
Буля
Пагубіла.

Так Буль-Бульчык надзімаўся,
Так стараўся,
Напінаўся —
Лопнуў
Небарака
Нуль.

Не знайшоў ніхто дасюль
Нават следу анідзе —
Быццам пугай па вадзе,
Быццам бурбалка:
Буль,
Буль...

Ішло трое бабуль,
Бачаць, на дарозе — нуль.

Сталі бабкі талакой,
Разліваюцца ракой,
Слёзы коцяцца ў бабуль:
Мілы,
Слаўны
Нуль
Буль,
Буль.

*1977*

# КАШЧЭЕВЫ ХАРЧЫ

Залучыў Кашчэй
Чараду чарцей
Паначы за харчы
Карчаваць карчы.

— Я, мужчынкі, сам пашчу,
Але шчодра заплачу
Вам за карчаванне:
Прыкачу кацёл баршчу,
Цэлы чан мачання.
На пачостку абяцаю
Вам чатыры чаны чаю,
Ну, а хто захоча кавы —
Проша, проша, пан ласкавы!

Што вучонага вучыць,
Як варочаць карчы!
Хто каго перакарчуе —
Смачны дух баршчу пачуе.
А шчаслівчыку за ўдачу
Я прадбачу і прыдачу:
Прыімчыць мой пасланец
Першы з прыпечка блінец
Грачаны,
Мой пане,
Мачаны
Ў смятане.

Не шкадуючы аддзячу
І таго нячысціка,
Хто ачысціць ад ламачча
Лядзішча да лісціка.
Сёння ж па адвячорку
Пачынайце раскарчоўку...

Нашча чэрці шчыравалі
І кашчавага чакалі.
Ноч не харчаваліся —
Перакарчаваліся.

Дзень чакалі і яшчэ
Ноч і дзве — не йдзе Кашчэй,
Не імчаць пасланцы
З печы, з жару блінцы,
Не чуваць мачанікаў,
Гарачых грачанікаў.

Кончылася карчаванне
Без баршчу і без мачання,
І без чаю, і без кавы —
Ашукаў шайтан кашчавы!

Ад нішчымніцы чарты
Падкурчылі жываты,
Ачмурэўшы ад карчэўя,
Учарнеўшы з бесхарчэўя.

На Кашчэевых харчах
Валачашчы чорт зачах.
Не таўчэцца на вачах,
Не батрачыць па начах.

Чарцяняты не лайдачаць.
Гледзячы на нас, растуць.
А Кашчэя як убачаць —
Абмінаюць за вярсту.

*1980*



# КАЗКІ

## ВАВЁРЧЫНА ГОРА

КАЗКА
ПРА ВЕРУ-ВАВЁРАЧКУ,
ПРА ЯЕ ГОРА-ГОРАЧКА,
ПРА ЯЕ МАЛЕНЬКІХ ДОЧАК,
ПРА ВАВЁРЧЫН МАЛАТОЧАК,
ПРА ПТУШЫНАГА ПАСЛА —
ДАЎГАНОСАГА БУСЛА,
ПРА ЖЫЦЦЁ-БЫЦЦЁ ЛЯСНОЕ
І ЯШЧЭ ПРА ТОЕ-СЁЕ.

Забалелі ў вавёрачкі зубкі —
Не можа раскусіць арэхавай шкарлупкі.
Плача Вера-вавёрачка:
— Ой, гора маё,
Горачка...

Сабралася ўся вавёрчына радня.
Думаюць, гадаюць усю ноч да дня:
Як тут быць,
Што рабіць?
Прыкладаюць дочкі
Мамачцы прымочкі.
Грэюць унучкі
Бабульцы анучкі.
Яшчэ болей баляць вавёрчыны зубкі —
Не можа крануць арэхавай шкарлупкі.
Вестку паслалі старэйшаму сыну,
Той адразу ўсе справы пакінуў,
І праведаць хворую маці прыехаў,
І прывёз поўны мех ёй арэхаў.
Ён не знаў, што баляць у вавёрачкі зубкі,
Што не можа крануць яна імі шкарлупкі.

Госцю маці гаворыць:
— Сыночак,
Ты прывёз бы мне малаточак.
Не трудзіла б я зубкі,
Не верадзіла,
Малатком бы шкарлупкі
Біла.

— Што ж,— кажа сын,—
У маёй старане
Ёсць каваль — лепшы мой друг,
Ён можа скаваць для мяне,
Што я захачу,— нават плуг.

— Мне плуг не патрэбен, сыночак,
Хай зробіць ён мне малаточак.

— Мама,—
Гаворыць ёй сын у адказ,—

Я дам тэлеграму,
Ён зробіць ураз.

Сарваў сынок
Дубовы лісток —
Тэлеграма гатова:
«Я жывы і здаровы.
Толькі баляць у мамачкі зубкі —
Не можа кусаць арэхавай шкарлупкі.
Прашу, дружок,
Зрабі малаток».

Сказалі сёстры брату:
— Навошта
Табе самому хадзіць
На пошту?
Мы самі знаем, дзе стары граб.
Даўно мы хацелі
Збегаць на тэле...
Даўно мы хацелі
На тэле-
Граф.

— Ну, што ж, імчыце,—
Сказаў браток,—
Занясіце лісток,
Вазьміце квіток.
— Нясіце,— сказала мама,—
Каб сёння ж
Дайшла тэлеграма,
Няхай сам начальнік на бланку
Паставіць пячатку,
Што гэта «маланка».

Імчацца шустрыя сёстры,
Мільгаюць дрэвы
І вёрсты.
Прымчаліся
Ў самы гушчар.
Што тут такое?
Пажар!

Усё у агні — і лісцё, і галіны,
Але здагадаліся сёстры,

Што гэта —
Прыбеглі
На самы разгар лета
І палаюць агнём
Не галіны,
А спеюць
Чырвоныя арабіны.

Імчацца далей сёстры няспынна,
Мінаюць гушчар
І пажар арабінны.
І вось перад імі
Новая пацеха:
Дрэва,
А на дрэве — арэхаў, арэхаў!
А спелепеча-ча-ча-чкія,
А жоўценеча-ча-ча-чкія,
А поўненеча-ча-ча-чкія,
А на вяршэча-ча-ча-чку,—
Шкада,
Не ўзялі з сабою
Мяшэчачка.

І тут яны ўспомнілі,
Што баляць у матулі зубкі,
Што не можа яна раскусіць арэхавай
Шкарлупкі.
Хутчэй жа,
Хутчэй,
Хутчэй туды,
Туды,
Дзе растуць
Старыя дубы!

Лістамі сцежку
Сцеле
Граб,
Прыбеглі сёстры
На тэле-
Граф.

Шматпавярхавы дом —
Высознае дрэва
З акном-дуплом,

Уваход налева.
Калі ўмееш — чытаі́ сам,
Што напісана над аконцам:
«Прыём тэлеграм
Да захаду сонца».

Вавёркі ў дупло
Лапкамі: стук-стук,
А ім у адказ:
— Хто тут?
Хто тут?
Не лезьце ў дупло —
Ужо сонца зайшло!

Сталі сёстры прасіць:
— Дзядзюхна начальнік,
Тэлеграму трэ адбіць,
Гэтак мы імчалі,
Гэтак беглі
Праз гушчар,
Праз агонь,
Праз пажар...
Хворая ў нас маці,
Дзядзюхна дзяцел...

Падабрэў начальнік,
Непрыступны маўчальнік,
Акуляры надзеў,
На лісток паглядзеў.
— Добра,— кажа,— пашлю
Заўтра ўранку кавалю.

— Як гэта — заўтра ўранку?
Нам загадала мама,
Каб вы паслалі з маланкай
Нашу тэлеграму.

— З маланкай? —
здзівіўся дзяцел.—
А дзе ж яе ўзяці?
Не працуе бесперастанку
У мяне па пасылках маланка.

Бывае
І яна выхадная.
— Хай тады кавалю на дом
Заімчыць тэлеграму гром.
— Гром? — усміхнуўся начальнік.—
Гром?
Ён толькі з работы
І спіць
Непрабудным сном.

— Хто ж перадасць тэлеграму,
Хто ж?
— Дождж,— сказаў ім начальнік,—
Дождж!

І застукаў
Начальнік,
Непрыступны
Маўчальнік,
Дзюбаю: тук-тук!
Тоўстаю: ток-ток!
І з лістка
На лісток
Пацёк
Ручаёк...

Бягуць вавёркі дадому
І чуюць,
Як іх тэлеграму
Кроплі друкуюць:
«Тук-ток,
Кавалёк,
Прышлі маме
Малаток.
Разбалеліся ў мамачкі зубкі,
Не можа раскусіць арэхавай шкарлупкі».

Паплыў паток,
Пагнаў лісток,
Панёс удаль,
Дзе жыве каваль —
Стары воран,
Як вугаль, чорны.

Прыйшла тэлеграма якраз у час,
Кавалю не дае спакою заказ.
Сон яго не бярэ,
Яда не лезе:
Як зрабіць малаток —
Няма жалеза.

— Знайсці жалеза я бяруся,—
Сказаў кавалю даўганосы бусел.
Ён абуў чырвоныя боты
І палез
У балота.

А праз гадзіну ўжо бусел
Вярнуўся:
— Так і так.
Ляжыць у канаве «тыгра» —
Нямецкі танк.

Прыйшоў каваль
З прыладамі,—
Чоран воран,—
Паставіў кавадла,
Распаліў горан,
Скінуў кажух,
Надзеў фартух,
Узяў абцугі,
Прайшоў раз-другі.
Жалеза не відаць —
Гара іржы.
— З чаго мне каваць
Малаток —
Скажы?

Падумаў бусел:
«Прыйдзецца, мусіць,
Самых дужых звяроў склікаць,
Каб забітага «тыгра»
Па костачках разабраць».
Прыйшоў мядзведзь,
Злуецца, равець,
Прыйшоў воўк —

Зубамі шчоўк-шчоўк,
Прыйшоў бабёр —
Хвастом пацёр.
Доўга так раўлі і вылі
І нічога не зрабілі.

Беглі ў гэты самы час
Маленькія зайкі,
Узяліся і — ураз
Развінцілі гайкі.

Тады гусі і сініцы
Знялі вежу,
Гусеніцы.
Наскублі яны так-сяк
З паганага «тыгра» шэрсці шматок.
Вось табе і хвалёны танк —
Ледзь хапіла вавёрцы
На малаток.

Добра сказаць —
Заказ гатовы,
А як пасдаць
Яго ў бор сасновы?

Другі дзень вавёрка малатка чакае,
Можа, яна, бедная, з голаду канае.
Гэтак моцна баляць у вавёрачкі зубкі,
Што не можа крануць арэхавай шкарлупкі.
Апусціліся галовы ніц
І ў зайцоў,
І ў сініц.
Сядзяць у скрусе
Бусел
І гусі.
Стаў ад гора
Воран
Яшчэ болей
Чоран.

Паўзе крот,
Зямлі повен рот:
— Ду-ду-ду, ду-ду-ду,

Я вашу бяду
Адной лапай
Развяду.
Сталі ўсе яго прасіць:
— Краточак,
Крот,
Браточак
Фядот,
Ты можаш зрабіць
Самалёт?

— Угу.
Я магу.
— Нам трэба, браточак,
Пасдаць малаточак...
— Добра,— кажа ім крот,—
Я зраблю самалёт.
Скідай, каваль,
Свой чорны хвартух,
Прынясі мне
Шырокі лапух,
А вы, зайкі,
травы нарвіце,

Вяровачкі звіце,
Малаток
У вузялок
Завяжыце.

— А цяпер,—
Кажа крот,—
Я буду галоўны пілот.
Мяне вы прасілі.
Падымай, бусел, крыллі,
Бяры ў дзюбу лапух —
Павязём малаток мы
Удвух:
Верхам сяду ў цябе я на шыі,
Паляцім мы пад хмары густыя,
Будзеш ты
Крыламі махаць,
А я
Буду табой кіраваць.

— Дзякуй,— бусел яму ў адказ.—
Гэта раз.
Памагла нам твая галава —
Гэта два.
Ну, а болей не гавары —
Гэта тры.
Памагатых такіх мне
Не трэба.
Калі ж хочаш
Пабачыць ты неба
І зайздросціш адно нам,
Буслам,—
Паспрабуй
Узніміся
Сам!

Цвёрдае слова —
Слова буслова.
Ўзяў лапух у дзюбу ён.
Варухнуў крыламі —
І ляціць наш паштальён
Лугамі,
Лясамі.
А куды ён ляціць —
Можа, боты шыць,
Можа, ніткі віць? —
Адкажыце
Самі.

Ну, вядома,
Ляціць да вавёркі-галубкі,
Вельмі ж моцна баляць
ясе зубачкі-зубкі.

Ён нясе ёй вузялок,
Там завязан малаток,
Каб вавёрка зубоў не трудзіла,
Каб арэхі малаточкам біла...

У вавёрчынай жа хаце
Поўна шуму, весялосці,
Перадаў ім вестку дзяцел,
Што ляціць сам бусел ў госці.

Вось унучкі
Сталы засцілаюць,
А дачушкі
Пачостку стаўляюць,
Сын
Пясочкам ля самага дома
Высыпае пляцоўку
Аэрадрома,
Каб птушыны пасол мог спусціцца,
Паміж соснаў густых
Прызямліцца.
Гасця сустракаці
Выходзіць маці:
— Што на белым свеце чуваці —
На балоце,
На сенажаці?

— Ат, якія ў нас навіны,—
Ёй адказвае бусел,—
Вы ж самі ведаць павінны,
Што ўсе мы ў самоце і скрусе.
Як прыйшла тэлеграма,
Што баляць у вас зубкі,
Не спалі мы цэлыя суткі,
Не знали шчаслівай мінуткі.
Цяпер я спакойны
За ваш раток,—
Вось вам бранябойны
Малаток.

— Ай-яй-яй! — дзівяцца сёстры.—
Які ён цяжкі,
Які ён востры...
Мы хацелі другую адбіць
Тэлеграму,
Што даўно не баліць
Раток у мамы...
І няхай будзе сказана толькі між намі —
Лепей грызці арэхі сваімі зубамі.
Мы хацелі,
Мы вельмі хацелі
Зноў збегаць
На тэле...

На тэле...
— Перастаньце! — на дочак
Прытупнула маці.
— Малаточак
Спатрэбіцца ў хаце...

Доўга ў іх ішла бяседа-
Гаворка.
Ўсе суседзі
Былі
У вавёркі.

Стары дзяцел
З сваім зяцем,
Тры сініцы-сястрыцы,
Цётка Ганулля —
Шэрая зязюля,
Пяць зайцоў-малайцоў,
Удод-удавец —
Слаўны на дудзе ігрэц,
Два глухія глухары
Білі ў бубен
Да зары.

І я там быў
За тым сталом
І еў і піў
Разам з буслом.
Што там было весялосці
І смеху.
Папаелі госці
Грыбоў і арэхаў.
Былі мёд і квас там,
Бульба, селядзец.
Хто праслухаў казку —
Той маладзец.

*1947*

# БУСЛІНАЕ ЛЕТА

ГЭТА БУДЗЕ ДОЎГАЯ КАЗКА.
А ПАКУЛЬ ШТО НА НЕКАЛЬКІ СЛОЎ
АДКАЖЫЦЕ ВЫ МНЕ, КАЛІ ЛАСКА,
ХТО З ВАС БАЧЫЎ БЕЛЫХ БУСЛОЎ,
ІХ СТАРУЮ ДАМОЎКУ НА ВЯЗЕ,
НА ДРАЎЛЯНЫМ ШЫРОКІМ КОЛЕ,
МОЖА, З ВАС ХТО ТУДЫ НАВАТ ЛАЗІЎ,
АГЛЯДАЎ З ВЫШЫНІ НАВАКОЛЛЕ,
ПАЗНАЁМІЎСЯ З БУСЛАМ, З БУСЛІХАЙ?
КАЛІ НЕ, НУ ДЫК СЛУХАЙЦЕ, ЦІХА.

## ЯК Я ПАЧАЎ СКЛАДАЦЬ КАЗКУ

Ціха так,
Хоць сей ты мак.
Я сяджу ў градзе гароху.
Рву сабе стручкі патроху,
А паблізу, на аселіцы,
Нехта цвеліцца і цвеліцца:
То ляскоча
Безупынна,
То сакоча
Гэтак шпарка,
Як матор якой машыны
Ці калгасная жняярка,
Раз-паразу: чах-чах-чах.
Што такое?
Проста страх.
Толькі глянуў я на вяз,
Што за вуліцай у нас,—
Зразумеў, адкуль той клёкат:
У гняздзе навідавоку
Стары бусел суча ніткі,
Будзе шыць ён дзецям світкі.

Выткала бусліха кросны,
Разаслала ранкам росным
Доўгія свае палотны

Па лугах усіх балотных...
Я па дрэва ўзлезці б рад
Адным махам, без аддыху,
Паглядзець на буслянят,
Пазнаёміцца з бусліхай
І праверыць, як ідзе
Лад-парадак у гняздзе.

Сёлета ў чацвёрты клас
Пераведзены я ў школе,
На ўсё лета маю час
Пагуляць у лузе, ў полі.
Маю ў сшытку я заданне —
Даць прыроды апісанне.
Сцеражыся, горды бусел,
Да цябе я дабяруся.
Пагляджу, як сучаш ніткі,
Як ты шыеш дзецям світкі,
Стану на тваё я кола
І пабачу ўсё наўкола:
Свет птушыны, свет раслінны,
І наогул — белы свет,
Выведаць я ўсё павінны,
Апісаць усё як след.

Вось пайду і ўміг, ураз
Ўзлезу на высокі вяз.
Вы мо скажаце — не ўмею
Я дабрацца да вяршыні?
Ўмець умею,
толькі млею,
Калі гляну ўніз з галіны.
Падрасту, а там пабачу,
Можа, будзе яшчэ ўдача.
А пакуль, як пугаї ляснуць
Мне па лужы, па траве,—
Пра буслоў складу я казку,
Ёсць і думка ў галаве.

Пра буслоў дык пра буслоў,
Толькі дзе набрацца слоў?
Сеў ля самага я вяза
І пачаў тых слоў шукаць.

І адразу сказ за сказам
Спрэс спісаў старонак пяць.

Што з таго, што я не ўзлез
На бусліны вяз той,
Мне ў адказ гудзе ўвесь лес,
Калі пугай лясну.
І сціхаюць у гняздзе
Галасы бусловыя,
Толькі водгулле ідзе —
Высякаю словы я,
Словы адмысловыя.
Сам вачам сваім не веру,
Усё так складна на паперы:
Побыт бусла да драбніц
Апісаў шырока,
Як ён спіць і што ён сніць,
Як ён з выраю ляціць —
Нізка ці высока,
Як ён суча тыя ніткі,
Як ён шые дзецям світкі,
Як ён там абедае,
Варыць як вячэру —
Усё як быццам ведаю,
Хоць наўрад ці веру.

Нада мною ластаўкі
Пэўна што смяюцца.
І ўсё просяць: — Баста, кінь! —
І ля вуха ўюцца.

Ластаўчыну мову
Я таксама знаю
І ад слова ў слова
Так перакладаю:
«Шатавіла-матавіла
Па-нямецку гаварыла,
Пела па-турэцку,
Плакала па-грэцку.
З носіка — шыльца,
З хвосціка — вільца,
Спадыспаду — палатно,
На аплечках шоўк, шоўк.

Зазірнула я ў гумно,
Дзюбачкай шчоўк-шчоўк.
Як у вырай адлятала,
Шмат дабра вам пакідала,
Не ўзяла ні жменькі.
Прыляцела, паглядзела —
Няма нічагенькі:
Усё чыста пералушчылі,
Перацёрлі, launch ператрушчылі.
Што нажалі, накасілі —
Без мяне памалацілі.
Ці-лі, ці-лі,
Ці-лі...»

Прыцемак спусціўся
На траву, на краскі,
Так я захапіўся
Сваёй байкай-казкай.

Чараду прыгналі з пашы,
За вячэру селі нашы,
У паветры стала золка,
Выйшла першая зара,
І крычыць мне перапёлка:
— Спаць пара! Спаць пара!
Каб у тайне ўсё было,
Што пішу я ў сшытку,
Пакладу яго ў дупло —
Папрабуй знайдзі-тка.

І вас таксама я прашу,
Сябры,— ні слова, ні гу-гу,
Пакуль што памаўчыце,
Якую казку я пішу,
Я толькі вам сказаць магу
І перапёлцы ў жыце.

Сакрэт я вам даверу,
Вы толькі дайце слова,
Я прынясу паперы
І новы свой аловак
І заўтра зноў уранку
Прадоўжу пра буслянку,

А то і маці мне з двара
Гукае ўжо, што спаць пара.

## ХТО ВЫДАЎ САКРЭТ

Ледзь я прычакаў світанку,
Каб пад вяз пабегчы зранку,
Праварочаўся ўсю ноч,
Не прыплюшчыў нават воч —
Не давала мне спакою
Ўсё гняздо буслова тое,
Што далей пісаць мне ў казцы,
У яе наступнай частцы.
Калі ўзяўся, брат, за гуж,
Дык не жалься, што не дуж.
Калі даў сваё ты слова
Апісаць жыццё буслова,
Дык выконвай абяцанне...

Я падняўся на світанні
І — бягом на ўскрай сяла,
Потым трохі ўзяў налева,
Да знаёмага вам дрэва,
І адразу ж да дупла.

Сунуў я руку ў дупло —
І аж мову заняло,
Стаў нямілы белы свет:
Хто... Хто выдаў мой сакрэт?

Можа, сто разоў адразу
Абабег вакол я вязу,
Кожную агледзеў жылку
Пад карой і па кары,
Кожную абмацаў шчылку
На буслінным тым двары —
Хочаш вер ты ці не вер,
А няма маіх папер.

Знік пачатак маёй казкі.
А з чые нядобрай ласкі?
Мне сняданне не ў сняданне,

І абед мне не ў абед.
Кіну ўсё — усё дазванпя,
Буду дзень шукаць і месяц,
Буду год, а то і дзесяць,
А знайду я казкі след.

## ПОШУКІ КАЗКІ

Сцежкі выбраць мне якія,
Пошукі з чаго пачаць?
Месцы знаю я глухія,
Дзе лясы, дзе сенажаць,
Дзе дрыгва і дзе імшары,
Дзе глыбокія выгары.
І туды я нават траплю,
Дзе жыве старая чапля.
Выйду на рачную мель,
Дзе гуляе жуによる.
Мне туды якраз з рукі,
Дзе начуюць два ваўкі.
Добра знаю я дарогу
І ў мядзведжую бярлогу.
Знаю горы я кратовыя,
Знаю норы я лісовыя...
Толькі вось з чаго пачаць?
А мо лепей легчы спаць,
Сіл набрацца, падрасці
І тады ўсё абысці?
Не, вы лепш і не кажыце,
Што слабы і што малы я,
І спужаюся нібыта
Я ваўка, што ўночы вые.
Не ўздыхайце, не тужыце,
Як на сумных тых памінках...
Я дубовага ўзяў кія
І пайшоў сваёй сцяжынкай.
А куды пайшоў?
У жыта.
Хай сабе не блізкі свет,
Хай уногі колка.
Знаю, хто адкрыў сакрэт,
Знаю —
Перапёлка.

## ПЕРАПЁЛКА

Гэта ўчора ўсё яна
Ад цямна і да цямна,
На хвілінку сціхла б хоць,
Звала ўсё: — «Ідзі палоць!»
А ля самага двара
Ўсё крычала: — «Спаць пара!»

Сама ж не палола,
Ножак не калола,
Усю ноч не спала
І мне не давала.
Лёгка мне знайсці яе,
Бо гнязда ж яна не ўе
Ні ў дупле і ні ў галлі —
Зробіць ямачку ў раллі,
Высцеле травою —
Вось і ўсе пакоі.
Да зямлі ўсё туліцца,
Дзюбай жыта чэша,
А лятаць лянуецца,
Болей ходзіць пеша.

Я ўсё жыта абышоў
І гарахавішча,
Так яе і не знайшоў —
Не відно і не чутно,
Не пяе, не свішча.
Спіць яна цалюткі дзень,
А як ляжа ночы цень,
Выйдзе першая зара,
Закрычыць тады яна:
— Спаць пара! Спаць пара!
А сама не спіць адна
Аж да самага відна.

## КНІГАЎКА

Падаюся ў бок другі,
Праз папар, праз мурагі,
На прырэчныя лугі.
Раптам пізка нада мной,

Па-над самай галавой:
— Чый ты, чый? Кі-гі, кі-гі!

— Я-то свой, а ты чыя,
Кнігаўка самотная,
Птушка пералётная?
Калі зробіш ласку,
Знойдзеш маю казку —
Буду век удзячны я.
— Чый ты, чый? Адкуль такі?
Дзе жыву я — не скажу
І гнязда не пакажу...
І вядзе ўсё ад ракі,
Ад высокай асакі
І крылом над вухам: ж-жу!..
А ля самае дарогі
Кідаецца мне пад ногі,
Скокам-бокам адпаўзае,
Ну, здаецца, памірае,
Папрабуй жа дагані —
Не дагоніш на кані.

Мне гняздо тваё не трэба,
Ні твае малыя дзеці.
Лётай з ранку і да ранку
Пад высокім добрым небам,
Пацяшай людзей на свеце,
Ашуканка, ашуканка...

## САРОКА

Каля лесу недалёка
Скача з куста ў куст сарока,
На мяне ўсё пазірае
І трашчыць, як завадная:
— За папер-рку
Дай цукер-рку...
— Што? Дык казку ты украла
І ў гняздзе сваім схавала,
Нарабіла шуму-крыку,
А цяпер табе дай выкуп?
Не, зладзейка-дабрадзейка,

Зараз я зраблю праверку
І такую дам цукерку —
Растрасу тваю сямейку!

Мне адказвае сарока:
— Да гнязда майго высока.
Праўда, што люблю я красці,
Але ж рэчы дарагія —
Срэбраныя, залатыя,
Лыжкі, гузікі, пярсцёнкі,
Што здалёку ўсім відны,
Густ на іх у мяне тонкі.
А якое з казкі шчасце?
Ёй няма ў мяне цаны...

Я падумаў: за прызнанне
Памяншаюць пакаранне.
У гняздо я не палез,
А далей падаўся ў лес.

## СІНІЦА

— Цвінь-цвень! Пінь-пень!
Добры дзень! Добры дзень!

Хто гэта мяне вітае —
Ці шчыгол,
Ці слаўка гэта?
Не, вось блізка падлятае,
На сасновы сук садзіцца.
Углядаюся ў прыкметы,
Трэба ж так мне памыліцца —
Не пазнаў сваёй сініцы.
У мяне яна ўсю зіму
Зімавала ў цёплай хаце,
І аўса, можа, асміну
Аддала ёй мая маці.
Так яе мы ўсе любілі,
Так кармілі,
так паілі.
Быць не можа,
каб за ласку
Яна ўкрала маю казку.

— Цвінь-цвень! Пінь-пень!
Добры дзень! Добры дзень!
— Добры дзень, мая сініца,
Як я мог так памыліцца?

## ЗЯЗЮЛЯ

Пэўна, вы вясною чулі,
Як на дрэве, на суку
Кліча на ўвесь лес зязюля:
— Ку-ку! Ку-ку!

Я ў зязюлі запытаю,
Можа быць, яна што знае,
Куды знік з дупла мой сшытак.
— Родненькая, адкажы ты.

Калі што табе вядома,
Ты адкрый мне тайну тую —
Я ўжо цэлы дзень як з дому,
Пад сабой зямлі не чую,
Я ўжо з голаду канаю,
Ледзьве ногі валаку.
А зязюля мне: — Не знаю.
Ку-ку!

Крыллямі залапацела
І ў асіннік паляцела.

Тут я ўспомніў: гэта ж птушка,
Што малых не любіць гушкаць,
Ні спяваць ім калыханкі
І ні ў ладкі з імі пляскаць,
Ні вадзіць на пагулянкі,
Ні расказваць байкі-казкі,
Бо яе малыя дзеці
Раскіданы па ўсім свеце.
Іх чужыя кормяць маткі,
Даглядаюць і гадуюць,
А зязюля і палаткі
Ім на лета не будуе.

Так яна свой век вякуе —
Ні двара і ні кала,
Век сваё «ку-ку» кукуе —
Рада, што дзяцей збыла.

## САЛАВЕЙ

У зацішку вербалозаў ніцых,
Дзе лясная сочыцца крыніца,
Я вады халоднае напіўся,
Стала на душы мне весялей.

Срэбранаю пацеркай на нітцы
Затрымцеў і песняю разліўся
У альховым кусце салавей.

Дасціпны, увішны,
Слаўны ён спявак —
Светлая манішка,
Поверх — доўгі фрак.

Пэўна, што заслужаны,
Хоць на выгляд шэры ён,
А голас не застуджаны,
І сам без фанабэрыі.

Браў свабодна трэлі,
І нізы, і высі ён,
І скроні не макрэлі,
Не цёр хусцінкай лысіны.

Спяваў і па-французску,
Спяваў другімі мовамі,
А больш — па-беларуску,
Але сваімі словамі:
— Як у лядзе-лядзе
Пастух сала пёк-пёк,
Як прысядзе-сядзе
На пяпёк-пяпёк-пяпёк,
Як пакр-руціць ён ражэньчык,—
Ах, каб цябе, каб...
Сквар-рка: тр-р, кап-кап...

І няма: ўсю з'еў агеньчык...
— Салавей,
мой любы браце,
Я хачу ў цябе спытаці:
Можа, чуў ты, хто між вас тут
Пераказваў маю казку?

А салоўка мне ў адказ:
— Гэта не цікавіць нас.
Што твая мне казка тая,
Я ж яе не заспяваю.
У мяне свае турботы —
Салаўю патрэбны ноты.

## ПРЫХОД ДАДОМУ

Лёг на травы доўгі цень,
Росны і халодны,
Прабадзяўся я ўвесь дзень
Стомлены, галодны.
А не піўшы і не еўшы —
Хто расказваць будзе вершы?
Добра,
што мая сініца
Завяла мяне ў суніцы,
А спагадлівая пліска
Паказала шчаўе блізка.
Пражывіў я трохі душу
І ні з чым дадому рушу.

Адчыняю дзверы ў хаце
І спыняюся ў парозе.
Рукі ў смутку ломіць маці,
У адчаі і трывозе:
— Ой, мой сынку, мой сыночак,
Дзе ж ты знік, мой галубочак?
Выплакала я ўсе слёзы,
Вытаптала я ўсе лозы,
Вытаміла свае ногі,
Выглядзела ўсе дарогі
І ля лесу, і ля лугу,
Ля сасонак і асінак —

Дзе ж блудзіў ты, валацуга,
Што абдзёрся ўвесь і вымак?

— Не плач, мама,—
я даў слова
Апісаць жыццё буслова
І цяпер па абавязку
Пра яго складаю казку,
Толькі вось сакрэт адкрыты —
Нехта ўкраў з дупла мой сшытак.
Выхадзіў я лес і поле,
Апытаў каго дзе мог,
А куды пайсці мне болей,
Я і так ужо знямог,
Абышоў, напэўна, свет —
Не напаў нідзе на след.

— Сынку, шмат дарог на свеце,
Знойдзеш ты спагаду, ласку.
Хто яшчэ знаў аб сакрэце,
Што пачаў складаць ты казку?

Хто яшчэ знаў аб сакрэце?
— Мама, зналі яшчэ дзеці.

— Пэўна, дзеці і забралі,
Прачыталі і парвалі.

Праўду, праўду кажа маці —
Любіце вы кніжкі рваці.
Калі ж казку вы забралі,
Прачыталі, не парвалі,
Дык прашу вас — і не рвіце,
Мне хутчэй яе вярніце.

## БУСЕЛ ЗАПРАШАЕ МЯНЕ Ў ГОСЦІ

Зноў прыходжу я пад вяз,
Над пустым стаю дуплом
І якраз у гэты час
Сустракаюся з буслом.

Ён ступае гэтак важна,
На мяне глядзіць уважна,
Асцярожна падыходзіць
І гаворку так заводзіць:

— Ты чаго такі пануры,
У самотнасці і скрусе,
Як пасля якіх хаўтураў? —
Так пытае ў мяне бусел.

— Ой, таварыш дзядзька бусел,
Другі дзень я ўжо снуюся
І як рыба аб лёд б'юся:
У мяне такое гора —
Сшытак мой укралі ўчора.

Апісаць я быў павінны
Свет птушыны, свет раслінны
І наогул белы свет —
Наскладаць хацеў я казак,
Як падняць — вялікі звязак,
Бо на тое ж я — паэт.

Усміхнуўся стары бусел:
— Дай я толькі разбяруся.
Напісаць ты казку марыш?
Што ж, пішы, калі паэт,
Але знай, я — не таварыш
І не дзядзька,
я ўжо — дзед.

Я калісьці з тваім дзедам
У далёкай маладосці
Самым блізкім быў суседам
І яго найлепшым госцем.

На страсе старое хаты
У той час была буслянка,
З тваім дзедам я да ранку
Вёў гаворку, нібы з братам.

Ён — на прызбе, я — ў гняздзе
Кожнай ночы гаманілі,

Покуль возьмецца на дзень,
Ўсё махоркаю дымілі.

— Ой, са смеху я зайдуся —
Што ты кажаш, дзеду бусел!
Як жа ты ў сябе пад носам
Трымаў тую папяросу?

Узлаваў па мяне бусел:
— Разбярыся ж ты як след,
Горкі дым глытаць я мусіў,
А курыў, вядома, дзед.
Нельга ж нам, буслам, курыць —
Можна так гняздо спаліць.

Слухаць бусла-то я слухаў,
Але ўсё ж часаў за вухам.
Хоць цікаўны быў без меры,
А ўсяму не мог даць веры:
— А як вы, дзеду,
з той кватэры,
Што была на хаце ў нас,
Пераехалі на вяз?

— Вельмі проста,— сказаў бусел,—
У адзін пазвязваў вузел
Лыжкі, міскі і пасцель я —
Вось і ўсё тут наваселле.
Стала ўміг наўкола гола,
Як мы там і не былі...

— Ну, а кола? Як жа кола
Вы на дрэва падпялі?
Буслоў, пэўна, дваццаць пяць
Трэба, каб яго падпяць?

Стары бусел тут са смеху
Як стаяў, так і паехаў:
— Трэба ж выдумаць такое,
Проста мне бяда з табою.

А яшчэ ж узяўся людзям
Ты расказваць пра нас,

Гэта ж сорам табе будзе,
Як дазнаюцца падчас,
Прачытаюць дзеці ўслых,
Што нібыта мы, буслы,
На вяршыну дрэва цугам
Цягнем кола саматугам.
Дзякуй, што павесяліў,
Але ж ты перасаліў.
Не прыйшлося таго кола
Нам цягнуць на стары вяз —
Гэта ўсё зрабіў за нас
Мой дружбак, твой дзед Мікола.

А цяпер і ты смяешся,
Я ж ні кроплі не схлусіў,
Як жа, хлопча, ты завешся?
І я вымавіў: — Васіль.

— Ну, дык вось што,
брат Васіль,
Набярыся моцы, сіл
І прыходзь да нас пад вечар
На сяброўскую сустрэчу.

Пазнаёмішся з бусліхай,
Паглядзіш на буслянят,
Пасядзім парою ціхай —
Буду вельмі табе рад.

Дапаможам твайму гору,
Аб усім там пагаворым.
Сам убачыш, адным словам,
Ты жыццё наша, буслова,—

Афармляй камандзіроўку.
Захапі з сабой вяроўку.
Прывяжу я на вяршыне
І спушчу табе канец —
І тады, як на машыне,
Знізу ўверх ляці, хлапец!

Я падзякаваў старому
За разумную параду

І пабег хутчэй дадому
На сямейную нараду.

— Мама, мамачка! — прашу я.—
Дай мне чыстую кашулю.
Прыбяруся і памчуся —
Запрашае мяне бусел.

У гняздзе я сам павінны
Побыт вывучыць птушыны
І пачаць спачатку казку
Пра бусла, пра яго ласку.

Стары бусел — малайчына,
Кемлівая галава!
Я вазьму з сабой ляйчыну.
Ён прычэпіць за вяршыну,

І я — ж-жых, як на машыне,
Да буслоў па той вяроўцы.
Там прабуду тыдні два,
На гняздзе ў камандзіроўцы.

## НА БУСЛЯНЦЫ

Я пісаць пра ўсё не стану —
Адбылося ўсё па плану.
Браўся ўжо на захад дзень,
Як з'явіўся я ў гняздзе.

Першы раз я ўбачыў свет —
І далёка, і шырока,
Пэўна, ні адзін паэт
Не ўздымаўся так высока.

Сеў з бусліхай і з буслом
Я за круглым іх сталом.
Пачалі яны падрад
Мне паказваць буслянят.

Кожнае з іх уставала
І на ножках прысядала.

Вось што значыць —
выхаванне
І старэйшых шанаванне.

Кожнае запомніў я,
Яго выгляд і імя.
Слаўныя былі ў іх дочкі:
Сакатуха і Ласуха,
І пацешныя сыночкі:
Даўгахвосты і Бязвухі.

Перад тым, як за стол сесці,
Кожнае памыла лапкі,
Ну, а потым сталі есці
Хто смятану, хто аладкі.

Праўда, там былі другія
На стале яшчэ прысмакі:
Рыбы, яшчаркі жывыя,
І гадзюкі,
і вужакі.
Чаго хочаш у той місе —
Еш, брат, хоць распаражыся!

Добра, што, якраз на шчасце,
Калі маці выпраўляла,
Не забылася пакласці
Мне ў дарогу хлеба, сала

І абручык каўбасы,
Нават памідораў ранніх —
Мог я доўгія часы
Быць на ўласным утрыманні.

А ўсё ж, будучы на чэсці,
Каб не крыўдзіць дом гасцінны,
Пару рыбак мусіў з'есці
І падзякваў гаспадыні.

І, як звычаем прынята,
Калі госць што-небудзь дорыць,
Я малым даў бусляпятам
Кожнаму па памідору.

І было ж, было там смеху,
Як яны з імі гулялі,
Дзюбамі ўсім на пацеху
Замест мячыкаў качалі.

## БУСЛІХА СПЯВАЕ КАЛЫХАНКУ

Як малых паклалі спаці
І заціхла ўся буслянка,
Доўга ім спявала маці
Сваю песню-калыханку:

— Спіце, дзеткі,
люлі, люлі,
Вераб'і даўно паснулі.
Ад іх шуму дзень у дзень
Галава ажно гудзе.

Колькі бацьку я прасіла:
Тут твая улада, сіла —
Выкінь ты з гнязда іх транты,
Нам не трэба кватаранты.

Нанасі ты з лесу веццяя
І залатай плот дзіравы,
А то вельмі ж нашы дзеці
Любяць смелыя забавы.

Проста і не зводзь з іх вока —
Забываюць, што высока,
Могуць скінуцца дадолу.

Трэба дом зрабіць нам шырай,
І, як скончаць дзеці школу,
Рыхтавацца ўсім у вырай,
Каб тут мерзнуць не прыйшлося,
Як надыдзе тая восень.

Стануць мае дзіцяняткі,
Стануць мае бусляняткі
Хутка па даўгія ногі,
Каб шукаць свае дарогі.

Цераз моры, цераз рэкі,
Цераз горы і даліны
Шлях пракладзены спрадвеку,
Доўгі, цяжкі шлях буслінь.

Дзе цячэ блакітны Ніл
У спякотлівым Егіпце,
Нас глытае кракадзіл,
Тыгр хапае ў свае кіпці.

Гіне шмат буслоў на свеце,
Але мы і нашы дзеці
Вернемся ў сваю хаціну,
Прыляцім зноў на радзіму...

Моцна спалі бусляняты
У цяпле бацькоўскай хаты.
Веяў з цёмнае дубровы
Лёгкі ветрык вечаровы
І спакойны сон бусліны
Калыхаў на верхавіне.

Добра мне адсюль відно,
Што ўжо свеціцца акно
І ў маёй далёкай хаце,
І чутно — гукае маці:
— Дзе ты дзеўся, сынку, дзе?

— Мама, я сяджу ў гняздзе.
Я твой голас добра чую,
Але тут пераначую,
Бо мой шлях далекаваты
І занадта сукаваты.
Ты, мамуся, не турбуйся,
Мне пасцель рыхтуе бусел.

## АПАВЯДАННЕ СТАРОГА БУСЛА

Запаліла ноч ліхтар
І павесіла на вязе,
Зняе лесвіца да хмар —

І туды б, здаецца, злазіў.
І такая відната,
Хоць сабе рыхтуй урокі,
І такая ціхата —
Увесь свет чуцён далёкі.

Быццам тонкая струна
Загула ў мяне над вухам.
Аж да самага відна
Я старога бусла слухаў:

«Шмат прыйшлося мне спазнаці,
Але крыўды я не ведаў.
Перабыў аднойчы ў хаце
Я ўсю зіму ў твайго дзеда.

Яшчэ ў пер'е не ўвабраўся,
Нахапілася ўжо восень,
Захварэў я і застаўся.
Вылецець не давялося.

І якраз, нібы на грэх,
Выпаў вельмі ранні снег.
Замяло лугі, дарогі,
Скачанелі ў мяне ногі,
Ледзь даклыпаў да сядзібы
І, не знаючы, што будзе,
Бразнуў дзюбаю ў шыбу:
— Выратуйце мяне, людзі!

Пляснуў у далоні дзед:
— Беднае маё дзіцятка!
Маці, даставай абед —
Гэта ж наша бусляняткa.

Угарнулі кажухом,
І на печ мяне ўссадзілі,
І гарачым малаком
З лыжачкі малой паілі.
Ўратавалі змоладу
З холаду і голаду.
Ну, а цёплаю вясной
Зноў сустрэўся я з сям'ёй,

Але покуль жывы буду,
Я той ласкі не забуду».

— Дзеду бусел,— спытаў я,—
А чаму ваша сям'я
Перабралася на вяз?
І пачуў такі адказ:

— А прычына, брат, адна,
Што на дрэве навасельцы мы,—
Тут у нас прайшла вайна,
Сталі ўсе мы пагарэльцамі.

Покуль людзі будаваліся,
Покуль з гора выбіваліся,
Дзед Мікола
Знайшоў кола,
Сам аблюбаваў для нас
Вяз.

## ЭКЗАМЕН
## У БУСЛІНАЙ ШКОЛЕ

Пасля я ўжо стаў без ляйчыны
Узлазіць на тую вяршыну.
Ў гняздзе сустракалі буслінымі
Мяне быццам роднага сына.

Там шмат я цікавага ўбачыў
На даўнім драўляным тым коле,
З малымі бусламі задачы
Рашаў у буслінай я школе.

Калі ж маладыя пілоты
Здавалі экзамен па лёту,—
Было там і гора і смеху
Старым і малым на пацеху.

— Я першы,— сказаў Даўгахвосты,—
Лячу, бо ўжо выраслі крылы!

І скочыў з гнязда, як з ламосту,
З усёй заліхвацкае сілы.

Дзівіліся бусел з busліхай:
— Ну, гэты сам выб'ецца ў людзі!
— Такі не спужаецца ліха!
— Адважным ён лётчыкам будзе!

А сын, даляцеўшы да самае высі,
З-пад хмары нырца даў і сеў на пагорку.
Было аднадушным рашэнне камісіі:
— За храбрасць паставіць... чацвёрку!

Другім стартаваў у паветра Бязвухі.
Ён добра абдумаў усе свае рухі.
Агледзеў, праверыў ён кожнае пёрка,
А потым узняўся над полем, над лугам,
Па небе выводзіць стаў роўныя дугі.
І яму па лятанню,
Як па чыстапісанню,
Пастаўлена цвёрдая ў дзённік пяцёрка.

А за сынамі Даўгахвостым, Бязвухім
Чарга падышла да дачкі — Сакатухі.
Ну і смеху ж было,
Што гняздо ўсё гуло,
Я за бокі узяўся
І аж покатам клаўся.

Сакатуха, Сакатушка —
Баязлівая ж ты птушка.
Высунула з гнязда дзюбу:
— Нізашто лятаць не буду!

А як глянула за край:
— Ай, трымайце мяне, ай!
Крыллямі залапатала
І траха з гнязда не ўпала:
— Ой, звалюся!
Ой, заб'юся!
Хутчэй дайце парашут,
Бо канец мне будзе тут!

Угаворвала бусліха
І па-добраму, паціху,
І прасіла просьбаю,
І грэзіла грозьбаю,

Абяцала рыбы мерку
І наверх яшчэ цукерку,
Перабрала ўсе прысмакі,
А карысці — аніякай.

Узлаваў тады стары
І сапхнуў дачку з гары.
Як дала ж яна са страху
Крыллямі такога маху,
Што ўсю вёску абляцела
І на нашай хаце села.

Потым на балоце, у лазе,
Цярпліва выстаяла стойку
Мо з гадзіну на адной назе —
Нацягнула ўсё ж такі на тройку.

А Ласуха за ласунак
Лётала б бясконца.
Толькі дайце пачастунак —
Паляціць да сонца.

І ёй так сказала маці:
— Мілая дачушка,
Вырасла ўжо з птушаняці
Ты вялікай птушкай.
Калі ж будзеш за лятанне
Ты прасіць аплаты,
Можаш сабе да змяркання
Не вылазіць з хаты.
Як галоднай пасядзіш —
І без цукеркі паляціш.

Здаў і я экзамен у той школе —
Не баяўся вышыні ніколі.

## ЯК БУСЕЛ ЛОВІЦЬ РЫБУ

На цямочку, цёплым раннем,
Пайшлі буслы на паляванне.
Напорадзе дыбаў сам бусел,
Вёў буслянят ён на экскурсію.

Ішла за ім уся сям'я,
А ззаду пазіркам — і я.

Сыны і дочкі на балота
Прыйшлі ў чырвоных
новых ботах
І кожны з дзюбаю вялікай —
Такою вострай, быццам піка.
І толькі я між іх быў босы,
Не меў буслінага я носа,
Таму з сабой узяў я вуду —
Лавіць я рыбу вудай буду.

Закінуўшы ў ваду кручок,
Я сеў ля рэчкі на пянёк,
Сядзеў-сядзеў, можа, з гадзіну.
Рука знямела ад вудзільна,
А на кручок, на чарвяка
Мне не трапляла і малька.

Тады сваю я вуду кінуў
І сам падаўся ў гурт бусліны.
У іх ішла спарней работа,
Аж і мяне ўзяла ахвота.
Сам бусел кіраваў рыбалкай:
Ён тоўстай дзюбаю, як палкай,

Муціў ваду пад берагамі,
Таптаў цыбатымі нагамі,
Пакуль праз вадзяныя шыбы
Святла не бачылі ўжо рыбы,
Не ведалі,
куды ім плыць,—
Тады ён браўся іх лавіць.

Хапаў ён рыб
За чорны хіб,
Кідаў на бераг раз-паразу,
Лавілі дзеці іх адразу,
Пасля да бацькі ў рэчку лезлі,
З вады цягалі рыбу самі
І грукалі па дне насамі —
Іх носікі ў вадзе не мерзлі!

## ЯК БУСЕЛ МЯНЕ АД БЯДЫ ЎРАТАВАЎ

Не шанцавала толькі мне,
Хоць бы ляжаў адзін на дне
Ў вядры маім які шчупак,
Дурны карась ці нават рак —
Дзеля прыклёну, проста так,
Бо я ж хваліўся, што рыбак.

Я ўжо не ведаў, куды дзецца,
Схаваў ля берага вядзерца,
Падаўся на сухі грудок,
Лёг пад вярбою ў цянёк.
Спачну тут, думаў, у цішы.

Аж раптам куст як зашуршыць,
І нечакана паўз мяне,
Паўз вуха штосьці як шугане,
А потым — цішыня, ні гуку.
Я глянуў і знямеў: гадзюка!
Яна праз лісце і траву
Як высунула галаву,
Так і застыла нада мной.
Я закрычаў:
— Ратуйце!
О-о-й!

Напэўна б, я там і загінуў,
Ды бусел у бядзе не кінуў,—
Адразу голас мой пачуў,
Шырока крылламі ўзмахнуў
І апусціўся над вярбой,
Прыціснуў гадзіну нагой
І ніку вострую звысоку
Уткнуў у самае ёй вока.

Тут прыляцелі буслянятьі
І ўвесь абшарылі грудок.
Было спажывы ім багата —
Гадзюк знайшлі цэлы клубок.

Як адлягло ад страху сэрца,
Я ўспомніў пра сваё вядзерца.

І толькі падышоў пад бераг,
Дык і вачам не мог даць веры:
Было паўнюткім да краёў
Вядро ўюноў, язёў, лінёў.

— Адкуль жа гэта? — я дзіўлюся.
— Пайшлі дамоў,— сказаў мне бусел.—
Мы сёння шмат іх налавілі
І пра цябе, брат, не забылі.

### ЯК ДЗЯЦЕЛ ЛЯЧЫЎ БУСЛАВУ ДАЧКУ

Не ўсё абышлося пасля палявання
Шчасліва, як думаў у тое я ранне.
Назаўтра
Трывожны быў дзень
У гняздзе.
Яшчэ апаўночы пачуліся ўздыхі,
Прыйшло да буслоў нечаканае ліха:
Знянацку
Дачушка-
Ласушка
Схапілася лапкай
За правае вушка:
— Ой, мамачка, коле, так коле —
Зайдуся, памру я ад болю.

Усё спрабавала
Бусліха:
І клала
На вушка
Падушку,
І брала
На рукі пагушкаць,
Спявала
Ёй песні паціху —
Стогне і енчыць Ласушка,
Слязамі сыходзіць дачушка.

І ледзь толькі золак заняўся —
Раіцца стала сям'я ўся.

І я тут з'явіўся, як ведала сэрца,
Што сябрына у бядзе-напяверцы.

Гасцінцаў наклалі мы ў торбу
Аж з коптарам,
І сыны паляцелі па доктара.
І той адразу ж, з паўслова,
Скеміў няшчасце буслова.
Вось што значыць
Спецыяліст!
А нядаўна ж быў просты
Тэлеграфіст!

Нічога не ўзяў доктар дзяцел,
Нават сушанай рыбы вязку:
— Драць я з хворых не здацен,
Я адразу ж лячу
І лячу
Па сваймў абавязку.

На тым часе да нас
І з'явіўся ён на вяз,
Ўвесь як на партрэце:
Ў чырвоным берэце,
Ў зялёным халаце —
На пуху, на ваце,

З доктарскай трубкай —
Чорнаю дзюбкай.

Пад крылом адразу знік
У Ласушкі градуснік —
Перад тым як даць мікстуру,
Трэба знаць тэмпературу.

Ён абмацаў ёй жывоцік,
Злазіў лыжачкай у роцік
І сказаў: гэк-гэк, кіп-кіп...
І мы думалі, што грып.

Ведаў клёкат ён бусліны
І сказаў усім адкрыта:
— Не, няма ў яе ангіны
І няма прыкметы грыпа.

Мы ўсе ў трывожным хваляванні
На дзятла вочы паднялі.
— А вы былі на паляванні?
— Былі.
Яна ўкушана гадзюкай —
Так мне падказвае навука.

— Ай-ай! — прамовіла паціху
І ледзь не ўпала тут бусліха.—
Адкуль на нас такое ліха?
Ой, доктар, я са страху млею —
Ці ёсць якая хоць надзея?

Дзяцел усміхнуўся
І сказаў услых:
— Не ўміраюць ад гадзюк буслы.
Засаб можаце глытаць іх па сто штук —
Так гаворыць мудрасць ўсіх навук.

Якая радасць там была
Для ўсяе сям'і бусла!
Не зналі мы, што гаварыць,
Куды нам дзятла пасадзіць,
Якою ласкай прывячаць,
Як дзякаваць, як частаваць.

## КАЗКА ЗНОЙДЗЕНА!

А Ласушка, з'еўшы рыбы вязку,
Стала, як назола, прыставаці:
— Раскажыце, доктар, казку,
Раскажыце, мілы дзяцел.
Многа вы лятаеце,
Многа казак знаеце.

— Так, лятаю
Многа я па свеце,
Добра знаю —
Любяць казкі дзеці.

Добра знаю, ну але,
І казку маю пра запас.

Я знайшоў яе ў дупле,
Тут вось, блізка каля вас.

А стары мне бусел кажа:
— Гэта, брат, твая прапажа.
Як падскочу я ў гняздзе:
— Дзе ж яна? Скажыце дзе?

Дзяцел проста аж здзівіўся:
— Ты чаго так усхапіўся?

Мне ж прызнацца нават брыдка,
Быў я рад, што згінуў след,
Бо пісаў у тым я сшытку,
Выхваляўся, што паэт...

А тым часам добры дзяцел
І дамоў паспеў злятаці.
Падае мне маю казку:
— Вось вазьмі, брат, калі ласка.
Доўга мы слібізавалі —
І суседзі ўсе,
І самі
Сэнс глыбокі ў ёй шукалі
І дайшлі аж да паловы...
Ты даруй нам, што пасамі
Выдзеўблі твае ўсе словы,
Што пасля з тваёй паперы
Змайстраваў сабе я дзверы,
Каб не дзьмуў у хату вецер,
Як былі малыя дзеці,
Потым здаць хацеў на ўціль...

— Ой, Васіль, ой, Васіль! —
Заскакалі бусляняты.—
Мы не пусцім цябе з хаты,
Пакуль нам не прачытаеш
Казку, што ад нас хаваеш!

Разгарнуў я сшытак свой —
Не панік, не ўпыў душой,
Хоць і праўда, што ад казкі
Ані знаку,

Ні завязкі —
Нездарма я ўсё ж хадзіў
Па вясёлым свеце,
Наглядзеўся розных дзіў,
Так патрэбных дзецям,
І цяпер зноў па парадку
Ўсё магу пачаць спачатку.

У мяне даволі слоў,
І калі хто хоча,
Баяць казку я гатоў
Аж да самай ночы.

*1957*

# КАЗКА ПРА ЦАРА ЗУБРА

ГЭТА КАЗКА ПРА ЦАРА,
БЕЛАВЕЖСКАГА ЗУБРА.

КАЛІ ХТО ЯГО БАІЦЦА,
НЯХАЙ З НАМІ НЕ САДЗІЦЦА.

САМЫХ СМЕЛЫХ СЯРОД ВАС
ПРОСІМ СЛУХАЦЬ ГЭТЫ СКАЗ.

## АРТЫСТ ЗАЙ

Строга па гадзінніку
Жыў у ціхім доме,
У густым асінніку,
Добры наш знаёмы.

Ён трымаўся распарадку:
Спаць пад'еўшы не любіў,
Раніцай рабіў зарадку,
На прагулку ўдзень хадзіў.

Вывесіў сабе расклад
На ўсю сценку, як плакат.
Калі хмарыла на дождж,
Не выходзіў без галёш,
А ад сонца ў спёку ён
Браў з сабою парасон.

Вось і сёння, роўна ў пяць,
Ён сабраўся пагуляць.
Высунуў галаву з дзвярэй
Ды назад, назад хутчэй,
Бо пачуў нязвычны свіст.

— А, здароў,
Здароў, артыст! —
І на ганак на тым часе
Узышоў Вясёлкін Вася.

Ён сказаў: — Дазволь, зайчына,
Мне з табою пагуляць.
Я даўно шукаў прычыны,
Каб сяброўства нам пачаць.
Добра, што ў дуброве гэтай
Пасяліўся наш атрад,
І я вельмі, вельмі рад,
Што прабуду ўсё тут лета.

— Калі ласка, я заўсёды
Рад кампаніі такой.
Ведаю я ў лесе ходы
І ўсе сцежкі да адной.
Што ж, пайшлі, бо мне ўжо час,—
Сказаў заяц у адказ,
Глянуў на ручны гадзіннік
І пакінуў свой асіннік.

## ЗУБРОВА ДЗЯРЖАВА

Вось яны ідуць удвух
Цераз поле, цераз луг.
Павявае ветрык свежы.
Але кончыўся прастор,
Пачалася Белавежа,
Векавечны цёмны бор.

Воўк свае паставіў бельмы.
Страшна Васю, ды не вельмі.
Меў Васіль наган пры боку,
Меў надзейны меч шырокі —
Нержавеючы,
Фанерны,
Да канца
Герою верны...

Шэпча заяц: — Сцеражыся,
За табою сочаць рысі.
Чуеш, точыць іклы дзік?..

— А вунь гэта што за бык
Пахаджае на папасе? —
Запытаўся раптам Вася.

Як затроссе ўвесь зайчына,
Не патрапіць зуб на зуб:
— Ц-ц-ціха, гэта ж цар звярыны,
Сам яго вялікасць зубр!

## ЗНАЁМСТВА З ЦАРОМ

— А, дык гэта ён! — і Вася
Тут жа да зубра падаўся.

Хіб наставіў звер калматы.
А Васіль яму: — Прывет!
З Мінска вам прывет, ад брата,
Што вядомы на ўвесь свет.
Ў нас на кожным самазвале
Зіхаціць яго партрэт.
Ён такі ж, як вы,
Якраз
І завецца
У нас
МАЗ.
Брата вашага прызналі,
Сапраўды, асілак ён —
Падымае сорак тон...

— Вон! — пачуўся раптам стогн.
Зубр сярдзіта ўскінуў рогі:

— У мяне свае дарогі,
Клопату свайго багата,
Не хачу я ведаць брата,
Не хачу я вам служыць,
Не хачу з табой дружыць!..

А з-за куста — штурх пад бок
Заяц хлопца: — Васілёк,
Лезці ў спрэчку з ім не варта,
Кепскія з царамі жарты,—
На гадзіннік скоса глянуў:
— Як нам выбрацца дамоў?

Ажно тут на іх з паляны
Рынуў цэлы гурт звяроў:

— Хто такія?
— Вы турысты?

— Мы лясныя...
Мы ар... тыс... ты,—
Заяц ледзь сказаць паспеў
І ад страху ўвесь самлеў.

— Га-га-га!
— Го-го!
— Го!
— Паглядзіце на яго,
Гэта ж заяц наш стары! —
Пацяшаліся звяры.
— Бач, які ён важны франт.
— Ты хто: танцор ці музыкант?

## МЕЧ ВАСІ ВЯСЁЛКІНА

Не сцярпеў Вясёлкін Вася
І за верны меч узяўся.
Як махнуў ім на ўвесь дух —
Сыпануўся з дуба ліст.

— Хто не верыць, што мой друг —
Слаўны цыркавы артыст?
Сам яго нядаўна бачыў
Я па тэлеперадачы.
Ён выходзіў на экран
І лапаі біў у барабан!..

— Ох,— зарохкалі зубры,
Застагналі, захраплі,—
Мы да гэтае пары
Яшчэ ў цырку не былі,
Мы ні разу не глядзелі
Ні кіно яшчэ, ні тэле...

А зуброў сынок-бамбіза
Як распусціць слімзары:
— С-у-м-на мне без тэлевіза...
Па-м-м-ру без тэлевізара!..

Як заенчыць, як заплача
Ўся зубрыная радня:
— Няхай
Зай
Спяе,
Паскача —
Пашкадуйце ж
Зубраня!

Падабрэў і цар зубрыны:
— Ты прабач мне, Васілёк,
І ты, слаўны Зай-зайчына,
Ну пацешце майго сына,
Занудзіўся мой сынок.

— Не,— сказаў Вясёлкін Вася,—
Я за няньку не наймаўся.
Мне даўно пара дамоў.
Да спаткання, будзь здароў!
Не хачу я вам служыць,
Не хачу з табой дружыць!

## ЦАР
## СТРАШЫЦЬ ВАЙНОЮ

Скасавурыў грозна вочы
Пушчы цёмнае ўладар:
— Прызнаваць мяне не хочаш?
Цар я тут або не цар?

— Больш няма цароў на свеце.
Кончылася іх улада,
Гэта знаюць усе дзеці,
Нават малышы з дзетсада.

Зубр ад злосці аж зароў:
— Як гэта няма цароў?
Мой стары зубрыны род
Мае сотні тысяч год.
Не ліхвярствам,
Не махлярствам
Я сваё праславіў царства.

Шмат я выхадзіў бароў,
Горкіх папагрыз асінак
І таму сярод звяроў
Самы дужы стаў асілак.
Вось табе мой сказ, браток.
А цяпер ступі хоць крок:
На мяжы маёй дзяржавы
Пільныя стаяць заставы,
І не выйдзеце без візы вы,
Аж пакуль наш род зубрыны
Не пабачыць той карціны,
Што глядзеў ты ў тэлевізары.

Не такі ўжо заяц пан,
Няхай скіне свой каптан
І паскача на паляне,
Як па вашым тым экране.
Гэта царскі мой загад,
Рад яму ты ці не рад!

## ЧАСОВАЕ ЗАМІРЭННЕ

Разгубіўся наш зайчына,
Замаргаў артыст вачыма,
Ледзьве-ледзьве ўжо не плача:
— Не па сіле нам задача...

Сам сабе ўсміхнуўся Вася
І шапнуў: — Каб удалася
Нам з табой адна забава,
Пасмяяліся б, ей-права.

А зубру сказаў ён так:
— Заключаем з вамі пакт,
Мірны дагавор часовы,
Толькі пры адной умове:
Калі вы такі асілак,
Не рабіце больш памылак.

Слухаць я не вас павінны,
А важатага дружыны.
Вы — не пан,

Я — не батрак.
Аб'яўляецца
Ан-
Тракт!
Неабходна даць хоць крышку
І артыстам перадышку.

## СЛЕД РУЧАЯ

І пайшлі нашы героі
Пад шацёр магутнай хвоі.
Дзе б тут хоць вады напіцца?
Чуюць, ручаёк бруіцца.

Глянулі, а ён, як нітка,
Тоненькі, але ўсё ж плытка
Кропельку за кропляй гоніць,
Між травы ў званочкі звоніць.

— Пабяжым за ручаём! —
Крыкнуў зайцу Вася.—
Свежае вады нап'ём,
Ану, падымайся!

І адразу ўзяў разгон
Напрасткі хлапчына,
На ўвесь дух імчыцца ён,
А за ім — зайчына.

Толькі што такое? Ай!
Абагнаў сяброў ручай,
Выслізнуў з-пад самых ног,
Знік, прапаў, зашыўся ў мох.

## ЦАРСКІЯ СТРАЖНІКІ

Азірнуліся сябры:
Следам крадуцца звяры,
Слугі верныя зубровы,
Ўсе чыны яго аховы
На чале з галоўным чынам,

Што вышэйшы ранг вaўчыны
Нёс у поўным сваім бляску
І крывою шабляй ляскаў.
Дзе трушком,
а дзе наўскач,
Выскаліўшы зуб-сякач,
Бег стары кабан надворны.
Знаў сваю ён службу ўзорна:
Япруковым лычам сытым
Увесь лес быў перарыты.

Ззаду, згорбіўшыся ў сук,
Клыпаў адстаўны барсук.
Ад старaннай працы ўночы
Пaпсаваў сабе ён вочы
І цяпер займаў пасаду
Невысокага разраду.
А лісіца і куніца,
Дзве выведчыцы-сястрыцы,
Высцілаючыся плазам,
Вострым вухам,
Тонкім нюхам
На ляту лавілі разам
Усё, што думаў Вася ўпотай,
І запісвалі ў блакноты...

## ТЭЛЕВІЗАР,
## ЗНОЙДЗЕНЫ Ў ЛЕСЕ

Перасмяглі ў Васі губы,
Хоць бы кропельку вады.
— Ручаёчак, братка любы,
Дзе ж падзеўся ты, куды?

А-у, ручай, а-у, ручай,
Хутчэй з бяды нас выручай!

Сам сабе не верыць Вася.
Чуе, пехта абазваўся.

Натапырыў заяц вушы
І паціху шэпча: — Рушым.

Можа, гэта мне здалося,
Але вунь між тонкіх сосен
Штосьці бліснула, як вока,
Во! Зусім жа недалёка.

Глянуў Вася: —
Гэй, за мною,
Гэта ж возера лясное!
І з узгорка пад адхон
Збег на самы бераг ён.

Да вады прыпаў губамі,
Быццам носам шкло дзяўбе.

Раптам у зялёнай раме
Вася ўбачыў сам сябе:

Выгаралы русы чуб,
І вяснушкі ўсе на носе,
І смяшынку паміж губ.

— Вось сустрэцца дзе прыйшлося,
Ад радні за сотні міль! —
Васілю сказаў Васіль
І прыжмурыў хітра вочы,
А пасля як зарагоча,
Як састроіць хлопец фізію...

— Стоп!
Дык гэта ж тэлевізія!
Чуеш, Зай?
Сюды бягай!

Бачыш,
Круглы і вялізарны?..
— Хто?
— Прыёмнік тэлевізарны!
Ну, збываецца мой план.
Паглядзі, экран?
— Экран.
— Дык скідай хутчэй каптан!

## ВЯСЁЛКІН СТАВІЦЬ АНТЭНУ

Тут без грому і без гулу
Па камлі як шарганула,
Мільганулася маланка
І панесла павіну
З прыазёрнае палянкі
На высозную сасну.

Сыпануліся іголкі
Васю проста за каўнер.
Дзіву дзівіцца Вясёлкін
І гадае: — Што за звер
Укусіў мяне за спіну?..

Думаў Вася мо хвіліну.
Потым з прысвістам,
З прыпевам
Кінуўся і сам
На дрэва.

## ПЕСНЯ ВЕРХАЛАЗА

Я палезу сам
На хвою
І антэну вам
Настрою.

Не баюся
Я ані,
Што звалюся
З вышыні.

Стаўлю строма
Мачту ўраз,
Я вядомы
Верхалаз.

Вася і не здагадаўся,
Хто так шпарка, спрытна, вёртка

Памагаць яму узяўся,
Ну, вядома ж хто — вавёрка.

Добры майстра быў наш Вася,
Меў заўсёды ў кішэні
Гайкі, вінцікі ў запасе
І цвікоў, можа, са жменю,—
Ўсё насіў ён у ахвоту,
Нават ладны скрутак дроту.

Толькі быў той дрот короткі —
Не хапіла для праводкі.
І прыйшлося б хлопцу горка,
Сеў надоўга б ён на мель,
Каб увішная вавёрка
Не здаўмелася: — А хмель?

Хмель віецца па сасне.
Зай,
Падай
Кавалак мне!

Прычаплю да верхавіны,
Падыму да самых зор —
Няхай слухае навіны
Белавежскі цёмны бор.

— Малайцы,— сказаў Васіль,—
Я не справіўся б адзін,
Не хапіла б часу, сіл,
А ўтраіх за пяць хвілін
Мы паставілі як бач ты
Тэлевізарную мачту.

— Перадача пачалася! —
Абвясціў Вясёлкін Вася.—
Па сцэнарыю Зай-Зая
Пойдзе хроніка лясная.
Ўсе, хто толькі пажадае,—
Кожны сам сябе пазнае.

Хай бацькі ўжо заадно
І дзяцей вядуць ў кіно.

Дазваляецца ўваход
Ўсім, каму шаснаццаць год!

Нечакана бор глухі
Захіхікаў: хі-хі-хі.
Зашумеў лясны народ,
Загудзеў на ўсе лады:
— Вася, у шаснаццаць год
Ў нас не дзеці, а дзяды...

Выскачыў з нары янот:
— Мне сягоння роўна год!
Вылезлі нясмела з хаткі
І двайняткі-
Бабранняткі:
— А нам месяцаў па восем...

— Што ж, праходзьце,
Просім, просім!

Запытала Васю ласка,
Выгнуўшы куртаты хвост:
— Гэта для маленькіх казка?
— Для маленькіх,
Нападрост!

## ЦІХА!
## ІДЗЕ ПЕРАДАЧА

Па антэне віўся хмель,
А ля самага камля
Гуў, нібы віяланчэль,
Аксамітным басам чмель,
І ўся слухала зямля
Музыку «Палёт чмяля».

Мільгануўся на экране
Лось, нібы намаляваны:
Даўгашыі і цыбаты,
Паміж вушак — дзве лапаты.

Паварочвалася шустра
Модніцаю перад люстрам

І яшчэ адна красуля —
Еўрапейская казуля.

Раптам хлопец у далоні
Ад здзіўлення аж запляскаў:
З дна, з блакітнага прадоння,
На яго глядзела казка,
Светлы чарадзейны сон.

— Хто ты, цень?
— Я — алень.
— А чаму ў цябе
На лбе
Кактусавыя галіны?

— Гэта летні мой вазон,
Я яго зімою скіну.

На свой здымак паглядзець
Падышоў стары мядзведзь
І нагнуўся асцярожна.
І хоць быў адбітак пробны,
Ён сказаў: — Дальбог, падобны.
Тут мяне пазнае кожны.

Запытаў Вясёлкін Мішку:
— Можна ўставіць вас у кніжку?

— А чаму ж няможна?
Можна!

## ВОЎК НЕ ПАЗНАЕ СЯБЕ

Царская прыйшла ахова
І маўчала — хоць бы слова.
Потым старшы чын ваўчыны
Захацеў уласным вокам
Паглядзець, як на карціне
Ён паказан,— ці глыбока.

Толькі глянуў на экран
І ўскіпеў: — Падман! Падман!

Хіба ж злосны я і грубы
І такія ў мяне зубы?
Дзе шнуры, дзе эпалеты,
Храбрасці маёй прыкметы?

Хіба так смяяцца можна?
Ды крывую шаблю з ножнаў
Хоп — і бойка пачалася...
Можа б, і загінуў Вася,
Галава зляцела б з плеч,
Каб не ўласны верны меч.

А раз'юшаная зграя
Калі рынецца на Зая,
І былі б яму канцы...

Раптам царскія ганцы,
Маладыя два мядзведзі,
Закрычалі:
— Едзе! Едзе!
І адразу ж з гушчара
Світа вывела цара.

І пачуўся царскі голас:
— Калі зваліцца хоць волас
З галавы маіх гасцей —
Недалічыце касцей!
Хто парушыў слова чэсці,
Каб са свету Васю звесці?

— Цар! — завыў ад страху воўк,
Хвост падціснуў і замоўк.
Ён баяўся напралом
Лезці ў гутарку з зубром.

Але тут неспадзявана
Падвярнуўся нечакана
Кадр, зусім не пажаданы
Для шырокага экрана.

— Кр-р-ра! —
як каркнула варона
І зняважыла карону.

Волата хапіў удар,
Вызверыўся люты цар:
— Дзе ахова? Дзе чыны?
І куды глядзяць яны?

Да зубра падскочыў воўк,
Лапу ўзяў пад казырок.
Учарнеў ваўчыны князь,
Адно шпорамі: лясь-лясь.

— Быў цара зубра закон —
Палавіць усіх варон?
Чаго лыпаеш вачыма?
Пазбаўляю цябе чына! —
Крыкнуў цар, і ў гневе ён
З воўка сам сарваў пагон.

Дзік, барсук з такой нагоды
Як далі са світы ходу,
А злаславая варона
Зноў над галавой цара,
Не шануючы закона,
Калі каркне:
　　　　　　— Кра-кра-кра!

Як хапіў Васіль свой ладны
Самапал сямізарадны,
Як прыцэліўся ён: п-пух!
Ад вароны толькі — пух.

## ЦАР ЗДАЕ КАРОНУ<br>Ў МУЗЕЙ

Падышоў тады да броду
Буры цар, доўгабароды,
Глянуў у ваду: — Не бачу,
Пэўна, састарэў, няйначай.

Павярнуўся: — Дзе сыны?
Збегаюць няхай яны,
Прынясуць мне акуляры,
А то вочы засцяць хмары...

На тым часе да двара
Збегалі сыны зубра,
Ледзь прывалаклі ў футляры
Рагавыя акуляры.

Пачапіў ён іх на рогі
І яшчэ стаў болей строгі,
Глянуў на астатак світы
І сказаў усім сярдзіта:

— Адракаюся ад трону!
І сарваў з сябе карону,
Размахнуўся і, ей-ей,
Быў гатоў шпурнуць на дно.

— Лепш аддай яе ў музей
І не псуй ты мне кіно! —
Выгукнуў Вясёлкін звонка.
І пайшла круціцца плёнка.

Пачыналася карціна:
«Зай-зайчына —
Малайчына».

## НЕЧАКАНАЕ ЗДАРЭННЕ З ЛІСОЮ

Нялёгкая задача —
Такая перадача,

Калі за кожным рухам
Лісіца водзіць вухам
І хоча зайца з'есці
І толькі дзеля чэсці
Слугуе да пары
На лапках пры зубры.

А Зай наш — малайчына,
Артыст, штукар і хлус,
З лясной кінакарціны
Пакручвае ўжо вус.

З крывулінай сухою,
Нібы касец з касою,
Ён, весела сустрэты,
Пачаў свае куплеты.

## КУПЛЕТЫ ЗАЯ

Нясу
Касу
На плячы,
Хачу
Лісу
Засячы.

Дрыжы,
Ліска,
Ліжы
Міскі,
Дагрызай
Косці —
Едзе Зай
У госці.

Хавай,
Кажу,
Кіпцюр хіжы,
Скідай,
Скідай
Кажух
Рыжы.

Павярніся,
Ліска,
Пакланіся
Нізка:
Смертухна
Ужо блізка.

Лісіца не сцярпела,
Ўваччу замільгацела
Ад заіцавай ігры:

— Зубры!
Зірніце самі —
Ён дагары нагамі,
Нагамі дагары!
Во! Над сасной
Павіс.
Во! Галавой
Уніз!
Падманшчык! Шарлатан! —
І скок на той экран.
І, на сваю бяду,
Кульнулася ў ваду.

Ад ліскі —
Толькі пырскі,
А публіка ад віску,
Ад крыку: — Брава! Брава! —
Аж млела
І стагнала.
Тады, як па сігналу,
На дзве, на тры хвіліны
Сыходзіў Заяц з карціны,
І кланяўся налева,
І кланяўся направа.

Сам зубр на той камедыі
Ўтрымаў свой гонар ледзьве.
Варочаўся,
Згінаўся,
Пасля ўсё ж засмяяўся,
І доўга смех зубрыны
Пагойдваў верхавіны.

## ЗУБР АДПІСВАЕ ВЯСЁЛКІНУ ЎСЁ СВАЁ ЦАРСТВА

У кампаніі з зубрамі
Даглядзеў Васіль праграму.
Спахапіўся наш Вясёлкін,
Як пачаўся вечар золкі,
Як густы лясны туман
Лёг наплывам на экран,

І стары зубр-адзінец
Гучна прачытаў:
«Канец».
І, расчулены на дзіва,
Выцер слёзы:

— Я шчаслівы,
Што з Васёлкіным спазнаўся,
Што прыйшоў у пушчу Вася.
І здароў будзе няхай
Добры госць наш, храбры Зай.

Першы раз за век свой бачу
Я такую перадачу,
Дзе артысты перад намі
Ходзяць дагары нагамі.

Шчыра захапіўся ўвесь я,
Бо, згадзіцеся вы самі,
Гэта нават між зайцамі —
Вельмі рэдкая прафесія...

Па бяседзе ж і па часе
Цар былы сказаў так Васю:
— Аддаю табе дуброву,
Не палову,
А зуброву
Ўсю вялікую дзяржаву,
Ўсю адпісваю па праву —
Дык валодай ёй на славу.
Буду я з табой дружыць,
Буду сам табе служыць...

Калі ж месяц запацелы
Ледзь прадраўся з гушчара,
Стаў асілак белы-белы,
Ўвесь адліты з серабра,

Ну як брат яго
Якраз,
Што завецца
У нас
МАЗ.

Гэткі ж хіб
і рогі-вілы,
Сам жа —
нечуванай сілы.
Што яму ўжо
сорак тон,
Нават тысяча,
Мільён!
Паслухмяны Васілю,
Ён падыме ўсю зямлю!

І адразу з вёскі ў вёску
Паляцела пагалоска
І ў шчаслівы
добры час
Дакацілася да нас,

Што знаёмаю дарогай
Едзе Вася з перамогай
На сярэбраным зубры
Цераз цёмныя бары,
Цераз поле, луг і гай,
А за ім — вясёлы Зай,
Пад губой стаіўшы смех,
Ледзьве плішчыць поўны мех
Нам усім не для пацехі,
Бо ў мяшку...
Не, не арэхі.
У мяшку вялізны звязак
Новых
Васілёвых
Казак.

*1959*

# ДУДАРЫК

Сеў у полі па каменьчыку,
Узяў дудку па раменьчыку.

Ду, ду, ду — дуда гудзе,
Полем водгалас ідзе.

Надакучыла іграць,
Каля дуба лёг паспаць.

Вісіць дудка на суку,
Спіць дударык на баку.

Павярнуўся дагары
І так моцна ён захроп —

Скалануўся дуб стары,
Дудка — бух у самы лоб.

Тут яму і сон не ў сон,
На ілбе гудзе, ўжо гуз.

Не сабраў і трэсак ён,
Бо ад дудкі —
толькі друз.

Падняў хлопец паясок,
Пайшоў з плачам у лясок:

— Куды дзецца мне цяпер?
Цікаваць буду цяцер.

Спадцішка пад куст падпоўз
І цяцёрку — хоп за хвост.

З пёрка выразаў дуду:
— Ой, заіграю, загуду.

Што было, тое сплыло,
Пайду з дудкаю ў сяло.

Я пад першы парог,
А мне з хаты — пірог.

Я на дудцы: ту-гу-гу —
Ўсе нясуць па пірагу:

Мне і матка — пірог,
Мне і татка — пірог,

Мне і дзядзька — пірог,
Мне і цётка — пірог,

Мне і дзедка — пірог,
І суседка — пірог,

І браценік — пірог,
І пляменнік — пірог.

Назбіраў я пірагоў
Сорак восем карабоў.

Каб яшчэ адзін пірог,
Я зусім бы абнямог.

Перастань, дуда,
дудзець!
Дзе мне пірагі падзець?

Сабралася ўся радня,
Памагчы ўсе рады мне.

Запрагаюць каня —
Ён і воза не скране.

Падагналі грузавік,
Для яго —
груз вялік.

Папрасілі самазвала,
Ў самазвала сілы мала.

Залучыў я камара,
Магутнага званара.

Той адразу ўзяў мой воз,
Пірагі мае павёз.

Ай камар-маладзец!
Тут і казцы канец.

*1962*

# КАЗКІ І КРАСКІ

З чаго пачынаецца сонечны дзень?
Вядома, што з новае казкі.
Зірніце,
ледзь дакрануўся прамень
Лясной серабрыстае краскі —

Зазіхацелі кроплі агню —
Апошнія пацеркі ночы,
І праз настылую цішыню
Выбіўся кволы званочак.

Ашчадна жамчужную іскарку дня
Ландыш нясе у далонях.
Спіць яшчэ ўся палявая радня,
Накрыўшыся коўдрай зялёнай.

Першым прачнуўся Дзядоўнік стары,
Але не ўстаюць без прынукі
Дзеці,
што любяць паспаць на зары,
І асабліва — унукі.

Цяжка, вядома, што ні кажы,
Бачыць старому без жалю,
Як тоненькі Дрыжнік спрасонку дрыжыць,
Як туліцца Піжма ў піжаму.

Даўно ўжо з далёкай дарогі прыйшлі
Зачараваныя Брат-і-Сястрыца
І ў захапленні глядзяць па палі,
На хвалі густое пшаніцы.

Маці-і-Мачыха над ракой
З дачкой абнялася няроднай.
Не знае,
якой прытуліцца шчакой —
Цёплаю ці халоднай.

Прачнуўся касматы, нячэсаны Сон,
Вылез з начное кашулі.

Сее зязюля па купіне Лён,
Гусі саджаюць Цыбулю.

У кожнага клопат пра свой агарод,
Кожны свае даглядае расліны:
Казёл з казою — Казлабарод,
Свіння — Свінакроп,
журавель — Журавіны.

Век не было гультаёў у бары,
Ахвотнікаў на дармоўку.
На расцяробах самі зубры
Сеюць сваю Зуброўку.

Дружна ўзяліся расці Львіны зеў,
Конскае шчаўе,
Каціная мята,
А Кураслеп адцвісці паспеў —
Будзе ўраджай багаты.

Будуць ад працы і плён, і спор,
Калі гаспадар харошы.
Не налюбуюцца мышы з нор
На сіні Мышыны гарошак.

Добра ўрадзіла з самай вясны
Сёлета ў зайца Капуста.
Рад, як ніхто,
агароднік лясны —
Грады буяюць густа,

А качаны так і гоніць у рост,
Толькі сабраць бы ўдала...
Глянуў, а за кустом — Лісахвост!
Спалохаўся заяц — і драла.

Умее хавацца ў пушчы мядзведзь,
Пытай — не падкажуць і птушкі.
Не давядзецца самога сустрэць,
Зірні на Мядзведжыя вушкі.

У лапцях хадзілі калісьці ваўкі,
Зараз — у чаравіках,

Але застаўся ўспамін на вякі —
Барвовае Воўчае лыка.

Ёсць Воўчыя ягады і грыбы,
Іх людзі прыдумалі лоўка,
Абы каб самім іх не есці, абы,
Як кажуць, на воўка памоўка.

Аднак жа ад ядавітых траў
Трэба умець бараніцца.
А ты, каб убачыў,
ты б іх пазнаў:
Вароняе вока, Куколь, Чамярыцу?

А ты на двары каля дому гатоў
Адрозніць ад красак увесну:
Блёкат, Цыкуту, Балігалоў,
Люцік, Паслён і Пярэспу?

А ці пазнаеш на пустках, ля ям,
Без імянных таблічак,
Як буйна бушуе пан Дурнап'ян,
А побач —
паніч Дурнічнік?

Кветкі людскія імёны бяруць,
Ёсць Васількі, Маргарыткі.
Наша здароўе яны берагуць,
Нашы шапуюць набыткі.

Бывае, і паджартуюць парой
Над слабасцю чалавечай.
Зёлка па імені — Зверабой
Нікога не б'е, не калечыць.

Прастудзішся —
заварыць напрасі
Маліны, Дзіванны, Руты,
Усім прыбаўляе сіл Дзівасіл,
А Валяр'ян у нас доктар славуты...

Вірыць над Сланечнікам радасны рой,
Смокчуць салодкае сонейка пчолы,

І чмель з неразлучнай чырвонай трубой
Вандрус ў паход свой вясёлы.

Адзін авадзень ашалела гудзе
І вывіжоўвае вокам —
Якую хутчэй яму высачыць дзе
Ахвяру непадалёку.

Іван ды Мар'я аднойчы ўвесь дзень
Марна шукалі сыночка.
Бачылі, як ухапіў авадзень,
Хацеў ухапіць ён і дочку.

Анюта на тую хвіліну якраз
Зёлкі на поплаве рвала.
Ад крыўды зрабілася кветкаю ўраз,
Што брата не ўратавала.

І хоць яна голасу не падае
Ні ў лузе і ні ў лясочку,
Але хто ні гляне — убачыць яе,
Пазнае Анюціны вочкі.

У казках ігрушы растуць на вярбе,
Грамаце вучыць варона сароку.
Гавораць,
знайшоўся адзін верабей,
Што возера выпіў у спёку.

Ад спёкі ў гаі дзяды-салаўі
Ратуюцца Іван-чаем.
Норма ў іх — самавар на дваіх,
Асушаць, другі закіпае.

Тым часам зямлю ўжо ахутвае змрок,
Клубіцца туман на балотах.
Пара маладым салаўям на ўрок —
Новыя песні развучваць па нотах.

Весела дзённая казка ідзе,
Бае, што бачыць і чуе,
І за сабою сяброўак вядзе —
Вячэрнюю і начную.

Гэтак за днём і мінаецца дзень,
Ночкай змяняецца ночка.
Строга трымаецца ранні прамень
Малога свайго званочка.

Толькі кранецца раніцай ён
Лясной чарадзейнай краскі —
Звоніць сярэбраны тэлефон:
Слухайце, слухайце казкі!

*1978*

# ЗМЕСТ

*Запаветная паэма мая...* 3

РАДАСЛОЎЕ

Шлях 13
Гартаванне 15
З вайны 17
Бацькава лыжка 18
Дзед 20
Бацька 21
Спадчына 22
Тытулы 24
Ленін 27
Край гасцінца 28
Случчына 29
Мой добры веку 36

ДЗІВА

*** На чоўне сабраўся... 39
*** Як з падзіву анямелая... 40
*** Выйдзі адвячоркам... 41
*** Паглядзі на жаўталісты сад... 42
Ваявалі ў полі 43
*** Дагараюць кастры... 44
Ідылія 46
На выгодзе 48
Першая песня 49
Жуpавель 50
Дзіва 51
Помнік ласю 52

Верасы 53
Сонейку 54
Нацюрморт 55
Дожджык 56
Шчасце 57
Спяшайцеся 58
Сосны 60
*** Не ведаючы стомы... 61
Вечнасць 62
Дэльфіны слухаюць музыку 63
Сакавік 66
Добры знак 67
Таямніца прыроды 68
Пасля свята 69

## ПАВАДОК

Караблі 71
Мацейка 73
Павадок 74
Барада 75
Пачатак вясны 76
Першае, наіўнае каханне 77
На кургане 78
Зоры над соснамі 79
Развітанне са школай 80
Арэшына 81
Жыта 83
Перавал 84
Прыёмны дзед 85
Дзявочая песня 89
Маладзік 90
Дуб і рабіна 91
Твая ўсмешка 93
Старадаўні раманс 94
Дзедава шчасце 95
Саракі 96
Прыручэнне агню 97

## ПЕРАДЗІМ'Е

*** Якая асалода — жыць... 99
*** Баюся цябе, перадзім'е маё... 100

*** Я да цябе, мая вярбінка... 100
*** Не ўпікай, не дакарай... 101
*** У ладзе, у згодзе... 101
*** Долу ўпала галавою... 102
*** Невядома, колькі год... 102
*** Адышло за небасхіл... 103
*** Зіма ўжо на двары... 103
*** Першы лісток на дрэве... 104
*** Дождж мінуўся... 104
*** Высппеліў колас зерне... 105
*** Дарэмна кажуць, у жыцця... 105

## ПЕРАПРАВА

Марозным днём 107
Горкі вырай 109
Паланянка 115
Вернасць 116
Пераправа 117
Смерць кулямёта 119
Другое нараджэнне 120
Ружа і штык 122
Апошні патрон 123
Зямля ў патроне 124
Памяці парахода 125
Золак над Усурыйскам 127
Спакуса 129
Вышыні святла 130
Суніцы 131
Поўдзень 132

## ДОМА

*** Лёгка адшукаць яшчэ... 139
Трыпутнік 140
Дома 141
Школа 143
Прымак 145
Сівізна 147
Палессе 149
Эпітафія вірусам 150
Крумкач 154
Дарагія стрэлкі 155

Кругі 156
Нашчадкам 157
У імя айца... 158
Старасць 159
Перад парогам 160
Ядлоўцавы куст 161
Вартавы часу 162
Сэрцу 163
Мужны век мой 164
*** Ужо не словам, а пажарам... 166
Загадка мудрасці 167
Зімовыя жураўлі 168
Размова з касмічным госцем 169

## ХЛЕБ

МТЗ 173
Парус 175
Зубр і Форд 178
Хлеб 180
Дэсантнікі 183
Шарая гадзіна 185
Твой жнівень 187
Год каня 188
Пасля работы 189

## ПЕСНЯ

Іванка 191
Барвінак 193
Добры дзень 194
Ордэн Дружбы Народаў 196
Беларуская калыханка 197

## СЛОВА

Дзесяць мінут паэзіі 219
Старыя рыфмы 221
Слова 222
Паэзія 223
Ні дня без радка 224
Пісьменніцкія ўдовы 225

Малагабарытны класік 226
Гатоўнасць 228
Падрадчык 229
Разбойнік 230
Другу-стылісту 231
Змоўнікі 232
Майму любімаму ішаку 233

## МАСКІ

Госць у надпечку 235
Генерал Верабей 239
ППШ 240
Праводзіны снежнай бабы 246
Маскі 248
Белы бычок 261
Нос 263
Ёжка 266
Нуль Буль-Буль 269
Кашчэевы харчы 272

## КАЗКІ

Вавёрчына гора 275
Бусліпае лета 287
Казка пра цара Зубра 318
Дударык 338
Казкі і краскі 341

**Вітка В.**

В 54 Случчына: Вершы; Паэмы; Казкі.— Мн.: Маст. літ., 1981.— 350 с., іл., 1 л. партр.

У пер.: 1 р. 90 к.

Адпатомнік вядомага беларускага паэта, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР і Міжнароднай прэміі імя Х. К. Андэрсена склалі лепшыя вершы, паэмы і казкі, а таксама сатырычныя і гумарыстычныя творы.

В $\frac{70403-113}{М\ 302(05)-81}$ 101—81 4702120200

ББК 84 Бел 7

Бел 2

ВАСИЛЬ ВИТКА
*Тимофей Васильевич Крысько*

СЛУТЧИНА

Стихи. Поэмы. Сказки

Минск, издательство
«Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

Мастак
*У. С. Басалыга*

Рэдактар
*Хв. М. Жычка*

Мастацкі рэдактар
*Л. Я. Прагін*

Тэхнічны рэдактар
*Т. М. Сокал*

Карэктар
*Я. А. Бебель*

ІБ № 957

Здадзена ў набор 02.12.80. Падп. да друку 01.07.81. АТ 05159. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 18,48+0,21 укл. Ум. фарб.-адб. 19,48. Ул.-выд. арк. 13,86. Тыраж 8000 экз. Зак. 1208. Цана 1 р. 90 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Паліграфкамбінат імя Я. Коласа. 220005. Мінск, Чырвоная, 23.